КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 21 (244) ◂ 27 мая ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час



ВАЛЯНЦІН АКУДОВІЧ

Стар. 14–15

**НЕКЛЯЕЎ З ПАЛІТЫКІ НЕ СЫХОДЗІЦЬ**

Экс-кандыдат у прэзідэнты Уладзімір Някляеў заявіў, што, нягледзячы на падзеі 19 снежня, ён гатовы ісці на перамовы з уладамі

Стар. 28

**ЧЫРВОНАЯ КАРТКА ДЛЯ ФАНАТАЎ**

Польскі ўрад абвясціў татальную вайну футбольным хуліганам. На думку апазіцыі, за кампаніяй хаваецца палітычны піяр, які можа дорага каштаваць кабінету

Стар. 29

**ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ**

Стар. 9–24

ISSN 2218-2144

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**КРЫЖ РАСПЯТАЙ ГУБЫ**

Нарыс Тацяны Уласенка з цыклу «Шматпакутныя крыжы Беларусі»

▸ З НАГОДЫ

# НАС НАКРЫЛА ХВАЛЯЙ КРЫЗІСУ

Вольга ХВОІН

**Беларуская дэвальвацыя гэтага тыдня, па дадзеных Сусветнага банка, стала самай буйной за 20-гадовую сусветную гісторыю. А з пачатку года курс нацыянальнай валюты знізіўся аж на 71,62%. Без перабольшвання — эканоміка краіны стаіць на тонкім лёдзе. Улады спадзяюцца на грашовыя ўліванні з Расіі, людзі ў чэргах перыядычна падхопліваюць гэтую мантру. А тым часам пакрысе рыхтуецца распродаж нацыянальных актываў.**




«Дэвальвацыя даўно спазнілася. Але ж прычына яе не выключна фінансавая, а эканамічная, — гаворыць былы старшыня Нацбанка Станіслаў Багданкевіч. — Мы жывём не па сродках, летась імпарт тавараў перавысіў 9 мільярдаў долараў, а сёлета мінус імпарту ўжо тры мільярды. Цяперашняя дэвальвацыя ад бязвыхаднай сітуацыі. Паступлення валюты ад крэдытаў, прыватызацыі, прамых інвестыцый проста не хапала. Дэвальвацыя можа быць толькі адным з інструментаў аздараўлення эканомікі. Трэба рабіць комплексную перабудову. У нас, па дадзеных Белстата, 49% прадпрыемстваў ці стратныя, ці маюць прыбытковасць да 5%. Праблему трэба вырашаць тут».

«Можа, з эмісіяй перабольшылі, але ўсё ж галоўнае — скачок цэн на энергарэсурсы», — паспрабаваў апраўдаць напампоўку эканомікі грашыма-фанцікамі Лукашэнка. І загаварыў ужо не пра сацыяльна арыентаваную эканоміку. «Той курс, які ўсталюецца, такім і будзе… Учора дзесьці вызначылі яго на ўзроўні 5 тысяч за долар, няхай адбылася дэвальвацыя. Нічога. Галоўнае, гэтым распарадзіцца як трэба. Нас накрыла другая хваля крызісу. У першую чаргу — па прычыне росту цэн на энерганосьбіты. Так, сёння мы больш экспартуем, але валюты пакуль не хапае...» — знайшоў крайніх і вінаватых беларускі лідар. Ён паабяцаў, што абвальнай прыватызацыі і распродажу дзяржмаёмасці не будзе.

Хаця хто ж верыць словам, якія рэгулярна мяняюць сваю палярнасць. Сёння вашывасць, заўтра любоў. Прэм'ер краіны Міхаіл Мясніковіч паведаміў, што «Газпрам», якому ўжо належыць 50% «Белтрансгаза», гатовы купіць рэшту акцый за 2,5 мільярда долараў. З'явілася інфармацыя і пра тое, што «Беларуськалій» (100% акцый належалі дзяржаве) — адна з дойных кароў беларускай эканомікі — прадаў свой пакет акцый у Міжнароднай калійнай кампаніі (МКК). Фармальна пакупнікамі выступілі дзве замежныя фірмы, па неафіцыйных дадзеных, яны могуць прадстаўляць інтарэсы Сулеймана Керымава — буйнейшага саўладальніка «Уралкалія». Прайм-ТАСС са спасылкай на крыніцу ў органах дзяржкіравання паведаміла, што пакупнікамі 340 тысяч акцый МКК (33% акцыянернага капіталу) сталі дзве замежныя кампаніі. Афіцыйных каментараў гэтага гешэфту пакуль не было. Стартавая цана акцый МКК складала 573 тысячы беларускіх рублёў за штуку. Такім чынам, сума здзелкі атрымліваецца не меншай за 194 820 мільярдаў беларускіх рублёў.

Увогуле, неафіцыйная праграма беларускай прыватызацыі падаецца вельмі шырокай. Або надта дзіўнымі выглядаюць падлікі міністра фінансаў Расіі Аляксея Кудрына. Каментуючы выдзяленне Беларусі 3 мільярдаў долараў крэдыту па лініі Антыкрызіснага фонду ЕўрАЗЭС на працягу 2011–2013 гадоў міністр заявіў, што агульны аб'ём прыватызацыйных актываў у Беларусі за гэты перыяд павінен скласці 7,5 мільярда долараў. Пра такую арыфметыку ў дзяржкамітэце па маёмасці быццам бы і не чулі. «У нас ёсць план прыватызацыі на 2011–2013 гады, які быў зацверджаны ўрадам 21 сакавіка па ўзгадненні з кіраўніком дзяржавы, і ў адпаведнасці з гэтым планам камітэт будзе працягваць сваю дзейнасць, — заявіла прэс-сакратар камітэта Алена Касцюкова. — З Беларуссю гэтая сума не ўзгаднялася. Гэта асабістае заява спадара Кудрына».

У гэтым годзе на просьбу Беларусі Расія выдзеліць 1,24 мільярда долараў, першы транш у суме 800 мільёнаў долараў паступіць на працягу тыдня пасля прыняцця рашэння антыкрызісным фондам.

Станіслаў Багданкевіч падкрэслівае, што гэтыя грошы не панацэя. «У нас на аплату імпарту нафты і газа за першыя месяцы не хапіла 3 мільярды, дэфіцыт валюты працягваецца. Трэба, каб нам штомесяц нехта даваў па мільярду, — іранізуе эксперт. — Выхад у рэформах. Але без займу мы наўрад ці абыдземся. Для падтрымкі нацыянальнай валюты трэба звяртацца ў Міжнародны валютны фонд, які ствaрала і Беларусь. Але каб туды пайсці, трэба выпусціць палітвязняў, не абзываць «казламі» суседзяў, трэба змяніць сябе. Грошы ж з крэдыту ад Расіі мусяць ісці не на праданне, а на рэформы эканомікі, стварэнне працоўных месцаў, мадэрнізацыю».

Так неабходныя эканоміцы кардынальныя рэформы пакуль не падаюць прыкметаў жыцця. Затое ад Генпракуратуры прыйшла «геніяльная» ідэя, якая мусіць напалохаць апошніх адважных бізнэсмэнаў. «Мы хочам выйсці з ініцыятывай. У заканадаўчым парадку прадугледзець магчымасць яшчэ да ўзбуджэння крымінальнай справы дазваляць з санкцыі пракурора органам крымінальнага пераследу накладаць забарону на адчужэнне маёмасці патэнцыйнага парушальніка і членаў яго сям'і», — прадаваў уласнікаў намеснік генпракурора Аляксей Стук.

Натуральна, з такімі ініцыятывамі замежны капітал у краіну не рынецца. Таму пакуль што Нацбанк спрабуе знайсці міні-рэзервы. Пашыраны пералік паслуг і тавараў, што рэалізуюцца суб'ектамі гаспадарання фізічным асобам, разлікі за якія можна рабіць у замежнай валюце. У гэты спіс патрапілі санаторыі, турфірмы, медустановы — у нерэзідэнтаў яны цяпер могуць браць аплату ў цвёрдай валюце. Але ж наіўна думаць, што такім чынам атрымаецца залатаць чорныя дзіры ў бюджэце дзяржавы.

СУДЫ

# ПРЫСУД АГУЧАНЫ

Алена ВАРАЖБЕЙ

**Міколу Статкевічу — 6 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму, Дзмітрыю Усу — 5,5 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму, Аляксандру Класкоўскаму — 5 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму, Аляксандру Кватякевічу — 3,5 гады калоніі ўзмоцненага рэжыму, Арцёму Грыбкову — 4 гады калоніі ўзмоцненага рэжыму, Дзмітрыю Буланаву — 3 гады калоніі ўзмоцненага рэжыму, Андрэю Пазняку — 2 гады абмежавання волі, яго вызвалілі ў зале суда. Такія прысуды пасля тыднёвай адтэрміноўкі 26 мая агучыла ў Ленінскім судзе Мінска суддзя Людміла Грачова.**



Photo.ByMedia.Net

Абвяшчэнне іх 20 мая «сарвалася з-за хваробы суддзі», якую шмат хто расцаніў як «дыпламатычную». Пракурор Кірыл Чубкавец запатрабаваў для палітвязняў беспрэцэдэнтна жорсткія тэрміны — ад 4 да 8,5 гадоў зняволення. А ў Мінск з'язджаліся высокія саюзныя госці, у тым ліку расійскі прэм'ер Пуцін. Захад таксама на гэты час прызначыў абмеркаванне новых санкцый супраць Беларусі ў сувязі з папярэднімі судамі. Пасля тыднёвага таймаўта прысуд нарэшце прагучаў напоўніцу.

«Дзякую за мужнасць тым, хто не напалохаўся і прыйшоў на Плошчу, — з такімі словамі звярнуўся напрыканцы суда Мікола Статкевіч. — І прашу прабачэння ў тых, хто быў ні за што збіты, апынуўся на нарах, у клетках. Хачу сказаць родным і блізкім гэтых людзей, што вам не павінна быць сорамна за сваіх сыноў, братоў, якія сядзяць у клетцы. Зараз на дадзены момант гэта высокае месца. Значна больш высокае, чым на тым баку залі».

А замежным дыпламатам экс-кандыдат адрасаваў: «Не трэба прапаноўваць рэжыму грошы за нашу свабоду. Калі вы зробіце гэта, у нас будуць новыя закладнікі. А я згодны ахвяраваць сабой. У злачынцаў закладнікаў выкупаць нельга. Калі вы зробіце гэта, значыць, будуць іншыя закладнікі і сітуацыя доўга не зменіцца».

Мікола Статкевіч сказаў, што гатовы ахвяраваць сваёй уласнай свабодай дзеля таго, каб наблізіць свабоду сваёй краіны. «Я веру ў тое, што Беларусь будзе вольнай», — заявіў ён у судзе.

А Аляксандр Класкоўскі зазначыў, што, як і ў кожнага чалавека, у яго былі ўчынкі, якімі ён не можа ганарыцца. «Але 19 снежня быў на плошчы не натоўп, як кажуць, а беларуская нацыя. І я лічу за гонар, што быў там з тымі людзьмі», — заявіў ён.

СУДЫ

# АНАРХІСТАЎ — ЗА КРАТЫ

Альбіна ВІШНЕЎСКАЯ

**Да 9 гадоў пазбаўлення волі запатрабавала пракуратура для анархістаў у судовым працэсе ў Мінску. Шэраг абвінавачаных і сведак заявілі на судзе пра ўжыванне ціску і пагрозаў падчас следства.**



Маладыя людзі абвінавачваюцца ў закідванні бутэлькамі з запальнай сумессю тэрыторыі амбасады Расіі ў Мінску і турмы на вуліцы Акрэсціна ў 2010 годзе. А таксама ў правядзенні несанкцыянаванай антываеннай акцыі каля будынка Міністэрства абароны Беларусі ў 2009 годзе. Інкрымінуецца і шэраг нападаў на іншыя будынкі. У прыватнасці, закідванне фаераў у казіно «Шангры Ла» і будынак Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

Перад судом паўсталі Мікалай Дзядок, Ігар Аліневіч, Максім Веткін з Мінску, Яўген Сілівончык з Салігорску, Аляксандр Францкевіч з Наваполацку. Апошняму прад'яўлена абвінавачанне і ва ўзломе сайту Наваполацкага гарвыканкаму. Дзядок, Аліневіч і Францкевіч вінаватымі сябе не прызнаюць. Веткін і Сілівончык — часткова (не было намеру ў псаванні маёмасці). Веткін сказаў, што кінуў адну бутэльку ў расійскую амбасаду, але не трапіў.

Дзядок заявіў, што на яго чыніўся ціск з боку супрацоўнікаў Упраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і КДБ. Ад яго патрабавалі, каб ён сказаў, што зладзіў акцыю ля расійскай амбасады. Былі пагрозы прымянення фізічнага гвалту.

Адразу чатыры сведкі заявілі пра незаконныя захады да іх падчас следства, два з іх істотна змянілі паказанні. Так, сведка Аляксей Жынгероўскі адмовіўся ад сваіх паказанняў падчас следства і заявіў пра ціск на яго з боку супрацоўнікаў КДБ. Яны пагражалі яму праблемамі адносна вучобы, бацькоў і яго дзіця. Сведка сказаў, што яго прымусілі даць паклёпніцкія паказанні на Дзядка, Францкевіча і Аліневіча.

Сведка Ігар Багачак распавёў, што ад яго таксама патрабавалі даць такія ж паказанні на Дзядка, пагражалі праблемамі на працы і па месцы навучання, у тым ліку і праблемамі ў бацькоў. А на Акрэсціна пагражалі сэксуальным гвалтам. Сведка Аляксандр Бугаеў паведаміў, як дапытвалі яго: «Я не даваў паказанняў, пакуль мяне не пачалі біць. Ударылі гумовай палкай па каленнай чашачцы і ўдарылі па твары».

Ксенія Каўко заявіла, што давала паказанні пад моцным псіхалагічным ціскам гэбістаў. «Я адмаўлялася даваць паказанні супраць Дзядка, на мяне крычалі».

У справе ёсць і іншыя сведкі, на чыіх паказаннях будуецца абвінавачанне. Бацька падсуднага Мікалая Дзядка — Аляксандр — кажа пра агаворы: «Паказанні гэтых людзей нібыта пра ўдзел Мікалая і іншых у здзяйсненні нейкіх злачынстваў супярэчлівыя. Супярэчлівасць гэтых паказанняў і іх абсурднасць сведчыць пра іх ілжывасць і неверагоднасць».

Ігар Аліневіч прызнаў свой удзел у шэсці ля будынка Мінабароны супраць беларуска-расійскіх вайсковых вучэнняў. Яго маці Валянціна зазначыла: «Але гэты эпізод, які ён прызнаў, ён топіцца ў моры ілжы. Самае ілжывае — пра напад на расійскую амбасаду і турму. Я абсалютна дакладна ведаю, што ён у гэтым удзелу не браў, гэта сталася нагодай, каб пачаць шматлікія арышты». Валянціна Аліневіч перакананая, што інцыдэнт з бутэлькамі з запальнай сумессю, закінутымі на тэрыторыю расійскай амбасады, быў правакацыяй.

Усе падсудныя абвінавачваюцца па артыкуле 218 Крымінальнага кодэкса (наўмыснае пашкоджанне маёмасці), Веткін яшчэ па 339-м (хуліганства), а Францкевіч — па 339-м, 349-м (несанкцыянаваны доступ да кампутарнай інфармацыі) і 254-м (камерцыйны шпіянаж).

Пракурор Артур Мірошнік запатрабаваў: Ігару Аліневічу — 9 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці, Мікалаю Дзядку — 6 гадоў і Аляксандру Францкевічу — 5 гадоў зняволення; Максіму Веткіну — 4 гады абмежавання волі, Яўгену Сілівончыку — 3 гады абмежавання волі.

Суддзя Жана Хвайніцкая вынесе прысуд у Заводскім судзе Мінска 27 мая ў 14 гадзін.

ПРАФСАЮЗЫ

# РЫХТУЕЦЦА ПРАТЭСТ

Вольга ХВОІН

**Прадстаўнікі апазіцыі і незалежных прафсаюзаў плануюць правесці 8 кастрычніка Народны сход. Акцыя будзе прымеркаваная да Міжнароднага дня барацьбы за годную працу.**

Арганізатар распачынаюць інфармацыйную працу ў 48 гарадах краіны. Сход будзе праведзены не толькі ў Мінску, але і ў абласных цэнтрах, рэгіянальных гарадах. У ліку патрабаванняў — абмежаваць рост цэнаў, забяспечыць годныя заробкі і пенсіі, не дапусціць беспрацоўя, спыніць продаж прадпрыемстваў, гарантаваць свабодную працу незалежным СМІ, рассакрэціць прэзідэнцкі фонд, забяспечыць магчымасць абмену валюты.

Лідар незалежнага прафсаюзу Генадзь Фядыніч падкрэслівае, што арганізатары бяруць на сябе адказнасць за правядзенне вулічнай акцыі, будзе створана дружына, каб забяспечваць парадак і не дапусціць правакацый. «Мы людзей на плошчу не завём. Ёсць праект, калі мы зразумеем, што нашы патрабаванні не будуць выкананыя, тады будзем выводзіць людзей на вуліцу», — гаворыць лідар прафсаюзу. Фармат акцыі будзе ўзгадняцца з уладамі.

Разам з тым Фядыніч запэўнівае, што калі градус незадаволенасці ў грамадстве будзе нарастаць больш хуткімі тэмпамі, то арганізатары гатовыя падтрымаць людзей і «праз тыдзень». Паводле яго слоў, рабочыя пакуль маюць працу, але не маюць ранейшых заробкаў. «Цяпер у людзей адно пытанне: «Чаму мы так збяднелі?» — расказвае пра настроі сярод работнікаў прадпрыемстваў.

Акцыю падтрымалі незалежны прафсаюз РЭП, партыя левых «Справядлівы свет», АГП, аргкамітэты па стварэнні партый «Беларускі рух» і Народная Грамада, кампанія «Гавары праўду!», Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада.

КАМПАНІЯ

# КОЖНАМУ ВЯЗНЮ — АПЕКУНА

Таццяна ШАПУЦЬКА

**Міжнародная кампанія ў абарону беларускіх палітвязняў еўрапейскімі парламенцёрамі набірае хаду: за мінулы тыдзень яшчэ два дэпутаты нямецкага Бундэстагу сталі апекунамі.**

Франц Цёнес з фракцыі сацыял-дэмакратаў узяў шэфства над экс-кандыдатам у прэзідэнты Мікалаем Статкевічам, а Філіп Місфельдэр, спікер па пытаннях міжнароднай палітыкі ад парламенцкай фракцыі ХДС/ХСС, аб'явіў пра апякунства над старшынёй «Маладога Фронту» Змітром Дашкевічам.

Старшыня нямецкай праваабарончай арганізацыі «Libereco» і адначасова арганізатар кампаніі «Шэфства над палітвязнямі» Ларс Бюнгер распавёў «Новаму Часу» акалічнасці кампаніі: «Мы намагаемся прыцягнуць увагу да праблемы палітычных зняволеных у Беларусі і наладзіць асабістыя трывалыя стасункі паміж імі і еўрапейскімі палітыкамі. Найперш мы запытваем пра магчымасць апякунства ў дэпутатаў Бундэстагу і Еўрапарламента, але мы хочам уключыць у кампанію дэпутатаў нацыянальных парламентаў розных краін, што ўваходзяць у ЕС. Збольшага мы кантактуем з парламенцёрамі, якія займаюцца правамі чалавека і міжнароднай палітыкай, цікавяцца Беларуссю».

Паводле словаў Ларса Бюнгера, «палітычнае апякунства» ўключае ў сябе публічныя заявы ў падтрымку палітвязня і яго сям'і, дасыланне лістоў на імя Аляксандра Лукашэнкі з патрабаваннем вызваліць вязня, віншаванні «апякунца» са святамі, лабіраванне станоўчых рашэнняў датычна ціску на беларускія ўлады. Нямецкі праваабаронца запэўнівае, што ўдзельнікі кампаніі будуць шукаць апекуноў для ўсіх палітвязняў, а не толькі для экс-кандыдатаў у прэзідэнты і вядомых грамадскіх актывістаў: «Мы спадзяемся знайсці дэпутатаў-апекуноў для ўсіх людзей, якія знаходзяцца пад крымінальным пераследам пасля падзеяў 19 снежня, незалежнасці ад узроўню іх вядомасці ў грамадстве. Такіх людзей больш за 50, а таму гэты пошук зойме час».

Ларс Бюнгер падзяліўся бліжэйшымі планамі кампаніі «Шэфства над палітвязнямі»: «Хутка пра апякунства абвесціць Мануэль Саразін, дэпутат Бундэстагу ад Партыі Зялёных, і дэпутат Еўрапарламента, хрысціянскі дэмакрат Міхаэл Гахлер. Парламенцёры возьмуць шэфства, адпаведна, над Мікітам Ліхавідам і Паўлам Севярынцам».

Нагадаем, на дадзены момант пад апекай еўрапейскіх дэпутатаў знаходзяцца Андрэй Саннікаў, Зміцер Бандарэнка, Аляксандр Атрошчанкаў, Мікалай Статкевіч і Зміцер Дашкевіч.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# НЕ СТРАЛЯЙЦЕ Ў ПІЯНІСТА, ЁН ІГРАЕ, ЯК УМЕЕ!

Сяргей САЛАЎЁЎ




**Здаецца, менавіта гэтая старая каўбойская прымаўка забяспечыла адносную стабільнасць Беларусі ў стасунках з Еўропай. Еўрачыноўнікі не наважыліся канчаткова забіваць і без таго не лепшым чынам выглядаючую беларускую эканоміку. Хаця, можа, лепш бы прыбілі, каб не пакутавала.**

23 мая Савет міністраў замежных спраў краін Еўрасаюза павінен быў разглядаць пытанне пра ўвядзенне дадатковых санкцый у дачыненні да Беларусі. Яшчэ 11 мая вярхоўны прадстаўнік ЕС па замежных справах і палітыцы бяспекі Кэтрын Эштан заявіла, што адзіным магчымым адказам Еўрасаюза на дзеянні Аляксандра Лукашэнкі з'яўляецца ўвядзенне жорсткіх санкцый у дачыненні да яго і прадстаўнікоў яго рэжыму.

Па чутках, кіраўнікі пасольстваў краін ЕС у Мінску накіравалі ў Брусэль папярэдні спіс асоб і прадпрыемстваў, у дачыненні да якіх разглядаецца магчымасць увядзення новых абмежавальных мер. Сярод іх былі дзяржканцэрн «Белнафтахім», група кампаній «Трайпл», кампанія «Белтэхэкспарт» і ААТ «Беларуськалій». Новыя санкцыі, падкрэслівалася, закліканы «ўдарыць па дзяржаўным бюджэце прэзідэнта Лукашэнка, не прыносячы крызісу ў кволую эканоміку краіны».

**Сам факт такіх санкцый можа шмат на што паўплываць. Тым больш, што пастаўкі беларускай зброі ледзь не сталі прадметам разбіральніцтва ў ААН**

Але з заклікам «Не забі!» выступіла даўні сябар Лукашэнкі, прэзідэнт Літвы Даля Грыбаўскайтэ. «Я катэгарычна супраць санкцый у дачыненні да самой дзяржавы або да кампаній, якія непасрэдна ўздзейнічаюць на збор бюджэту беларускай дзяржавы», — заявіла яна. Паводле яе слоў, такія меры моцна ўдарылі б па насельніцтву Беларусі, у стабільнасці якой Літва як яе сусед асабліва зацікаўлена. «У цяжкай эканамічнай сітуацыі, якую перажывае Беларусь, такія санкцыі былі б ударам ніжэй пояса», — мяркуе Грыбаўскайтэ.

У выніку міністры ўсяго толькі ўхвалілі ўзмацненне абмежавальных мер у адносінах да беларускага рэжыму ў сувязі з прысудамі, вынесенымі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Саннікаву і іншым прадстаўнікам апазіцыі і грамадзянскай супольнасці. У спіс дададзены 13 прозвішчаў людзей, якім забаронены ўезд на тэрыторыю ЕС і чые актывы ў краінах ЕС будуць замарожаны ў выпадку іх выяўлення.

У «спіс 13-ці» пераважна патрапілі суддзі і пракуроры, якія ўдзельнічалі ў працэсах па 19 снежня 2010 года. Вось для іх гэта сапраўды сур'ёзна, што б ні казалі беларускія апазіцыянеры пра «кволасць», «несур'ёзнасць» і «малую эфектыўнасць» такіх санкцый. Справа ў тым, што забарона на ўезд у краіны ЕС — гэта толькі палова таго, пра што ўсе кажуць. Чамусьці забываюцца пра «замарожванне актываў». А гэта значыць, што карткі кшталту «Visa» для іх на тэрыторыі ЕС не дзейнічаюць. Разлічыцца такой карткай у Еўропе «забароненыя» не здолеюць. У сувязі з дэфіцытам наяўнай валюты ў Беларусі гэта дастаткова моцны ўдар.

Вось каб ЕС прыняў у свае шэрагі яшчэ і папулярную ў беларусаў для адпачынку Турцыю… Тады б сапраўды санкцыя была б звышмоцная.

Але не ўсе паступілі так, як міністры ЕС. Прынцыповыя ЗША ўвялі санкцыі супраць беларускіх прадпрыемстваў «БелОМА» і «Белтэхэкспарт».

Як вынікае з паведамлення сайта Дзяржзэпартамента ЗША, падставай для ўвядзення санкцый стала «надзейная інфармацыя», якая ўказвае на тое, што гэтыя кампаніі перадавалі ў Іран, Паўночную Карэю ці Сірыю або атрымлівалі з гэтых краін «абсталяванне і тэхналогію, названую ў спісах кантролю за шматбаковым экспартам, <...> або іншым чынам мелі магчымасць зрабіць матэрыяльны ўнёсак у зброю масавага знішчэння ці сістэмы крылатых і балістычных ракет.

Сутнасць санкцый у тым, што ўрадавыя ведамствы ЗША на працягу двух гадоў не могуць набываць у згаданых кампаній або пастаўляць ім тавары і паслугі, а таксама аказваць ім падтрымку.

Канешне, наўрад ці такія санкцыі будуць дзейсныя, але ж сам факт такіх санкцый можа шмат на што паўплываць. Тым больш, што пастаўкі беларускай зброі ў «сумнеўныя» краіны ледзь-ледзь не сталі прадметам разбіральніцтва ў ААН.

Але зараз беларускія ўлады павінны быць заклапочаны зусім іншымі праблемамі, чым нейкія там санкцыі. Сітуацыя ў грамадстве набліжаецца да крытычнай. Прытым набліжаецца сямімільнымі крокамі.

На мінулым тыдні ў сувязі з рэзкім падзеннем узроўню жыцця на прадпрыемствах Беларусі пачаліся хваляванні. Як паведаміў старшыня Беларускага кангрэса дэмакратычных прафсаюзаў Аляксандр Ярашук, 23 мая хваляванні сярод рабочых назіраліся на РУП «Мінскі трактарны завод» і СААТ «Рэчыцапіва».

У прыватнасці, работнікі «Рэчыцапіва» выказвалі незадавальненне ў сувязі з тым, што апошнія два месяцы на прадпрыемстве былі праблемы з аплатай працы. У панядзелак рабочыя аднаго з падраздзяленняў СААТ «Рэчыцапіва» спынілі працу, пасля чаго адміністрацыя ўрэгулявала сітуацыю з выплатай грошай. Больш складаная сітуацыя склалася на МТЗ. «Па нашай інфармацыі, на прадпрыемстве існуе сур'ёзнае напружанне, якое звязана з абвалам беларускага рубля і імгненным збядненнем, дэвальвацыяй, падзеннем заработнай платы», — сказаў кіраўнік БКДП. 23 мая ў некаторых цэхах людзі спынілі працу і правялі стыхійны мітынг. Зараз сітуацыя на МТЗ «дастаткова спакойная», аднак гэта не азначае, што праблема вырашана прынцыпова.

Што да сітуацыі на СААТ «Рэчыцапіва», то тут перавага прыватнага ўласніка над дзяржпрадпрыемствам была прадэманстравана відавочна. Ужо 24 мая кампанія «Heineken» у Беларусі, якой належыць «Рэчыцапіва», патлумачыла: 20 мая ў адпаведнасці з умовамі аплаты працы, прадугледжанымі ў працоўных кантрактах, усім супрацоўнікам СААТ «Рэчыцапіва» «была выплачана авансавая частка заработнай платы ў поўным аб'ёме без затрымак з боку работадаўца». Аднак у разліках прэміяльнай часткі заработнай платы адбылася «тэхнічная памылка». «Як толькі гэты факт быў выяўлены, прэміяльная частка была пералічана і выплачана ў поўным аб'ёме». Кампанія «прыкладзе ўсе намаганні, каб не дапусціць паўтарэння такіх памылак у будучыні».

А вось дзяржаўны МТЗ ніякага тлумачэння не прыслаў.

Здаецца, менавіта такіх хваляванняў улада павінна баяцца больш за ўсё. Бо калі на вуліцу выйдуць не студэнты-малалеткі, не пенсіянеры і інтэлігенцыя, а працоўныя, то тут ужо ніякага АМАПу на іх не хопіць. Чым гэта заканчваецца, добра памятаюць нават не вельмі сталыя людзі. Такое ўжо было ў 1991 годзе.

А гледзячы на пустыя паліцы крамаў і грэчку па 26 тысяч за 900 грам, аналогіі з «ліхімі 1990-мі» зараз відавочныя.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### АРЦЁМ ШАРКОЎ



Арганізатары акцый «Стоп бензін» спрабуюць пратэставаць супраць падвышэння коштаў на паліва для аўтамабіляў. Аднак яшчэ да пачатку акцыі «Стоп бензін» у сталіцы 24 мая кіраўніка інфармацыйна-асветніцкай установы «За аўто» Арцёма Шаркова, які быў галоўным арганізатарам, затрымала міліцыя. Шаркова дапытвалі ў якасці сведкі па нейкай крымінальнай справе з падробленымі расійскімі рублямі. Допыт доўжыўся роўна да таго часу, пакуль не скончылася акцыя «Стоп бензін». Потым Арцёма Шаркова адпусцілі. Падчас акцыі некаторых яе ўдзельнікаў спынялі супрацоўнікі ДАІ, правяралі дакументы і выпісвалі штрафы, напрыклад, за карыстанне мабільнікам у час руху, — перадае Еўрарадыё. Удзельнікі акцыі рухаліся па МКАД да гіпермаркета «Прастор», там яны стаялі на стаянцы ля гіпермаркета з уключанай аварыйнай сігналізацыяй.

### ВАЛЕРЫЙ ЦАПКАЛА




Дырэктар беларускага Парку высокіх тэхналогій выступіў з крытыкай эканамічнай палітыкі дзяржавы, якая прывяла да валютнага і фінансавага крызісу ў краіне. У сваім блогу Цапкала піша: «Адной з прычын цяперашняга стану на валютным рынку Беларусі паслужыла няправільна абраная стратэгія па выхадзе з эканамічнага крызісу 2008–2009 гадоў. У перыяды крызісу, калі рэзка скарачаецца плацежаздольны попыт, калі прадукцыя не рэалізуецца, прадпрыемствы павінны накіроўваць назапашаныя рэзервы на мадэрнізацыю вытворчасці, на інавацыі, на распрацоўку новых відаў прадукцыі, якія «выстраляць» пасля таго, як крызіс скончыцца». У якасці прыкладаў ён прыводзіць палітыку кампаній Apple і Nokia, што цяпер з'яўляюцца лідарамі сусветнага рынку.

«Беларускі ўрад паставіў задачу працягваць нарошчваць аб'ёмы выпускаемай прадукцыі. Выконваючы гэтае рашэнне, беларускія прадпрыемствы працягвалі закупляць замежныя камплектуючыя і вырабляць прадукцыю. Яны гэта рабілі, нягледзячы на адсутнасць попыту, адпраўляючы прадукцыю на склад у надзеі, што крызіс хутка скончыцца, тавар будзе распрададзены альбо яго купіць дзяржава. Фактычна назапашаныя за перыяд спрыяльнай знешнеэканамічнай кан'юнктуры валютныя рэзервы накіроўваліся на набыццё імпартных кампанентаў для беларускай прадукцыі. І ўсё гэта адпраўлялася на склад. Мы памятаем, як трактарамі МТЗ была застаўленая ледзь ці не ўся кальцавая дарога», — нагадвае пра памылкі кіраўніцтва краіны Валерый Цапкала.

Кіраўнік ПВТ пагаджаецца, што Нацбанк падыграў спекуляцыйнаму курсу валюты. Праўда, «неасэнсавана». Больш падрабязна з меркаваннем дырэктара беларускага Парку высокіх тэхналогій можна азнаёміцца ў яго блогу http://tsepkalo.livejournal.com.

### ДЗМІТРЫЙ БАНДАРЭНКА




Сітуацыя з асуджаным па справе аб падзеях 19 снежня ў Мінску Дзмітрыем Бандарэнкам, якія быў даверанай асобай былога кандыдата ў прэзідэнты Андрэя Саннікава, тыповая і ад таго страшная. Дзмітрыя Бандарэнку асудзілі да двух гадоў пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму. За час знаходжання ў СІЗА ў Дзмітрыя пачалі прагрэсаваць захворванні, аднак кваліфікаваны медагляд не дазвалялі зрабіць. І вось пасля прысуду Бандарэнку агледзеў лекар-неўролаг, вердыкт — неабходная аперацыя.

«Дзмітрый у лісце мне напісаў, што лекар пацвердзіў: яму патрэбна аперацыя. У яго чатыры грыжы дыскаў хрыбетніка, ушчэмленыя тры спіннамазгавых нерва. Патрэбна аперацыя, інакш ён можа страціць рухомасць. У Дзмітрый літаральна вісіць ступня, і ўсё можа скончыцца інвалідным каляскай», — паведаміла яго жонка Вольга Бандарэнка.

Магчыма, у сувязі з заключэннем спецыяліста Дзмітрыя Бандарэнку могуць перавесці ў турэмны шпіталь, сказала Вольга. Акрамя таго, гэта можа паўплываць на канчатковы тэрмін зняволення, бо цяпер у Мінскім гарадскім судзе знаходзіцца касацыйная скарга на прысуд палітыку.

Знішчэнне здароўя асуджанага палітыка стала вядомым фактам, але ў турмах тысячы людзей, якія далёка ад публічнай сферы і не агучваюць акалічнасці свайго ўтрымання. А пенітэнцыярная сістэма Беларусі надзвычай закрытая для праваабаронцаў і, як высветлілася, для медыкаў.

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# ЧАС КУЛЬГАВЫХ РАШЭННЯЎ

Сяргей НІКАЛЮК

**Ва ўмовах расколатага грамадства любое стратэгічнае рашэнне ўлады можа быць толькі часовым.**

Лічыцца, што апошняму генеральнаму сакратару ЦК КПСС Міхаілу Гарбачову не хапала рашучасці і палітычнай волі. Адсюль пастаянныя кіданні з адной крайнасці ў другую пры прынясці рашэнняў, вынікам якіх і стала «найвялікшая катастрофа XX стагоддзя». Падмацую сказанае цытатай з самай аўтарытэтнай беларускай крыніцы: *«С Горбачёвым мы встречаемся часто, я ему говорю: главная причина того, что произошло в распаде Советского Союза, то, что у нас не было сильного волевого человека, который бы осуществлял свои функции по конституции».*

Нам пашанцавала: такі чалавек у Беларусі ёсць. Акрамя неабходных для паспяховага палітыка асобасных якасцяў, ён валодае шматгадовым досведам дзяржаўнага кіравання і глыбокімі тэарэтычнымі ведамі па ўтрыманні ўлады. Мяркуйце самі: *«Ленин как учил? «Власть чего-то стоит, если она умеет защищаться». И это правильно. Говорят: «Он узурпировал власть». Подождите, ребята. Я узурпировал власть? А меня народ для чего избрал? Чтобы я, извините, сидел и смотрел, как страну перевернут?»*

## Сінтэз замест альтэрнатывы

2011-ы абвешчаны ў рэспубліцы Годам прадпрымальнасці. Як той казаў, не дзеля карысці, а выключна з мэтай стварэння новага аблічча беларускай эканомікі, разняволення ініцыятывы і дзелавой актыўнасці. Калі мне памяць не здраджвае, дык прараб перабудовы ў свой час таксама паклаў нямала высілкаў на «актывізацыю чалавечага фактару». Гэтак жа, як «адзіны палітык» (АП), Гарбачоў апеляваў да тэарэтычнай спадчыны заснавальніка савецкай дзяржавы, але не для таго, каб нагадаць калегам па Палітбюро аб прынцыпах утрымання ўлады, а для вяртання да «ленінскай пастаноўкі пытання пра максімум дэмакратызацыі сацыялістычнага ладу, пры якім чалавек пачуваецца гаспадаром і творцам». Магчыма, у гэтым і палягала яго галоўная памылка.

У палітыцы фармавання ў савецкага чалавека пачуцця гаспадара і творцы Гарбачоў бачыў альтэрнатыву андропаўшчыне з яе беспаспяховымі спробамі павялічыць эфектыўнасць эканомікі за кошт узмацнення вытворчай дысцыпліны. Але там, дзе прараб перабудовы бачыў альтэрнатыву, АП спрабуе знайсці магчымасць для сінтэзу. Я не памыліўся. Аўтар Указу №43 «Аб абвяшчэнні 2011 года Годам прадпрымальнасці» і прыхільнік Юрыя Андропава — адна і тая ж асоба. Для чытачоў, што ўсумніліся, прывяду адпаведную цытату: *«У нас есть советский опыт времен Андропова.*




*Нравится это кому-то или нет, но примерно так мы должны заставить каждого работать».*

Ёсць такі базавы прынцып арганізацыі армейскага жыцця: не ведаеш — навучым, не хочаш — прымусім. Гэты прынцып і спрабуе АП перанесці з армейскай казармы ў заводскія цэхі, навуковыя лабараторыі, банкаўскія офісы. Калі перанос будзе паспяховы, мы станем сведкамі стварэння гістарычнага прэцэдэнту па разняволенні ініцыятывы і дзелавой актыўнасці шляхам прымусу!

Для людзей маладых і ўжо хацячы б таму не зведаўшых на сабе дысцыплінарных інавацый, нагадаю: з прыходам Юрыя Андропава да кіраўніцтва КДБ у 1967 годзе барацьба з іншадумствам у СССР была пастаўлена на «навуковую» аснову. Галоўным ноў-хаў для барацьбы з «адмарозкамі» таго часу (дысідэнтамі), стала «карная псіхіятрыя», якая дазваляла ставіць беспрэцэдэнтны ў сусветнай медыцынскай практыцы дыягназ «шызафрэнічны сіндром агрэсіўнага антысаветызму». У тых, каму гэты экзатычны дыягназ быў пастаўлены, не ўзнікала праблем са шпіталізацыяй. У спецыялізаваных клініках, створаных пад патранажам МУС, для іх заўсёды знаходзілася месца.

## Пра дэмакратыю, прусакоў і рынак

Спроба сумясціць несумяшчальнае, апісаная вышэй, — толькі адна з ілюстрацый стылю кіравання, які імкліва набірае рэйтынгавыя пункты на вяршыні ўладнай «вертыкалі». Шуганне з адной крайнасці ў іншую — яго візітная картка. Зрэшты, так было заўсёды, проста часавыя прамежкі паміж узаемавыключальнымі рашэннямі, вызначэннямі, заявамі сёння максімальна сціснуліся.

Вось, да прыкладу, выступае АП з пасланнем. На календары 21 красавіка. Кажучы пра перспектывы, якія адкрываюцца, ён пераконвае дэпутатаў, якія сабраліся ў Авальнай зале, што для іх увасаблення ў жыццё *«у нас есть и возможности, и силы, и самое главное — желание»*. Праходзяць два дні. Прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч спрабуе высвеціць у міністра эканомікі Мікалая Снапкова прычыну зрыву плану па прыцягненні прамых замежных інвестыцый. Праблем з адказам у міністра не ўзнікае: «У нас заўсёды быў адказ на гэта пытанне… неабходна практычнае выкананне паказчыкаў. Для гэтага трэба толькі адно — жаданне».

Не, нездарма АП вырашыў звярнуцца да досведу спецыялістаў па «карнай псіхіятрыі». Без творчага засваення напрацовак андропаўскіх умельцаў у беларускіх чыноўнікаў наўрад ці сфармуецца ўстойлівае жаданне прыцягваць прамыя замежныя інвестыцыі.

Але выпадак з жаданнямі — прыватны. У жаданняў лёс такі — змяняцца пад уздзеяннем знешніх абставінаў. Несувымерна большымі разбуральнымі наступствамі нам пагражае адмова ад курсу, абранага яшчэ на досвітку будаўніцтва «беларускай эканамічнай мадэлі развіцця». Ну як тут не пагадзіцца з наступнай заўвагай: *«Мы правильным путем шли. И как только начали играться в некую демократию, вот мы и получили результат»*.

А не трэба было *«играться»*. Не трэба было кідацца. Няўжо досвед Гарбачова нічому не навучыў? Дзе дапускаецца дэмакратычнае паслабленне, там, нібы прусакі са шчылін, пачынаюць выпаўзаць разумнікі, якія *«основываясь на непонятных теориях свободного рынка, раздают эту валюту кому попало: иди на биржу, бери сколько хочешь, обменивай»*. Давялося вяртацца да кіравання ў звыклым ручным рэжыме. Вынік не прымусіў сябе доўга чакаць, ён быў прагназаваным, што і зафіксавалі чэргі ў абменных пунктах.

## Сыты галоднаму не таварыш

Ёрнічаць у такім ключы — справа няхітрая, тым больш што за фактурай далёка хадзіць не трэба. Аднак жанр «Азбукі паліталогіі» патрабуе падвесці пад шматлікія факты і факцікі тэарэтычны падмурак. Для гэтага мне давядзецца засядлаць свайго любага коніка і ў чарговы раз звярнуцца да тэмы расколу беларускага грамадства.

«Раскол, — сцвярджае гісторык Аляксандр Ахіезер, — ёсць нездольнасць у грамадстве прымаць цэласныя, значныя рашэнні, якія ахопліваюць істотныя бакі жыцця грамадства. Рашэнні, што прымаюцца, уяўляюць сабой няпэўнай даўжыні ланцуг, у якім кожнае рашэнне карэктуе, адмяняе, абмяжоўвае папярэдняе і само, у сваю чаргу, становіцца ахвярай наступнага».

У беларускага расколу сацыякультурныя карані. Ён падзяліў грамадства на тых, хто ўжо ў нейкай ступені засвоіў ліберальныя каштоўнасці, галоўнай з якіх з'яўляецца свабода, і на тых, хто адчувае рэальную патрэбу ў апецы з боку «моцнай дзяржавы». Ва ўмовах расколу любы рэальны палітык, нават калі ён мае статус адзінага, асуджаны на прыняцце «кульгавых» рашэнняў, г. зн. рашэнняў, якія прымаюцца ў апісанай вышэй логіцы.

У расколатым грамадстве любое рашэнне, якое задавальняе адзін з яго бакоў, аўтаматычна генеруе пачуццё непрымання ў процілеглага боку. Калі АП заяўляе, што *«мы наелись демократии, мы наелись рынка»*, то пад займеннікам першай асобы адзіночнага ліку «мы» ён мае на ўвазе не толькі сябе асабіста, але і беларускую «большасць».

Падзеі 19 снежня прымусілі АП публічна прызнаць факт расколу беларускага грамадства. Здавалася, яшчэ крыху — і мы станем сведкамі другога прышэсця палітыкі ў найноўшай гісторыі Беларусі (першае адбылося напачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя). Але выпрабаванне палітыкай АП не вытрымаў. Дзейнасць па руцінным узгадненні інтарэсаў «большасці» і «меншасці» апынулася па-за межамі яго асабістых магчымасцяў.

Пасланне–2011 зафіксавала вяртанне да канцэпцыі адзінага народа, але гэта адзінства дасягнутае не за кошт кампрамісу, а за кошт адмаўлення «меншасці» ў праве на існаванне. Прынята чарговае «кульгавае» рашэнне. Зразумела, што не канчатковае. У рэальнасці «меншасць» нікуды не знікла, спроба ж ігнараваць яе інтарэсы толькі павялічыць раскол у грамадстве.

## Дэзерціры працоўнага фронту

Лёс большасці прадказальнікаў — трапляць пальцам у неба. Верагоднасць такога зыходу асабліва вялікая, калі будучыня фармуецца на падставе «кульгавых» рашэнняў. Але лозунг, пад якім нам давядзецца жыць і працаваць хуткім часам, зразумелы. Ён запазычаны ў Джорджа Оруэла: «Дысцыпліна, таварышы, жалезная дысцыпліна! Вось лозунг сённяшняга дня! Варта зрабіць адзін няслушны крок — і ворагі адолеюць нас!»

Вы скажаце, што ён дрэнна спалучаецца з Дырэктывай №4. Згодны, але чаму ён павінен з ёй спалучацца? Дырэктыву №1 «Аб мерах па ўмацаванні грамадскай бяспекі і дысцыпліны» ніхто не адмяняў. Кадры, здольныя ажыццяўляць маніторынг стану працоўнай дысцыпліны ў маштабах усёй народнай гаспадаркі, ёсць. Яны ўжо атрымалі адпаведныя ўказанні і распачалі працу. Вынікі маніторынгу не трымаюцца ў сакрэце. Чытайце прэсу, глядзіце навіны па тэлебачанні.

Найбольш прасунутым чытачам «НЧ» рэкамендую звярнуцца да сур'ёзных кніг па гісторыі. Напрыклад, да Ключэўскага: «Прыгонныя адносіны распаўсюджваліся на ўсё больш шырокія пласты насельніцтва. Усе вольныя людзі, не прыдатныя да ваеннай службы, абавязаны былі запісацца ў сяляне ці дваровыя, каб «гулякі за рамяство прыняліся і ніхто б без справы не бадзяўся». Гэты фрагмент — цытата з указу Пятра І.

Праблема ўмацавання грамадскай бяспекі і дысцыпліны была актуальная пры першым расійскім імператары і яго наступніках. Для яе рашэння секлі галовы, рвалі ноздры, кляймілі і высылалі ў Сібір. Рашучыя меры дазволілі рэзка скараціць колькасць *«праздношатающихся»*, ды і як ёй ні скарацінца, калі да канца кіравання Ганны Іаанаўны цэнтральная частка Расіі абязлюдзела. Толькі ў Літву за 10 гадоў яе кіравання збегла каля 250 тысяч чалавек. Не выключана, што сярод чытачоў «НЧ» ёсць нашчадкі дзэерціраў працоўнага фронту. Цікава, у якіх краінах будуць жыць іх дзеці?

САНКЦЫІ

# ЕЎРАПЕЙСКІ ЎКОЛ

Вольга ХВОІН

**Савет міністраў замежных спраў краін Еўрасаюза пашырыў візавыя санкцыі — спіс неўязных беларускіх чыноўнікаў у Еўропу дапоўніўся яшчэ 13 прозвішчамі пракурораў і суддзяў, якія датычныя да прысудаў «па справах 19 снежня».**

Першапачаткова меркавалася, што будуць уведзеныя эканамічныя санкцыі супраць шэрагу прадпрыемстваў, у ліку якіх «Белнафтахім», «Белтэхэкспарт», «Трайпл» і «Беларуськалій». Аднак у выніку Брусэль абмежаваўся толькі персанальнымі санкцыямі.

Цяпер у поўны спіс неўязных беларускіх чыноўнікаў уваходзяць 188 чалавек. Сярод «навічкоў» — суддзі, што вялі працэсы над удзельнікамі мітынгу 19 снежня, начальнік Аператыўна-аналітычнага цэнтра пры прэзідэнце Беларусі, дырэктар Талькаўскай школы, дзе працавала звольненая з палітычных матываў настаўніца Наталля Ільініч.

Прэс-сакратар МЗС Андрэй Савіных візавыя санкцыі ацаніў як «непрыхаваны ціск на беларускіх суддзяў і пракурорскіх работнікаў». «Гэты падыход прымушае сумнявацца ў прыхільнасці ЕС прынцыпу незалежнасці судовай улады. Мы перакананыя, што адзіны рэальны выхад з канфрантацыйнай логікі дзеянняў магчымы толькі праз раўнапраўны і канструктыўны дыялог», — гаворыцца ў афіцыйным паведамленні МЗС Беларусі.

Трэба сказаць, што ўлады нервова рэагуюць на візавыя абмежаванні. З прычыны пасяджэння Рады ЕС па санкцыях супраць беларускіх уладаў ці не, але апошнія прысуды па справах аб 19 снежня былі больш мяккімі, чым папярэднія. А двум экс-кандыдатам у прэзідэнты вынясенне вердыктаў суда перанеслі на нявызначаны тэрмін.

На пачатку мая агенцтва Інтэрфакс-Захад са спасылкай на крыніцу ў Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі паведаміла, што ў выпадку ўвядзення Еўрасаюзам у адносінах да Беларусі эканамічных санкцыяў беларускія ўлады ў адказ могуць прапанаваць паслам шэрагу дзяржаў ЕС пакінуць межы краіны, а таксама забараніць выезд за мяжу двумстам прадстаўнікам апазіцыі. Зрэшты, яшчэ ў сакавіку прэс-сакратар МЗС Беларусі Андрэй Савіных гаварыў, што падрыхтаваны спіс асоб, якім будзе забаронены ўезд на тэрыторыю Беларусі. Аднак на практыцы пакуль нічога рэалізавана не было.

Хіба што можна прыгадаць нядаўні інцыдэнт: беларускія памежнікі анулявалі Яўгену Вапу — старшыні ўправы Радыё Рацыя (Беластоцкая радыёстанцыя) і галоўнаму рэдактару тыднёвіка беларусаў у Польшчы «Ніва» — уязную візу. Яўген Вапа мяркуе, што ануляванне візы і ўнясенне яго прозвішча ў спіс непажаданых у Беларусі асоб з'яўляецца адказам на дзейнасць незалежных СМІ, якія выходзяць на тэрыторыю Беларусі.

Палітолаг Валеры Карбалевіч згодны, што санкцыі ЕС для беларускага рэжыму непажаданыя. «Улады і выступілі ў адказ з пагрозамі выслаць амбасадараў, перакрыць выезд за мяжу апазіцыі. Але небяспека для рэжыму ідзе не ад самога факту эканамічных праблем, крызісу, а найперш ад ступені супрацыву грамадства. Гэтага пакуль няма. Людзі маўчаць, гатовыя суткамі стаяць у чэргах па валюту, але не пратэставаць. Пакуль так, то і санкцыі нічога не мяняюць», — рэзюмуе эксперт.

Негатоўнасць да рашучых крокаў з боку еўрапейскіх палітыкаў Карбалевіч тлумачыць адсутнасцю адзінства па беларускаму пытанню. «Вось Літва вуснамі прэзідэнта Далі Грыбаўскайтэ заявіла, што супраць прыняцця эканамічных санкцый. Але калі будуць жорсткія прысуды, пагаршэнне сітуацыі з правамі чалавека ў краіне, то і Еўропа саспее да радыкальных рашэнняў», — прагназуе палітолаг развіццё сітуацыі. Хаця ці можа быць яшчэ горш у цэнтры Еўропы з правамі і прысудамі?

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# МАЦІ СУСТРЭЛАСЯ З СЫНАМ

Альбіна ВІШНЕЎСКАЯ

**У маці Андрэя Саннікава 24 мая адбылося першае спатканне з сынам. За пяць месяцаў яго зняволення Ала Уладзіміраўна нарэшце змагла з ім пагаварыць.**

Экс-кандыдата ў прэзідэнты з мінскага СІЗА КДБ перавялі ў СІЗА МУС на Валадарскага. Пасля суда Ала Саннікава атрымала дазвол на сустрэчу, якая доўжылася гадзіну.

Андрэй Саннікаў паведаміў, што яго з некаторымі іншымі зняволенымі збіраліся адправіць у Жодзінскі ізалятар. Але потым сказалі, што пакуль адклалі. Павязуць усё ж ці не, нічога не тлумачаць. Газет, як паведаміў Андрэй Саннікаў, ён не атрымлівае. Хаця родныя афармілі яму падпіску. На касацыйную скаргу наконт прысуду (5 гадоў пазбаўлення волі) палітык не ўскладае спадзяванняў.



«Трымаецца ён добра, — распавяла пра сына Ала Уладзіміраўна. — Бадзёры, верыць у сваю справу і барацьбу. Сказаў, што ўмовы тут лепей. Што хоць крышку перадыхнуў. Таму што і месца ўжо ёсць. Я так разумею, што і месца ў СІЗА КДБ у яго не было. Сказаў, што адчувае сябе зараз лепей, таму што можа паляжаць. З сукамернікамі добрыя адносіны. А потым ужо, канешне, усе пытанні пайшлі пра сям'ю і пра мяне. Канешне, хвалюецца за маленькага сына, што з ім адбываецца».

Дом, дзе жыве Ала Уладзіміраўна, знаходзіцца непадалёк і ад СІЗА КДБ, і ад СІЗА МУС. Побач радзільны дом, дзе з'явіўся на свет Андрэй. І школа, дзе ён вучыўся. «Пасмяяліся, пажартавалі, — распавяла яго маці. — Я кажу: «Ты ўсё ў адным квадраце. Нарадзіўся ў гэтым раддоме, жыў побач. Вучыўся тут (на вуліцы Камсамольскай яго школа). Насупраць пасядзеў у КДБ. Цяпер з іншага боку сядзіш у гэтай турме на Валадарскага». Ён кажа: «Так, бачыш, замкнулася маё кола».

«Вы ведаеце, мне настолькі цяжка асэнсоўваць, што ён у турме, — сказала Ала Уладзіміраўна. — За што? У чым яго віна? Ці можна так, каб было такое беззаконне? Яго жыццё прабягае ў мяне ўвесь час у галаве. Я думаю, Божа, рос ён такім паспяховым дзіцём. У мяне ніколі не было з ім ніякіх праблем. І раптам — злачынца, крымінальнік! Гэта ж не ўкладваецца ў галаве.

Я ўжо не раз казала, што каб нейкая віна, дык я як маці сябе б дакарала, што, напэўна, не так выхоўвала. А тут калі ніякай віны не ведаеш… А толькі ўсё менавіта так выхоўвалі — стрыжнем у сям'і было, каб дзеці шанавалі свой гонар. Запаведзь заўсёды ў сям'і была: не здраджваць.

Я адзінае, ведаючы, як дачка змагаецца за брата, проста думаю: магу ганарыцца сваімі дзецьмі. Што яны сумленныя, прынцыповыя, вераць у дабро і праўду. І змагаюцца за яе. І любяць сваю Беларусь.

І я ўжо таксама казала, што пасля таго, калі Андрэй падаў у адстаўку з пасады намесніка міністра МЗС, ды яшчэ і раней, калі дыпакадэмію скончыў — яму прапаноўвалі працаваць у МЗС у Маскве. А ён — нікуды з Беларусі. Вось Беларусь — і ўсё. І бачыце, цяпер стаў яшчэ і змагаром за сваю Беларусь.

Ну якія ў яго настаўленні мне? Сказаў: «Я цябе толькі прашу: трымайся, беражы здароўе, не хвалюйся — я ўсё вытрымаю!»

КАЛОНКА КАНСТАНЦІНА СКУРАТОВІЧА

# І САНКЦЫІ НЕ ПАТРЭБНЫЯ



**Сёння значная колькасць беларусаў прачынаецца ранкам з адной думкай: дзе ўзяць грошы. Прыкладам, для таго, каб аддаць добраму сябру доларавую пазыку, зробленую пару месяцаў таму.**

Ёсць у Беларусі некалькі эканамістаў, якія даўно папярэджвалі, што ўвесь наш эканамічны цуд менавіта так і закончыцца. Але ж з іх ледзь не рагаталі. Маўляў, неяк усё круціцца, хоць і не павінна, калі вас паслухаць. Выступалі прафесары і акадэмікі, акадэмічныя інстытуты. І кожны такі выступ абвяргаў усе вядомыя фізічныя і эканамічныя законы. Прыкладам, закон захавання энергіі і рэчыва лічыўся неабавязковым. Ім задавалася, што як скажа прэзідэнт ці напіша Рубінаў, так яно і будзе.

Неяк зазірнуў у Мінск Пуцін і ўзяў з сабой міністра фінансаў Кудрына. І пакуль прэм'ер галіў бараду перад сустрэчай з Лукашэнкам, небарака-фінансіст распавёў журналістам пра жудасны, на яго думку, стан беларускай эканомікі і пра тое, што больш даваць грошы Мінску не мае сэнсу. Не аддасць.

Зразумела, большую крыўду цяжка было прыдумаць. І Лукашэнка, пачакаўшы ад'езду заклятых сяброў, накінуўся на міністра з брыдкай лаянкай. Маўляў, чаму яны такую агідную істоту трымаюць «на гаспадарцы». І вось дзвюх гадоў не прайшло, тая ж парачка — Пуцін і Кудрын — зноў наведала Беларусь з ужо нашмат горшымі дыспазіцыямі. Патрабуюць, каб крэдыты былі аплочаны маёмасцю лепшых беларускіх прадпрыемстваў.



А між тым эканоміка Беларусі настойліва прагявае квітнець. Вытворчасць ВУП у параўнанні з чатырма месяцамі 2010 года вырасла на 12,3% (па прагнозу павінна была падвысіцца на 9–10%), прамысловая вытворчасць павялічылася на 12,9%, удзельная вага інавацыйнай прадукцыі ў агульным аб'ёме экспарту склаў 12,3%, памер інвестыцый у асноўны капітал падвысіўся на 23,4%. Прадукцыйнасць працы падвысілася на 10,6% пры прагнозе 9,3–9,4%.

Памер экспарту тавараў і паслуг павялічыўся на 41,9%, хоць па прагнозе рост павінен быў скласці 16–16,4%.

Ды нікому яшчэ не ўдавалася ад сябе самога ўцячы. Звернем увагу на дакладнасць лічбаў сацыяльна-эканамічнага прагнозу. Яны вызначаліся міністэрствамі і ведамствамі, удакладняліся ў Міністэрстве эканомікі, іх агучыў прэзідэнт на Усебеларускім сходзе, а пасля і зацвердзіў адпаведным указам. Карацей, гэты прагноз з'яўляецца абавязковым для выканання.

І на табе. Куды не зірні — паўсюль стаханаўцы. Памер экспарту падвысіўся ледзь не ў 1,5 разы. Толькі спраўляйся лічыць валютную выручку. Сталі лічыць — і аказалася, што дэфіцыт знешняга гандлю склаў 17,6% ад памеру стварэння ВУП. Па прагнозе адмоўнае сальда павінна было скласці 8,9–9% (такая дакладнасць!), а на самай справе атрымалася ўдвая большае. Праз такую сітуацыю кажучы: пайшоў па воўну, вярнуўся стрыжаным. Выходзіць, чым лепей Беларусь працуе і чым больш прадае на знешніх рынках тавараў і паслуг, тым большым становіцца памер адмоўнага знешнегандлёвага сальда.

Інакш кажучы, краіна не мае самадастатковай і здольнай да самаразвіцця эканомікі. Яна з'яўляецца натуральным банкрутам, які трывае толькі коштам знешніх пазык. Таму не трэба было ніякіх эканамічных санкцый супраць Лукашэнкі. Дастаткова было крышку зацягнуць тэрміны прадстаўлення чарговага крэдыту, каб усё гэта ўяўнае харастао ляснула.

А калі так, то, на вялікі жаль, трэба адзначыць, што беларуская эканоміка не можа зацікавіць патэнцыйнага інвестара з той нагоды, што не мае цаны.

Хоць і кажуць, што па свеце гуляе вялікая колькасць свабодных грошай, але яны амаль што не трапляюць у Беларусь. Не таму, што мясцовыя ўлады стаяць на пазіцыях «чэснай» прыватызацыі. А таму, што пазіцыя Беларусі як краіны з нявызначаным палітычным лёсам іх мала цікавіць. Значна лепей мець справу з Польшчай, Літвой, Украінай ці той жа Расіяй. Прыкладам, ва Украіне каго ні запытайся пра будучыню, амаль кожны адкажа, што Украіна ёсць і будзе вечна незалежнай. І ўжо адно гэта гарантуе стабільнасць любому бізнэсу.

А ў нас усё абы-як. Аднаму нельга верыць, другі не верыць сам, трэці не ведае, а чацвёрты б'ецца з ветракамі. Бо трэба ж з кімсьці біцца.

Падкрэслім, беларуская эканоміка кіруецца з цэнтру па так званаму прагнозу, які замяніў савецкі план. І кіруецца з такім жа поспехам. Прыкладам, ва ўрадзе вызначылі, што ў краіну трэба прыцягнуць 6,4–6,5 мільярда долараў прамых замежных інвестыцый (трэба і ўсё!), а капіталісты грошай несці не хочуць. І таму ўдалося «наскрэбці» ўсяго 600 мільёнаў.

Дробязь нават для нашай гаротнай невялікай краіны.

ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫЯ

# НЯКЛЯЕЎ З ПАЛІТЫКІ НЕ СЫХОДЗІЦЬ

Вольга ХВОІН

**Лідар кампаніі «Гавары праўду», экс-кандыдат у прэзідэнты Уладзімір Някляеў заявіў, што, нягледзячы на падзеі 19 снежня, ён гатовы ісці на перамовы з уладамі. З вялікай палітыкі паэт сыходзіць не збіраецца.**




## Нягледзячы, наперакор...

«Нягледзячы на ўсё, што здарылася, мы прапануем уладам дыялог. Давайце выпрацуем фармат і разам паспрабуем выбрацца з гэтай сітуацыі», — заявіў лідар «Гавары праўду».

«Гавары праўду» прапануе праект «100 пытанняў ураду». «Гэтыя 100 пытанняў — адзін з крокаў дыялогу. Мы ствараем «Карту праблем Беларусі»: на карту краіны, дзе ёсць найбольш вострыя праблемы, накладаем гэтыя 100 пытанняў ураду, у якіх асэнсаванае наша разуменне гэтых праблем і магчымасці іх вырашэння. Гэта, зноў жа, прапанова дыялогу, жаданне вывесці краіну са стану, які, па сутнасці, жабрацкі», — патлумачыў Някляеў.

Планы «Гавары праўду» на 2012 год пакуль няўцямныя. Лідар кампаніі гаворыць, што цяпер найперш актуальна дамагацца вызвалення палітвязняў. Аднак пра байкот парламенцкіх выбараў размова не ідзе. «Парламенцкія выбары — гэта палітычнае рашэнне. Я б хацеў, каб яно было ўзважаным і агульным. То бок, калі байкот, то ўсіх, калі ўдзел у выбарах — таксама ўсіх. Аднак на фоне наяўнасці палітзняволеных гэта складана абмяркоўваць. Калі палітвязні будуць на свабодзе, можна ставіць на разгляд іншыя пытанні», — зазначыў Уладзімір Някляеў.

Ён заявіў, што сыходзіць з вялікай палітыкі не збіраецца:

— Ёсць сітуацыі, калі мы становімся закладнікамі тых ці іншых нашых дзеянняў, учынкаў, рашэнняў. Я — не выключэнне. Пасля таго, як мяне падтрымалі, чаго я, паэт, што толькі трапіў у палітыку, не чакаў, я проста не маю права сысці, пакінуць людзей. Я не кажу, што без мяне яны загінуць, кожны выплыве самастойна з мора, якое штарміць, але я насамрэч не маю права сказаць :«Прабачце, я зрабіў усё, што мог. Астатняе хай даробіць нехта за мяне». Значэнне слова «пакінуць» было б раўназначнае слову «здрадзіць».

Бліжэйшым часам кампанія «Гавары праўду» звернецца да працы з насельніцтвам. Някляеў заявіў, што, паводле меркаванняў аналітычнай групы, да сацыяльнага выбуху засталося паўгода. І да гэтага трэба рыхтавацца. Кампанія «Гавары праўду» зробіць акцэнт на тлумачэнне прычын паміж палітычнай і эканамічнай сітуацыяй у краіне. «Пралічыўшы развіццё сітуацыі, мы прыйшлі да высновы, што недзе паўгода засталося да першых істотных сацыяльных выбухаў. Значыць, трэба да гэтага рыхтавацца, а не рабіць выгляд, што ў нас усё добра. У гэтай стабільнай краіне трэба стварыць нейкую сацыяльную праграму, стабілізацыйную, каб мінімізаваць тое, што нас чакае не пазней за глыбокую восень», — прыадкрыў бліжэйшую перспектыву кампаніі Някляеў.

Адзін з каардынатараў кампаніі «Гавары праўду» Сяргей Вазняк дадаў, што крыху змяняецца ідэалогія кампаніі: «Калі да верасня мінулага года «Гавары праўду» была практычна сацыяльная, асветніцкая кампанія, дык пасля таго, што адбылося 19 снежня, узмоцніцца палітычны складнік. Людзі не разумеюць, што чэргі за грэчкай, крупамі, у абменнік — вынік таго, што ў краіне ёсць палітвязні, што не вырашаныя праблемы дэмакратыі ў краіне».

## БНР мусіла прынесці ўдачу

Экс-кандыдат у прэзідэнты збіраецца дамагацца расследаваць напад на яго 19 снежня.

— Гэты эпізод для нас мае больш цікаўнасці, чым для следства. Мы яшчэ не разабраліся ў каранях і вытоках памылкі — ні ў якім разе нельга было мяняць маршрут «Гавары праўду» ў апошні дзень. Была мешаніна, мітусня. Мы дагэтуль не высветлілі, адкуль быў першы штуршок да гэтага, — дзівіцца Някляеў. — Калі трапіў у КДБ, я ім сказаў, што яны самі ўсё прыдумалі, каб стварыць такую Плошчу. І яны запэўнівалі: «Што заўгодна, але не нападзенне на перадвыбарчы штаб». Гэта было так шчыра. Хаця іх вучаць гаварыць шчыра там, дзе шчырасцю і не пахне.

План «Гавары праўду», прынамсі як яго цяпер трактуюць лідары кампаніі, быў просты і, трэба прызнаць, крыху наіўны. Але, магчыма, проста не ўсе акалічнасці справы афішуюцца публіцы.

— Лукашэнка не чакаў самой Плошчы. Ён не думаў, што прыйдзе 40–50 тысяч. А калі гэта стала існасцю, то можна было дакладна пабачыць, што будзе далей. Мы не збіраліся сыходзіць з Плошчы, але і трымаць там народ, каб ён там мёрз, таксама не планавалі. Збіраліся заклікаць іх прыйсці назаўтра. Практыка пратэстных плошчаў паказвае, што колькасць людзей падвойваецца назаўтра. 50 тысяч — ужо сто тысяч, а сто тысяч — гэта ўжо дзвесце тысяч. А там — сыходзь! І не інакш, — раскрывае амбітныя намеры мінулага года Някляеў. — Прабіў страх ад главы да пятак. І было прынята рашэнне запалохаць народ. Запалохваліся ж не кандыдаты і іх штабы. І запалохванне народа працягвалася ў арміі, куды ён паехаў і сказаў: «Калі вам падалося мала дубінак і спецназа, то ў наступны раз будзе армія з аўтаматамі». Па сутнасці гэта нейкая падрыхтоўчая форма грамадзянскай вайны. У КДБ праводзілася выхаваўчая праца і дыдактычным матэрыялам быў выступ Лукашэнкі на Новы год і інаўгурацыя. Большага катавання і не ведаю. Дык вось Лукашэнка прызнае, што грамадства не маналітнае і што ён гатовы да дыялогу. Турмы — гэта дыялог? Гэта нават не палітыка і не мараль. Проста подласць. Гэта ўласціва ў нашай краіне толькі аднаму чалавеку.

У нас быў план з двух частак. Пра другую не буду казаць, бо яна не сталася. А першая — правесці Плошчу як усебеларускі сход, на ім утварыць БНР — Беларускі народны рух за выбары без Лукашэнкі. Мне спадабалася гэтая абрэвіятура, падавалася, што яна мусіць прынесці ўдачу. Планавалі ўтварыць рэгіянальныя суполкі арганізацыі, былі падрыхтаваныя транспаранты, расцяжкі. Вы ж разумееце, што ўсё мусіла адбывацца дынамічна, каб людзі адчувалі сябе не статыстамі, а ўдзельнікамі. Потым мы мусілі прыняць рэзалюцыю сходу і перадаць яе ў Дом урада. Плошча Незалежнасці — гэта Дом урада, дзе знаходзіцца прэм'ер, які кіруе краінай у адсутнасць Лукашэнкі. Толькі ён мае права прыняць рашэнне аб непрызнанні выбараў сумесна з адпаведнай камісіяй. Пераход Кастрычніцкай плошчы, праз скверык, азначаў бы расстрэл народа з аўтаматаў ва ўпор.

— У Доме ўрада ёсць кругласуткавае дзяжурства ў прыёмнай прэм'ер-міністра. Меркавалася, што дзяжурны прыме рэзалюцыю і праінфармуе Сідорскага. І Сідорскі мусіў бы неяк рэагаваць — сказаць «так, канешне», або «ідзіце са сваім мітынгам туды, адкуль прыйшлі». Ён не зрабіў ні таго, ні другога, — тлумачыць сутнасць плану Аляксандр Фядута.

МЕРКАВАННЕ

# ДЭФІЦЫТ МОЦЫ

Вольга ХВОІН

**Жаданне Уладзіміра Някляева застацца ў палітыцы вартае ўхвалення — паэт-палітык не апусціў рукі і выказвае намер актыўных дзеянняў. Аднак ці не супярэчліва выглядае дыялог з тымі, хто не лічыцца і не збіраецца лічыцца з іншадумцамі, хто выбудаваў рэпрэсіўную сістэму супраць сваіх грамадзян? І ці магчымы плён прыгожага праекту «100 пытанняў ураду», ураду, які кіруецца жаданнямі аднаго чалавека і не рызыкуе слухаць альтэрнатыўныя меркаванні?**

Натуральна, некалькіх дзён пасля вызвалення ад хатняга арышту, ізаляцыі недастаткова, каб выпрацаваць паўнавартасную праграму дзеянняў. Але ў цяперашняй напружанай сітуацыі, калі градус незадаволенасці ў грамадстве падвышаецца з кожным днём, відаць, ёсць сэнс звярнуцца да канцэлярыі народнага гневу, а не толькі да выпрацоўкі прыгожых планаў.

Апальным прыхільнікам ідэі дыялогу з уладамі летась быў лідар руху «За свабоду», экс-кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Мілінкевіч. «Рэальнай супрацьвагай паступовай ліквідацыі нашага суверэнітэту было прапанавана аўтарытарнаму рэжыму праз Еўрасаюз узаемнае пакрокавае набліжэнне — крытычны абумоўлены дыялог. Тым самым паўстала прастора магчымага ўплыву на палітыку Мінска. ...Не буду хаваць: у мяне таксама, як і ў многіх маіх сяброў дэмакратычных поглядаў, была пэўная горыч. Як можна распачынаць супрацоўніцтва з уладай, якая сістэматычна парушае правы чалавека, прыніжае суграмадзян страхам і афіцыйнай хлуснёй, разбурае нацыянальную ідэнтычнасць? Але працяг самаізаляцыі — гэта пераўтварэнне нашай дзяржавы ў пратэктарат усходняга суседа. Думаю, у такой сітуацыі намі павінна кіраваць не пачуццё помсты, а жаданне захаваць Радзіму і забяспечыць яе рэальную незалежнасць», — выказваў летась сваю пазіцыю Мілінкевіч. За якую і быў няшчадна раскрытыкаваны.

«Дыялог у публічнай прасторы, у палітыцы — адна з падставовых рысаў палітыкі. Другая рыса — канфлікт, барацьба, якая мусіць адбывацца паводле правілаў. Любы палітык мусіць казаць пра дыялог, кампраміс, бо знішчальная барацьба можа быць смяротнай для ўсяго грамадства, — зазначае дарадца Мілінкевіча палітолаг Алесь Лагвінец. — Пра гэта трэба гаварыць, каб не было халоднай вайны ў краіне. Аляксандр Мілінкевіч яшчэ ў 2007 годзе напісаў ліст Лукашэнку, прагназуючы цяперашнюю сітуацыю, і сказаў, што гатовы спрыяць мадэрнізацыі Беларусі з умовай спынення палітычных рэпрэсій. Цяпер усе гэта толькі паўтараюць. Палітыка — гэта вырашэнне канфліктаў мірным спосабам. У нас канфлікты вырашаюцца гвалтоўна. Спыніць такую практыку — адна з задач пабудовы нармальнага грамадства. Трэба быць моцным, і тады цябе будуць слухаць. Маё асабістае меркаванне: цяпер апазіцыя недастаткова моцная, каб пайсці на дыялог. Трэба ўзмацняцца».

Палітолаг Віктар Чарноў пагаджаецца, што ідэю дыялогу прадукуюць не першы раз. Але ёсць аб'ектыўныя прычыны, што перашкаджаюць ёй стаць рэчаіснасцю. «Дыялог магчымы тады, калі за апазіцыяй стаяць рэальныя сілы — раззлаваны народ, незадаволены, з пратэстнымі настроямі. Калі ўлада бачыць, што такія сілы ёсць за нейкім палітыкам і з імі трэба лічыцца, то яна ідзе на дыялог, — гаворыць палітолаг. — За Някляевым такой сілы няма. Таму дыялог не адбудзецца, прынамсі ў бліжэйшай перспектыве. Улады не бачаць у ім сур'ёзнага суперніка. Магчыма, яго такім разглядалі да 19 снежня, гэта і была адна з прычынаў яго нейтралізацыі. Дэкларацыя намеру можа быць з разуменнем сустрэтая ў грамадстве, але на ўлады гэта не спрацуе. Тым больш цяпер ёсць ускладненне: адна з абавязковых умоў для пачатку дыялога ёсць вызваленне палітвязняў. І тут Някляеў ідзе крыху ўразрэз з агульнай устаноўкай апазіцыі».

Абмяркоўваючы прапанаваны праект «100 пытанняў ураду», Віктар Чарноў падкрэсліў, што яго найперш трэба рабіць і даносіць да людзей, да выбарцаў. «Апазіцыя неаднаразова прапаноўвала ўладам і сацыяльныя, і эканамічныя праграмы. Аднак у цэлым падобныя праекты цяпер патрэбныя не столькі ўладам, колькі грамадству. Яно мусіць пабачыць, што ў Беларусі, як і ў любой іншай краіне, ёсць альтэрнатыва афіцыйнаму курсу. Гэтыя праекты трэба піярыць, каб яны дайшлі да кожнага, хто цікавіцца палітыкай. Але што тычыцца названага адрасата — урада, то, я думаю, гэта беспэрспектыўна. Магчыма, асобныя элементы могуць быць выцягнутыя з агульнага пакету, але не больш за тое», — называе памылкі з агучаных ідэй «Гавары праўду» Віктар Чарноў.

7

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 30 МАЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.00** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.05** Зона Х. Дарожныя навіны.
**07.30, 08.25, 11.50** «Дзелавое жыццё».
**08.30** У свеце матораў.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**11.00** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**12.15** «Астэрыкс і Абелікс супраць Цэзара». Эксцэнтрычная камедыя (Францыя).
**14.10** «OFF STAGE LIFE».
**14.30** Nota Bene.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Выпадковыя сувязі». Гумарыстычная праграма.
**16.25** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.25** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**18.25** «Акно ў Еўропу».
**18.50, 01.30** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** «Арэна». Праграма аб спорце.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама».
**21.45** «Камандзіроўка».
**22.00** «Карты, грошы, два ствалы». Камедыя (Вялікабрытанія).
**00.10** «Доктар Хаўс-4». Серыял (ЗША).
**01.05** Інфармацыйна-забаўляльная праграма «Праверка чутак».
**01.40** Дзень спорту.

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** Тэлечасопіс «Саюз».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік».
**18.55** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Адчынены фармат».
**22.15** Фільм «Больш, чым каханне».
**00.15** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**01.10** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Фантастыка пад грыфам «Сакрэтна».
**13.50** «Зорны рынг».
**15.00** Канцэрт М.Задорнава.
**16.00** СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Код Апакаліпсісу». Расія, 2007 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Сталічны футбол».
**23.30** Фільм «Апошні шанец Харві». ЗША.

**06.30** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** «ЛАДная раніца».
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.00** «Зламі мяне, калі зможаш». Дэтэктыў.
**11.30** Пра мастацтва.
**12.00** Школа рамонту.
**12.55** «Гадзіна суду. Справы сямейныя».
**14.00** Дэтэктыўная меладрама «Лясун. Працяг гісторыі» (Расія). 1-я серыя.
**15.05** Мультсерыял «Сямейка піратаў».
**15.30** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення».
**16.35** Пазакласная гадзіна.
**16.50** «Кулінарыя для дзяцей». Мультфільм.
**16.55** «Навіны надвор'я».
**17.25** Дакументальна-гістарычны серыял «Мяжа. Рэч Паспалітая» (Беларусь).
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**19.35** Серыял «Дзяржаўная мяжа».
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Беларуская часіна.
**22.30** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**23.05** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.45** Авертайм.

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.00** «Карціна свету».
**09.55** Надвор'е на тыдзень.
**10.00** «Пакой смеху».
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**12.20** «Кулагін і партнёры».
**12.50** «Я - кібарг. Чалавек будучыні. Якімі мы будзем». Дакументальны фільм.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Сямейны агмень».
**22.25** Тэлесерыял «Брыгада».
**23.30** «Нічога асабістага».
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі.ru».
**00.20** Прэм'ера. «Бярозка». Дак. фільм.

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Праграма Максімум».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15** Сёння.
**10.20** «Кулінарны паядынак».
**11.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**12.05** «Да суду».
**13.25** «Пракурорская праверка».
**14.25** «Давайце мірыцца!».
**15.15** «Справа густу».
**15.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Масква. Цэнтральная акруга».
**23.40** «Сумленны панядзелак».

**09.30** Мотаспорт. Часопіс. Агляд падзей тыдня.
**09.45** Лёгкая атлетыка. Марафон. Стакгольм.
**10.45** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Дзень 8-ы.
**11.30** Тэніс. Гейм. Сэт. Матс.
**12.00** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Дзень 9-ы.
**21.30** Тэніс. Гейм. Сэт. Матс.
**21.45** Вось дык так!!!
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.35** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.30** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**00.00** Супербайк. Чэмпіянат свету. ЗША. 1-ы этап.
**00.30** Супербайк. Чэмпіянат свету. ЗША. 2-і этап.
**01.30** Суперспорт. Чэмпіянат свету. ЗША.
**02.15** Тэніс. Гейм. Сэт. Матс.

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.30** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**07.40** «Час гонару», серыял: 31 серыя.
**08.30** Дак. гадзіна: «Рэвалюцыя», дак. фільм, 2007 г., Францыя: 4 серыя, «Аргентына: рэвалюцыя рондаляў і патэльняў».
**09.20** Прыватная калекцыя.
**09.50** На колах.
**10.20** «Сыс пра Сыса», дак. фільм, 2010 г., Польшча.
**10.50** «Бульбаны», мультсерыял.
**10.55** ПраСвет.
**11.25** Вагон.
**11.30** «Катынь», дак. фільм, 2010 г., Польшча.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Сальвадор Альендэ», дак. фільм, 2004 г., Чылі.
**13.45** «Час гонару», серыял: 31 серыя.
**14.30** «Бульбаны», мультсерыял.
**14.40** Дак. гадзіна: «Рэвалюцыя», дак. фільм, 2007 г., Францыя: 4 серыя, «Аргентына: рэвалюцыя рондаляў і патэльняў».
**15.35** На колах.
**16.00** «Сыс пра Сыса», дак. фільм, Польшча.
**16.30** ПраСвет.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Пікавая Сямёрка», серыял: 2 серыя.
**17.30** «Час гонару», серыял: 31 серыя.
**18.20** Дак. гадзіна: «Рэвалюцыя», дак. фільм, 2007 г., Францыя: 4 серыя, «Аргентына: рэвалюцыя рондаляў і патэльняў».
**19.10** Хто ёсць кім?: «Алесь Мех – беспрацоўны інжынер».
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар.
**19.40** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** «Над Нёмнам» (тэлечасопіс).
**20.05** Еўропа сёння.
**20.30** Эксперт.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**21.40** «Дарога», маст. фільм, 2002 г., Чэхія–Славакія.
**23.20** Аб'ектыў.

## 31 МАЯ, АЎТОРАК

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.05** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.05** Зона Х. Дарожныя навіны.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**11.40** «Камандзіроўка».
**12.10** «Адчайныя хатнія гаспадыні-5». Камедыйны серыял (ЗША).
**13.45** Патрабуецца.
**14.00** «Здароўе».
**14.25** «Культурныя людзі». Інфармацыйна-забаўляльная праграма.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Эпоха».
**16.05** Серыял «Дыхай са мной» (Расія).
**17.00** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.55** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**18.50, 01.10** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** «Сфера інтэрасаў». Эканамічная праграма.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**22.15** «Небяспечны Бангкок». Трылер (ЗША).
**00.15** «Доктар Хаўс-4». Серыял (ЗША).
**01.15** Дзень спорту.

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Фільм «Выходжу цябе шукаць».
**22.15** Драма «Штучная хлусня».
**23.55** «Несакрэтныя матэрыялы».
**00.25** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**01.20** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Гаворыць і паказвае Мінск».
**09.00** Фільм «Код Апакаліпсісу». Расія, 2007 г.
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Фірмовая гісторыя». Серыял.
**14.40** «Next». Серыял. Заключная серыя.
**15.35** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Даішнікі 2». Серыял.
**21.30** «Сапраўдная гісторыя».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Забойная сіла». Серыял.
**00.00** «Меч». Серыял.

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** «ЛАДная раніца».
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.40** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.40** Серыял «Дзяржаўная мяжа».
**11.00** Авертайм.
**11.30** «Страсці па культуры».
**12.10** «Гадзіна суду. Справы сямейныя».
**13.15** Дэтэктыўная меладрама «Лясун. Працяг гісторыі» (Расія). 2-я серыя.
**14.20** Мультсерыял «Сямейка піратаў» (Францыя). Заключная серыя.
**14.45** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення».
**15.45** Пазакласная гадзіна.
**16.05** «Кулінарыя для дзяцей». Мультфільм.
**16.25** Прыгодніцкі серыял «Тры талеры» («Беларусьфільм»). 1-я серыя.
**17.25** Дакументальна-гістарычны серыял «Мяжа. Падзел Рэчы Паспалітай» (Беларусь).
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**19.35** Серыял «Дзяржаўная мяжа».
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Беларуская часіна.
**22.30** Камедыйны серыял «Інтэрны» (Расія). Заключная серыя.
**23.10** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.45** «Спорт-кадр».

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** «Прамы эфір».
**10.10** «Не спрачайся з Богам. Анатоль Рамашын». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Нічога асабістага». Інфармацыйна-сатырычная праграма.
**11.50** Тэлесерыял «Сямейны агмень».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Тэлесерыял «Сямейны агмень».
**22.25** Тэлесерыял «Брыгада».
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** «Весткі.ru».
**00.00** Прэм'ера. «Руская Аляска. Прададзена!». Дакументальны фільм.

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Рускія сенсацыі».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Кватэрнае пытанне».
**11.25** «Увага: вышук!».
**12.05** «Да суду».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Пракурорская праверка».
**14.25** «Давайце мірыцца!».
**15.15** «Справа густу».
**15.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Масква. Цэнтральная акруга».
**23.15** Сёння.
**23.40** «Школа зласлоўя».

**09.30** Тэніс. Гейм. Сэт. Матс.
**09.45** Веласпорт. Джыра д'Італія. 21-ы этап. Тур Італіі.
**10.45** Веласпорт. «За кулісамі». Часопіс.
**11.15** Футбол. Кубак чатырох нацый. Ірландыя - Шатландыя.
**12.30** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**13.00** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Дзень 9-ы.
**14.45** Тэніс. Гейм. Сэт. Матс.
**15.00** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. 1/4 фіналу.
**20.30** Тэніс. Гейм. Сэт. Матс.
**21.00** Лёгкая атлетыка. «Гран-пры» Вострава (Чэхія).
**22.30** Бокс. Міжнародны турнір.
**00.00** Аўтагонкі. Сусветная серыя Рэно. Манака. Агляд.
**00.30** Мотаспорт. Часопіс. Агляд падзей тыдня.
**00.45** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. 1/4 фіналу.
**02.00** Тэніс. Гейм. Сэт. Матс.

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**07.40, 13.45** «Ранча Пікавая Сямёрка», серыял: 2 серыя.
**08.05, 14.10** «Адэса... Адэса!», дак. фільм, 2004 г., Ізраіль–Францыя.
**09.45** Еўропа сёння.
**10.15** Хто ёсць кім?: «Алесь Мех – беспрацоўны інжынер».
**10.30** «Ранча», серыял: 1 серыя.
**11.20** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**11.30** Эксперт.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Дарога», маст. фільм, 2002 г., Чэхія–Славакія.
**15.50** Еўропа сёння.
**16.15** Хто ёсць кім?: «Алесь Мех – беспрацоўны інжынер».
**16.30** Эксперт.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Пікавая Сямёрка», серыял: 3 серыя.
**17.35** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 39 серыя.
**18.30** «Маргарэт Тэтчэр. Дзяцінства праваднікі», дак. фільм, 2008 г., Францыя.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.10** Праект «Будучыня».
**20.40** Паляванне на дзівосы.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Сальда (эканамічная праграма).
**21.40** «Катынь. Праз 70 гадоў», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**22.10** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 8 серыя.
**22.55** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ 8

## 1 ЧЭРВЕНЯ, СЕРАДА

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.50** Навіны.
**06.05, 07.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.05** Зона Х. Дарожныя навіны.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.15** «Сфера інтэрасаў».
**08.40** «Маша і Мядзведзь». Мультфільм.
**08.50** Выпускныя іспыты.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**11.40** Адмысловы рэпартаж «Прамая сувязь».
**12.10** «Адчайныя хатнія гаспадыні-5». Камедыйны серыял (ЗША).
**13.45** Патрабуецца.
**14.00** «Акно ў Еўропу».
**14.25** Інфармацыйна-забаўляльная праграма «Праверка чутак».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Эпоха».
**16.05** Серыял « Дыхай са мной « (Расія).
**17.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.55** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**18.50, 00.55** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Зямельнае пытанне.
**19.50** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.00** «Кожны хоча кахаць». Камедыя (Францыя).
**00.00** «Доктар Хаўс-4». Серыял (ЗША).
**01.00** Дзень спорту.

---

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.20** «Смак».
**11.05, 13.05, 16.10** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Шматсерыйны фільм «Выходжу цябе шукаць».
**22.15** Фільм «Каралева».
**00.10** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**01.05** Начныя навіны.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Даішнікі 2». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Сапраўдная гісторыя».
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Фірмовая гісторыя». Серыял.
**14.40** «Next 2». Серыял.
**15.30** «Забойная сіла». Серыял.
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Даішнікі 2». Серыял.
**21.30** «Мінск і мінчане».
**22.05** «Дабро пажаліцца».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Забойная сіла». Серыял.
**00.00** «Меч». Серыял.

---

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны» (Расія). Заключная серыя.
**08.40** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.40** Серыял «Дзяржаўная мяжа».
**11.00** Спорт-кадр.
**11.25** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**12.15** Медычныя таямніцы.
**12.50** Медычныя таямніцы +.
**13.05** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**14.10** Дэтэктыўная меладрама «Лясун. Працяг гісторыі» (Расія). 3-я серыя.
**15.20** «Бязмежныя людзі».
**15.45** Пазакласная гадзіна.
**16.00** «Кулінарыя для дзяцей». Мультфільмы.
**16.25** Прыгодніцкі серыял «Тры талеры» («Беларусьфільм»). 2-я серыя.
**17.25** Дакументальна-гістарычны серыял «Мяжа. Вайна 1812» (Беларусь).
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** Дак. фільм «Ты самы лепшы» (БТРК).
**19.35** Серыял «Дзяржаўная мяжа».
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** «Спортлато 5 з 36».
**21.25** КЕНО.
**21.30** Беларуская часіна.
**22.35** Рэальны свет.
**23.05** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.30** Авантурная камедыя «Штукары» (Вялікабрытанія).

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** «Прамы эфір».
**10.10** «Сярожа Парамонаў. Савецкі Раберціна Ларэці». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Сямейны агмень».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Сямейны агмень».
**22.25** Тэлесерыял «Брыгада».
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** «Весткі.ru».
**00.00** Прэм'ера. «Завяшчанне Леанарда. Гісторыя аднаго рабавання «. Дак. фільм.

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Гісторыя ўсерасійскага зману».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15** Сёння.
**10.20** «Дачны адказ».
**11.20** «Жаночы погляд».
**12.05** «Да суду».
**13.25** «Пракурорская праверка».
**14.25** «Давайце мірыцца!».
**15.15** «Справа густу».
**15.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Маска. Цэнтральная акруга».
**23.40** «Сапраўдны італьянец». Дакументальны праект.

### EUROSPORT

**09.30** Лёгкая атлетыка. Марафон.
**10.30** Лёгкая атлетыка. Гран-пры. Вострава (Чэхія).
**11.00** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**11.30** Тэніс. Гейм. Сэт. Матс.
**12.00, 15.00, 00.45** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. 1/4 фіналу.
**12.30** Тэніс. Гейм. Сэт. Матс.
**20.30** Тэніс. Гейм. Сэт. Матс.
**21.00** Вось дык так!!!
**21.10** Конны спорт. Рым.
**22.10** Riders club. Часопіс.
**23.15** Гольф. Еўрапейскі турнір. Чэмпіянат BMW.
**23.45** Гольф. Еўрапейскі турнір. Жанчыны.
**00.00** Гольф клуб. Часопіс.
**00.05** Яхт-клуб. Навіны ветразевага спорту.
**00.10** Абранае па серадах.
**00.15** Алімпійскі часопіс.
**01.30** Тэніс. Гейм. Сэт. Матс.
**02.00** Лёгкая атлетыка. Марафон.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20, 13.40** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 3 серыя.
**07.50** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 39 серыя.
**08.45** МакраФон: «Права быць свабодным» (канцэрт альтэрнатыўнай музыкі Луцк-2007): ч. 1, выступ гуртоў «Сцяна», «В:N:», «Тінь Сонця».
**09.20** Сальда (эканамічная праграма).
**09.35** Праект «Будучыня».
**10.05, 15.35** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**10.30** «Ранча», серыял: 2 серыя.
**11.25** «Катынь. Праз 70 гадоў», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Дзеці і рыбы», маст. фільм, 1997 г., Польшча.
**14.05** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 39 серыя.
**15.00** Праект «Будучыня».
**15.30** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**16.05** Паляванне на дзівосы.
**16.25** «Катынь. Праз 70 гадоў», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 4 серыя.
**17.30** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 8 серыя.
**18.20** «Музычныя партызаны», дак. фільм, 2007 г., Польшча.
**19.10** Асабісты капітал.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**20.05** На колах.
**20.30** Басанож па свеце.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Побач з намі.
**21.40** Вагон.
**21.50** «Дэкалог, сем», маст. фільм, 1990 г., Польшча.
**22.45** «Euromaxx».
**23.10** Аб'ектыў.

## 2 ЧЭРВЕНЯ, ЧАЦВЕР

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.45** Навіны.
**06.05, 07.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.05** Зона Х. Дарожныя навіны.
**07.30, 08.15, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Зямельнае пытанне.
**08.40** «Маша і Мядзведзь». Мультфільм.
**08.50** Выпускныя іспыты.
**09.10** Слова Мітрапаліта Філарэта.
**09.20** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.15** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**11.05** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**12.10** «Адчайныя хатнія гаспадыні-5». Камедыйны серыял (ЗША).
**13.45** Патрабуецца.
**14.00** Шэф-кухар.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Эпоха».
**16.05** Серыял «Дыхай са мной» (Расія).
**17.00** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.55** Серыял «Маруся. Вяртанне».
**18.50, 01.45** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** «Клуб рэдактараў».
**22.30** «Уцёкі «. Баявік (Расія).
**00.55** «Доктар Хаўс-4». Серыял (ЗША).
**01.55** Дзень спорту.

---

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.20** «Смак».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Шматсерыйны фільм «Выходжу цябе шукаць».
**22.15** Камедыя «Сіці-Айленд».
**00.10** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**01.05** Ночные навіны.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Даішнікі 2». Серыял.
**09.30** «Дабро пажаліцца».
**09.50** «Вялікі горад».
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.45** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Фірмовая гісторыя». Серыял.
**14.40** «Next 2». Серыял.
**15.30** «Забойная сіла». Серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Даішнікі 2». Серыял.
**21.30** «Праўда».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Забойная сіла». Серыял.
**00.00** «Меч». Серыял.

---

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.00** Серыял «Дзяржаўная мяжа».
**10.20** Лабірынты мастацкай культуры Заходняй Беларусі.
**10.50** Меладрама «Двое на выспе слёз» («Беларусьфільм»).
**12.25** Дача здароўя.
**13.00** Жансавет.
**13.35** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**14.40** Дэтэктыўная меладрама «Лясун. Працяг гісторыі» (Расія). 4-я серыя, закл.
**15.45** Мультсерыял (Расія). 1-я серыя.
**16.00** Пазакласная гадзіна.
**16.15** «Кулінарыя для дзяцей». Мультфільмы.
**16.30** Прыгодніцкі серыял «Тры талеры» («Беларусьфільм»). 3-я серыя.
**17.30** Дакументальна-гістарычны серыял «Мяжа. Брэсцкі мір» (Беларусь).
**18.00** Меладраматычны серыял «Ты маё жыццё» (Аргенціна).
**19.05** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**19.40** Серыял «Дзяржаўная мяжа».
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Беларуская часіна.
**22.30** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.05** Час футболу.
**23.35** Драма «Палата №6» (Расія).

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** «Прамы эфір».
**10.10** Прэм'ера. Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Сямейны агмень».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Тэлесерыял «Сямейны агмень».
**22.25** Тэлесерыял «Брыгада».
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** «Весткі.ru».
**00.00** «Паядынак».

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Следства вялі…».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Баль на ўвесь свет».
**11.15** «Сапраўдны італьянец». Дакументальны праект.
**12.05** «Да суду».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Пракурорская праверка».
**14.25** «Давайце мірыцца!».
**15.15** «Справа густу».
**15.40** Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Маска. Цэнтральная акруга».
**23.15** Сёння.
**23.35** «Увага: вышук!».

### EUROSPORT

**09.30** Конны спорт. Рым (Італія).
**10.30** Конны спорт. Часопіс.
**11.00** Тэніс. Гейм. Сэт. Матс.
**11.30** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. 1/4 фіналу.
**14.30** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. 1/2 фіналу.
**19.00** Тэніс. Гейм. Сэт. Матс.
**19.30** Еўрагалы. Часопіс.
**19.40** Футбол. Моладзевы фэст. Тулон (Францыя). Групавы этап. Францыя - Мексіка.
**21.45** Адзінаборствы. Суперкомбат. Румынія.
**00.00** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. 1/2 фіналу.
**01.00** Футбол. Моладзевы фэст. Тулон (Францыя). Групавы этап. Францыя - Мексіка.
**02.00** Тэніс. Гейм. Сэт. Матс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 4 серыя.
**07.50** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 8 серыя.
**08.35** МакраФон: «Minsk-Mixt–2008»: Канцэрт гурта «B:N:».
**08.55** Асабісты капітал.
**09.15** Басанож па свеце.
**09.40** На колах.
**10.05** Героі не нашага часу: «Уладзімір Парфяновіч: звычка перамагаць».
**10.25** Побач з намі.
**10.40** «Ранча», серыял: 3 серыя.
**11.30** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Дэкалог, сем», маст. фільм, 1990 г., Польшча.
**13.00** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 4 серыя.
**13.25** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 8 серыя.
**14.10** МакраФон: «Minsk-Mixt–2008»: Канцэрт гурта «B:N:».
**14.35** Вагон.
**14.40** «Бульбаны», мультсерыял.
**14.50** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**15.15** Басанож па свеце.
**15.45** Героі не нашага часу «Уладзімір Парфяновіч – звычка перамагаць».
**16.00** Побач з намі.
**16.20** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**16.30** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Школа на санцапёку», серыял: 13 серыя.
**17.25** «Дэкалог, сем», маст. фільм, 1990 г., Польшча.
**18.20** «Дзяк і «Трохграшовая опера», дак. фільм, 2007 г., Італія.
**19.00** YoLife!
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** Навігатар.
**20.15** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.40** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Беларусы ў Польшчы .
**21.40** «Пуаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 8 серыя.
**22.30** Рэпартэр.
**22.55** МакраФон: «Рок-карона–2010»: ч. 3.
**23.25** Аб'ектыў.

# ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Выпуск №5 (57)
(травень)

www.lit-bel.org www.novychas.gmail.com

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу»


**Анонс**


«НАВІНЫ»: літаратурна-грамадскае жыццё траўня ... с. 2.
«АСОБА»: 80-годдзе «доктара беларускасці» Алега ЛОЙКІ ... с. 3.
«ПУБЛІЦЫСТЫКА»: артыкул пра іншадумства Станіслава ДУБЯНЕЦКАГА ... с. 4.
«ПРОЗА»: апавяданне «Забі гэта!» Уладзіміра САДОЎСКАГА ... с. 5.
«ПАЭЗІЯ»: «Белае маўчанне, чорная немата» — вершы Валерыя ДУБОЎСКАГА ... с. 6.
«ФОРУМ»: вершы Эдуарда ГРАКОВІЧА ... с. 7.
«ФРАГМЕНТЫ»: раздзел з новай кнігі Леаніда ДРАНЬКО-МАЙСЮКА пра Браніслава ТАРАШКЕВІЧА ... с. 8–9.
«ПРОЗА»: «Цяжкасці разумення», апавяданне Сяргея КАЛЕНДЫ. с. 10.
«НАРЫС»: «Шопінг па-беларуску» Галіны КАРЖАНЕЎСКАЙ ... с. 11.
«УСПАМІНЫ»: згадкі Ніны БУЛАЎКІ пра СБМаўскае жыццё і сталінскія лагеры ... с. 12.
«КРЫТЫКА»: ЛеГАЛ пра чарговы — 51-ы — нумар «ДЗЕЯСЛОВА»..с. 13.
«ВАНДРОЎКІ»: эсэ Валерыя СТРАЛКО пра шведскі Готланд...с. 14–15.
«КАЛЕЙДАСКОП»: анонсы, выданні і людзі месяца ... с. 16.


АКТУАЛІІ

# КНІГА Ў ГАЛАВЕ



Фота www.bibliolater.ru

Сяргей АСТРАЎЦОЎ

**Часам сустрэнеш сярод старых камяніц, дзе люблю пахадзіць, чалавека з кнігай у галаве — гатовай, ці якая яшчэ ў працэсе. Я й сам такі.**

Мне больш імпануюць тыя, хто хоча сказаць штосьці пра замкі, фарты, каралёў, пра гарадзенцаў. Адзін аўтар напісаў пра сваю родную Сібір, але ў Горадні чытаць пра Сібір не хочацца, у тутэйшых яна не ў пашане…

## Пісаць ці не пісаць?

Дурацкае пытанне. Хоць некаторыя вядомыя раілі: калі можаш не пісаць — не пішы. А калі не можаш? Амерыканскі празаік Поль Тэру расказвае выпадак. Заможны дзялок, які бавіўся вершыкамі, наіўна пацікавіўся ў яго: пісьменніцтва — ці добры спосаб зарабіць на жыццё? Не, канечне, але гэта файнае жыццё, — адказаў пісьменнік.

Файнае, бо звычайна робіш тое, што табе падабаецца. Пакуль не даходзіць да выдання кнігі: дзе ўзяць грошы? Адзін сталічны празаік наракаў: у выдавецтве кніжку надрукуюць, а ганарар не даюць. Я прамаўчаў. Чалавеку бясплатна выпусцілі кнігу, і такі зморчны. А калі трэба заплаціць з уласнай кішэні, каб выйшла? Ад абурэння адмовіўся б пісаць?

Сумны чалавек звяртаецца да цябе на вуліцы з немым пытаннем: як надрукаваць кніжку, каб добра і не задорага? Першую здаў у дзяржаўную друкарню, яна безнадзейна рассыпалася, кажа. Другую хацеў — хай толькі дзесяць штук, але да дня нараджэння ўнука. У прыватнай фірме зрабілі так, што бясплатна такую б не ўзяў, а давялося заплаціць. З гэтай кнігай у галаве я й заспеў яго, з пытальнікам у вачах.

Нейк сустрэў іншага знаёмага з навіной: толькі ад вялікага чыноўніка, дае грошы на кніжку! Колькі, пытаецца, трэба? Мільёнаў пяць-шэсць? Не праблема, стралкам ды бегунам на экіпіроўку далі тры з паловай мільярды. Знаёмы здзіўляецца: на лукі-стрэлы, на красоўкі, колькі гэта кніжак можна было б надрукаваць…

## Вершы пад дахам

Мэта майго гарадзенскага знаёмага — саюз пісьменнікаў, «чэсны» саюз. Але там, у сталіцы, сказалі: публікацый хапае, кніжкі няма! Чалавек выказвае здзіўленне: калі толькі стварылі саюз — яшчэ той, сталінскі, — ніякіх праблем не існавала: надрукаваў аповесць у часопісе — калі ласка! Так, пагаджаюся, але маглі прыняць, а маглі расстраляць, пад настрой… Ха-ха-ха! — пасмяяліся, але не доўга.

На суседняй камяніцы вулічная шыльда са сталёвым пяром: тут філія «чэснага» саюза. У іх галава не баліць, яны на бюджэце, ні пра арэнду, ні пра што думаць не трэба. Два пакоі маюць адразу, і саюзы пісьменнікаў два, але іхні — арганізацыя з месцам сустрэчы, а «нячэсны» — беспрытульны, без даху над галавой. Так, паасобныя творцы, накшталт гарадскіх партызанаў.

Шыльду мець зусім нядрэнна. Завіталі нейк скандынаўскія аўтары, начальства іх падручкі і да сваіх паэтаў-празаікаў. У скандынаваў пісьменнікі адчуваюць падтрымку, іх не дзеляць на два гатункі, у іх літаратурныя агенты, яны свабодна ездзяць і суразмоўнічаюць з замежнымі калегамі і выдаўцамі.

Паставіць у думках сябе на месца шведаў альбо фінаў я не магу, пацікаўлюся лепей: як знаёмцу собіла трапіць на прыём да чыноўніка, у якога ў шуфлядзе грошы на кніжкі? Хто б мог падумаць! Параілі запісацца па асабістым пытанні. А хіба гэта асабістае? А якое ж?! Там усе па асабістых, толькі праблемы іншыя: дах цячэ, газ не праводзяць, у студні дрэнная вада. А тут чалавек з кніжкай раптам! Словам: у патрэбны час у патрэбным месцы. Ну й кніжка павінна быць мясцовага зместу, сказала начальства…

Маем іншы прыклад: каб надрукаваць «раман пра каханне», чалавек узяў крэдыт у банку. Жонка яўна была не радая. Але мяне, кажу, пра каханне мясцовая белетрыстыка не надта закранае. Праўда, аўтары нярэдка маюць схільнасць да збыткоўнай лексікі або да дзівосных сказаў, воку робіцца цікавей: «на шыі адзення рукі замацавалі новую зашпільку», «хлопчык упаў у яму вышынёй два метры», «лядашчы плот без весніц стаяў разнасцежаны», у яго на галаве была «вузкая спартыўная кепка».

Разумею, разумею, часам складана апанаваць думкі, калі іх шмат, словы разбягаюцца як авечкі ці кураняты, трэба загнаць іх, абмежаваць, скласці ў кнігу, схаваць пад вокладку. А гэта зусім не проста, як здаецца, дастаткова паслухаць бясконцыя даклады. Часам тэлевізар гаворыць адно, думае другое, робіць трэцяе. Чыталі, чыталі «Тутэйшых», — вельмі ў духу. З кніжкамі таксама гісторыі здараюцца: на вокладцы адзін горад, друкуецца ў другім, а перапраўляецца цераз мяжу, каб заблытаць сляды, у трэцім. Мацей ты наш, Бурачок… У «чэсны» саюз яго сёння наўрад ці ўзялі б, хоць і кніжку меў.

**Радыё Свабода**

## АНОНС

**Алесь КАСКО. Нічога больш: вершы і пераклады. — Брэст: «Альтэрнатыва», 2011. — 96 стар.**

Чарговы зборнік лаўрэата літаратурных прэмій Алеся Каско выйшаў пасля дзесяцігадовага перапынку. На вершах апошняга перыяду ляжыць адбітак творчага і пэўнага жыццёвага падсумавання:

*Я з кожнай магілай сябе крыжаваў,*
*звыкаўся з адвечнай людскою юдоляй*
*і жаль свой агучваў —*
*нічога не выказаў болей.*
*Ставала мне радасці: ветру і полю,*
*птушкам і вёснам не раз тураваў*
*сваім падгалоскам —*
*нічога не выказаў болей…*
*Ці стаў я паэтам?*
*Нічога не выказаў болей,*
*чым тое, што ў лёсе сваім прачытаў.*




Арганічна ў агульны змест і настрой кнігі ўплятаюцца новыя пераклады паэта з шэрагу славянскіх (македонскай, польскай, расійскай, украінскай), а таксама з нямецкай моў.

ПАДЗЕІ

# САЛІДАРНАСЦЬ З ЛІТАРАТУРНАЙ БЕЛАРУССЮ

**10 траўня ў Нацыянальным тэатры сталіцы Фінляндыі Хельсінкі адбыўся «Вечар свабоды Беларусі». На сцэне тэатра гучалі вершы беларускага паэта, былога кандыдата ў прэзідэнты Уладзіміра Някляева, а таксама распавядалася пра сённяшнюю сітуацыю ў Беларусі, пра судовыя працэсы над экс-кандыдатамі ў прэзідэнты і ўдзельнікамі акцыі пратэсту 19 снежня.**

Адна з арганізатараў акцыі салідарнасці з Беларуссю ў Фінляндыі — дачка паэта і былога кандыдата ў прэзідэнты Ева Някляева — у інтэрв'ю «Радыё Свабода» адзначыла, што фінаў вельмі ўсхвалявала тое, што адбываецца ў Беларусі цягам апошніх месяцаў: «Калі я размаўляла з прадстаўнікамі МЗС Фінляндыі, яны мне казалі, што падзеі ў Беларусі выклікалі наймацнейшую рэакцыю ў фінскім грамадстве. Шараговыя фіны пішуць і тэлефануюць у МЗС і просяць, каб Беларусь заставалася ў прыярытэтах фінскай замежнай палітыкі».

Таму Ева Някляева разам з сябрамі, прадстаўнікамі творчай інтэлігенцыі вырашыла расказаць пра тое, што адбываецца цяпер у Беларусі: «Мы будзем распавядаць пра апошнія навіны з Беларусі — пра тое, як праходзяць суды, пра жорсткія прысуды, якія ўжо атрымалі актывісты, пра тое, як праходзяць працэсы над Саннікавым і маім бацькам. У праграме акцыі — вершы майго бацькі, якія пераклаў на фінскую мову Юка Малінэн. Юка быў вельмі ўражаны тым, што здарылася з татам».

Фінскі паэт Юка Малінэн (Jukka Mallinen) пазнаёміўся і пасябраваў з Уладзімірам Някляевым, калі той жыў у Хельсінкі:

«Сапраўды, гэта мой добры сябар. Нядаўна выйшла падборка ягоных вершаў у нашым асноўным літаратурным часопісе «Парнас». Цяпер я пераклаў яго вершы адмыслова для гэтай вечарыны. Вершы цікавыя, там беларуская душа, такая меланхолія, стрыманыя сантыменты. Усё гэта даволі блізка і для фінскай душы. У нас быў вядомы паэт Эйна Лейна (Eino Leino), які жыў на пачатку мінулага стагоддзя, дык настроем, песімізмам Някляеў падобны да яго, як я зразумеў, калі яго перакладаў». Юка Малінен бываў у Беларусі, сустракаўся з актывам Саюза беларускіх пісьменнікаў. Гэта і пры ягоным спрыянні як кіраўніка фінскага ПЭН-цэнтра быў расшуканы і перавезены да Вільні валун на магілу Васіля Быкава.

Перад вечарынай Ева Някляева выбрала ўрыўкі з блогаў удзельнікаў падзеяў, якія былі на плошчы Незалежнасці 19-га снежня, і з іх фінскі рэжысёр зрабіў імправізаваны спектакль. Таксама гучала музыка — фінскія музыкі адгукнуліся на заклік далучыцца да гэтай акцыі. «Там вядучыя фінскія акцёры сярэдняга пакалення, вельмі добрыя музыкі — першыя асобы нашага тэатральнага і музычнага свету — праяўляюць сваю салідарнасць з вольнай Беларуссю», — расказаў «Радыё Свабода» фінскі паэт Юка Малінэн.

Адзначым, што з беларускімі літаратарамі-вязнямі — Уладзімірам Някляевым, Аляксандрам Фядутам, Паўлам Севярынцам — салідарызуецца еўрапейская пісьменніцкая супольнасць: Еўрапейская Пісьменніцкая Рада, Балтыйскі Пісьменніцкі Саюз, Саюзы пісьменнікаў і ПЭН-цэнтры дзясяткаў краін, у тым ліку і Скандынавіі. Падтрымка калегаў гучыць не толькі з Фінляндыі, але і са Швецыі, дзе ў хуткім часе выйдзе кніга Уладзіміра Някляева, Польшчы.

Каля сотні паэтаў, літаратараў і дзеячоў культуры з усяго свету нядаўна падпісалі ліст салідарнасці з Уладзімірам Някляевым і іншымі рэпрэсаванымі беларускімі літаратарамі ды заклікалі беларускія ўлады і суд неадкладна вызваліць паэта: «У сваёй прамове на судовых слуханнях 6 траўня паэт Уладзімір Някляеў сказаў: «Я паэт. У мяне няма «юрыдычнага» мыслення. І ніхто ўжо нічога не можа з гэтым зрабіць. Ёсць рэчы нашмат важнейшыя, чым юрыспрудэнцыя ці палітыка. Сакральныя рэчы. Чалавек — больш, чым проста юрыст або палітык», — цытуе калектыўную заяву polskieradio.pl. — Уладзімір Някляеў ... быў збіты да страты прытомнасці, да чэрапна-мазгавой траўмы ... выкрадзены з рэанімацыі і арыштаваны. Цяпер ён паўстаў перад судом за арганізацыю дзеянняў, у якіх у яго нават не было магчымасці ўдзельнічаць. Мы заяўляем аб сваёй падтрымцы Уладзімера Някляева і яго сяброў. Мы стаім на Плошчы разам з імі. Камусьці можа здацца дзіўнай наша еднасць моцнай веры ў тое, што ёсць рэчы, больш важныя, чым палітыка альбо юрыспрудэнцыя. Але мы заяўляем, што жыццё Паэта, свабода Паэта нашмат важнейшыя, чым часовыя патрабаванні дадзенага гістарычнага моманту. Уладзімір Някляеў аддаў свой голас, голас Паэта, за тых у Беларусі, хто марыць аб лепшым жыцці, хто хоча больш выбару й больш свабоды. І мы хацелі б дадаць свае галасы да яго голасу. Мы звяртаемся да ўраду Беларусі й да Высокага суда вызваліць Уладзіміра Някляева, даць яму волю пісаць і ствараць. Яму ёсць чым папоўніць скарбніцу беларускай культуры». Заяву, сярод іншых, падпісалі Віслава Шымборска, Эгідзіюс Александравічус, Цімаці Гартан Эш, Джэйн Хіршфільд, Конрад Лой, Хаціф Джанабі, Вытурыс Яруціс, Мадлэйн Грывэ, Юлія Хартвіг, Ежы Ільг, Тэрэса Валас, Томаш Ружыцкі, Кшыштаф Чыжэўскі, Багдан Тоша, Марэк Залескі і дзясяткі вядомых літаратараў Еўропы.

А нядаўна на адрас Саюза беларускіх пісьменнікаў з Шведскага ПЭНа прыйшло запрашэнне У. Някляеву прыняць удзел у Міжнароднай кніжнай выставе ў Гётэборгу…

**Прэс-служба СБП**

MEMORIA

# СПАЧЫЛА Ў ВЕЧНАСЦІ ВАЛЯНЦІНА КОЎТУН

**30 красавіка ў Пінску на 66-м годзе жыцця памерла вядомая беларуская пісьменніца Валянціна Коўтун.**



Валянціна Коўтун (сапр. Валянціна Новік) нарадзілася 6 красавіка 1946 года ў вёсцы Дземяхі Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і настаўніка. У 1964 г. паступіла на філалагічны факультэт Львоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта, а з 4 курса перавялася ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (скончыла ў 1969-м).

Працавала настаўніцай мовы і літаратуры Варнянскай сярэдняй школы Астравецкага раёна (1969–1970), літкансультантам «Сельскай газеты» (1970–1976). З 1976 г. — літсупрацоўнік, з 1979 г. — рэдактар аддзела крытыкі і літаратуразнаўства часопіса «Полымя», з 1982 г. — загадчык рэдакцыі літаратуры для юнацтва выдавецтва «Юнацтва», з 1990 г. — старшы рэдактар аддзела прозы часопіса «Полымя». У 1977–1980 гг. вучылася ў аспірантуры пры Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклора АН БССР. Кандыдат філалагічных навук. Сябра СП СССР з 1976 г.

У друку выступала з 1966 года.

Валянціна Коўтун — аўтарка паэтычных зборнікаў для дзяцей «Мы робім казку» (1983), «Вясёлы заасад» (1986), кнігі апавяданняў «Калінавая гронка залатая» (1988), рамана-жыцця «Пакліка624ныя» (2002, часопіс «Полымя»), прысвечанага Эўфрасінні Полацкай. Выступала як крытык, літаратуразнаўца і перакладчыца з расійскай, украінскай і іншых моў. Аўтарка артыкулаў пра фальклор у сучаснай беларускай паэзіі. Выйшлі кнігі «Святло народнага слова: Паэтычны лад беларускай народнай песні» (1984), «Крыніца паэзіі: На шляхах эпізацыі» (1987).

Адна з важных тэмаў творчасці — асэнсаванне асобы беларускай паэткі Цёткі (А.Пашкевіч), якой прысвечаныя паэмы «На зломе маланкі» (1979), «Суд Алаізы» (1985), раман-дылогія «Крыж міласэрнасці» (1988–1996). Лаўрэат Літаратурнай прэміі СП БССР імя А.Куляшова (1986) за кнігу паэзіі «Метраном».

У апошнія гады актыўна займалася тэмай сталінскіх рэпрэсій і пісала «лагерныя» вершы пад псеўданімам Леся Беларуска.

Вечная Вам памяць, Валянціна Міхайлаўна!

ЮБІЛЕЙ

# СТАГОДДЗЕ ВАСІЛЯ ВІТКІ

**16 траўня споўнілася 100 гадоў з дня нараджэння выбітнага беларускага паэта, драматурга і перакладчыка Васіля Віткі.**



Нарадзіўся Васіль Вітка (сапр. Цімох Крысько) ў вёсцы Еўлічы Слуцкага раёна Мінскай вобласці. Удзельнічаў у паходзе Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь і да самага пачатку вайны працаваў сакратаром Беластоцкага абласнога аддзялення СП БССР. З пачатку Вялікай Айчыннай вайны — у рэдакцыі газеты «Савецкая Беларусь». З дня ўтварэння часопіса «Беларусь» (студзень 1944) працаваў яго адказным сакратаром, з 1948-га — намеснікам, затым — галоўным рэдактарам газеты «Літаратура і мастацтва». У 1957–1974 гадах — галоўны рэдактар часопіса «Вясёлка».

Друкавацца пачаў у 1928 годзе. Першы зборнік вершаў «Гартаванне» быў выдадзены ў 1944 годзе ў Маскве. Пасля выходзілі ў свет зборнікі «Поўдзень» (1946), «Вернасць» (1953), «Ружа і штык» (1958), «Паверка» (1961), «Вершы» (1968), «Беларуская калыханка» (1971), «Праводзіны лета» (1972), «Вышэйшы святла» (1977), «Случчына» (1981), «Трэція пеўні» (1988), зборнік сатыры і гумару «Для дома, для альбома і трохі для эпохі» (1983). Для дзяцей выдаў кніжкі паэзіі і вершаваных казак «Вавёрчына гора» (1948), «Буслінае лета» (1958), «Казка пра цара Зубра» (1960), «Дударык» (1964), «Азбука Васі Вясёлкіна» (1965), «Казкі» (1968, 1976), «Чытанка-маляванка» (1971), «Хто памагае сонцу» (1975), «Ладачкі-ладкі» (1977), «Мы будуем метро» (1979), «Мінскія балады» (1982), «Казкі і краскі», «Госці», «Загадка пра зярнятка» (усе 1984), «Дзецям» (выбраныя творы ў дзвюх кнігах, 1986), «Свята дружбы» (1987), зборнік апавяданняў «Зайчык-вадалаз» (1962). Выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах.

Напісаў шмат літаратурна-крытычных і публіцыстычных артыкулаў на маральна-этычныя і выхаваўчыя тэмы.

На беларускую мову пераклаў паэму У. Маякоўскага «Добра!» (1940, з Р. Лыньковым), «Паны Галаўлёвы» М. Салтыкова-Шчадрына (1956), кнігу В. Сухамлінскага «Блакітныя жураўлі» (1971), творы расійскіх, украінскіх, латышскіх, балгарскіх і польскіх пісьменнікаў.

У 1978 годзе Васіль Вітка быў узнагароджаны Міжнародным ганаровым дыпломам імя Х. К. Андэрсена з занясеннем прозвішча пісьменніка ў ганаровы спіс вялікага дацкага казачніка. За кнігі «Беларуская калыханка» (1971), «Казкі» (1968), «Чытанка-маляванка» (1971) паэту ў 1972 годзе прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР. Заслужаны дзеяч культуры БССР (1970).

5 ліпеня 1996 года зямное жыццё Васіля Віткі скончылася. Большасць ягоных твораў запатрабаваная і сёння, як, да прыкладу, наступныя радкі яго верша-сімвала:

*Мы на Случы ўсе — сакуны,*
*Завомса сакунамі.*
*Спрадвеку хлеб наш сакаўны*
*І мова сакаўная…*

**Прэс-служба СБП**

ЮБІЛЕЙ

# ДОКТАР БЕЛАРУСКАСЦІ

**Яму споўнілася б 80… Мог бы яшчэ і дажыць. І парадавацца, і пасумаваць. І дапісаць тое, што думалася, не давала супакою, трывожыла, натхняла.**

Але яго ўжо некалькі гадоў няма — у беларускай перыёдыцы, у выдавецкіх планах, у студэнцкіх аўдыторыях. Нястомнага клапатуна, сардэчнага дарадцы і сябра, праўдзейнага доктара беларускасці і непаўторнага філфакаўскага дэкана…

А яны, дэканы ўніверсітэцкага філфаку, былі розныя. І такія, што свае ўступныя лекцыі пачыналі з успамінаў пра аспіранцкае жыццё, падчас якога прачытваўся Поўны збор твораў Леніна. А быў і такі, які свае ўступныя лекцыі пачынаў з іншага прызнання: у свае аспіранцкія гады прачытаў Збор старабеларускіх летапісаў.

Гэты чалавек — Алег Антонавіч Лойка — прыйшоў у свет у першы дзень мая-траўня 1931 года. Скончыўшы ў родным Слоніме агульнаадукацыйную польскую школу, вучыўся затым у школе расейскай, а на сталічны філфак быў прыняты толькі кандыдатам у студэнты — бо меў ускосныя сувязі з Саюзам беларускай моладзі. Хоць ці не «страшнейшым грахом» яго перад савецкай уладай была юнацкая публікацыя ў акупацыйнай «Баранавіцкай газэце»…

Але ён стаў кандыдатам у беларускасць, чаму сведчанне — пасляховая вучоба, першыя вершы і студэнцкія публікацыі. А вось доктар беларускасці нараджаўся ў ім падчас згаданага вышэй аспіранцкага жыцця. Мацнеў-сталеў — у тысячах лекцый на працягу амаль паўдзесяцігадовай філфакаўскай працы. Гэтае сталенне выявілася ў тысячы навуковых артыкулаў, у паўсотні кніг паэзіі і прозы, у даследніцкім летапісе гісторыі беларускай літаратуры — ад старажытнасці да дня сучаснага, у раманах-эсэ пра найвыдатнейшых сыноў нашай зямлі Францыска Скарыну і Янку Купалу. Гэтае сталенне адзначалася званнямі дацэнта (1962) і прафесара (1971), члена-карэспандэнта НАН Беларусі (1989), ступенямі кандыдата (1956) і доктара (1969) філалагічных навук, узнагародамі (ордэнам Дружбы народаў і медалямі), лаўрэацтвам: Дзяржаўнай прэміяй Беларусі (1990) і Прэміяй імя У. Пічэты (2003).

Званне ж доктара беларускасці — і найбольш пашанотнае з усіх пералічаных, і найбольш клопатнае, бо Алег Лойка, сын таленавітага слонімскага фельчара, шчыра і нястомна лячыў-лекаваў нашую беларускую памяць, нашую крывіцкадрыгавіцкую волю, наш еўрапейскі інтэлект, наш ліцвінскі дух. Ягоныя лекі — паэтычныя, песенныя, літаратуразнаўчыя, эсэістычныя, публіцыстычныя, перакладніцкія, настаўніцкія — увабралі мудрасць, мужнасць і вопыт сотняў пакаленняў і яшчэ сотням новых пакаленняў беларусаў будуць мацаваць нацыянальнае здароўе.

Як некалі рабілі гэта маладому аспіранту згаданыя напачатку летапісы….

**Алесь Пашкевіч**



# ПРАЎДАЮ СВЕТ ПРЫГОЖЫЦЦА

**Алег ЛОЙКА**

## Мая Сцяна Плачу

*Не трэба ехаць у Ерусалім:*
*Мая Сцяна Плачу тут, у Беларусі, —*
*Эканомлю на білеце.*
*Ды й навошта мне замежныя сцены плачу,*
*Калі слёз у мяне ўжо няма,*
*Калі слёзы, здаецца, усе выплакаў.*
*А ўвогуле аддаў бы ўсе свае грошы,*
*Каб да Сцянаў Плачу не даязджаць.*

## Баторы

*Блізкім некаторым*
*Ён казаў нібыта:*
*«Каб ня быў Баторым,*
*быў бы езуітам».*
*Белай, мне здаецца,*
*Ніткай тое шыта*
*Тут, дзе Нёман льецца,*
*І — не езуітам.*
*Замак з касагору*
*Шэпча мне тут штодня:*
*«Каб ня быў Баторым,*
*быў бы ён Гародняй...»*
*Верыць таму шэпту?*
*Смерць туманам крыта:*
*Можа свая лепта*
*Ў ім ад езуіта?.*

## Оперны

*О, Оперны — ты Вялікі*
*У лёсе маім таксама:*
*Памятаю, як клікаў*
*Наведаць галёрку маму.*
*Трымцеў, як у лесе асіна,*
*У кармазінавым сутарэнні:*
*Маці ж слухала сына*
*З нясхаваным захапленнем.*
*А магло б і не быць даравана*
*Лёсам жаданых змен,*
*Калі б цыганскім сапрана*
*Не скрала душу Кармэн...*

***

*Пад гэтым небам,*
*Пад гэтым сонцам —*
*Не толькі глеба,*
*Не толькі стронцый...*

*Пад гэтым небам*
*Мая надзея*
*Штодня ўзыходзіць,*
*Штодня ірдзее.*
*Не дабрадзей я,*
*А лустай хлеба*
*Дзялюся дзеля —*
*Жыцця і неба!*

## А чаму б і не...

***— Мо прыедзеце да мяне?..***
***— А чаму б і не...***

*А чаму б і не:*
*Дарога, як струна,*
*У тумане — не ў мане —*
*Беларуская старана...*
*А чаму б і не:*
*Хіляцца ў паясы*
*Пушчы і каласы*
*Таму, хто іх не міне...*
*А чаму б і не:*
*Верас адхон ахіне,*
*І прывітае здалёк*
*Радасны васілёк.*
*Нёман перабяжыць*
*Вёрткай ваверкай Уша,*
*І небасхіл задрыжыць,*
*Нібы мая душа.*
*Над Шчараю упадзе*
*І ціха душу прыхіне,*
*Як аніхто, анідзе —*
*Тваё «А чаму б і не...»*

***

*Закаханыя ж вёслы былі,*
*Свае рэкі былі і азёры, —*
*Разышліся, нібы караблі,*
*Скрухі поўныя, жалю і гора.*

*Караблі ж тыя, д'ябал дзяры,*
*Пад любою, відаць, арбітай*
*Разыходзяцца не па дабры,*
*А сыходзяцца бортам бітым.*
*Маладое б у рукі вясло,*
*Юнгі голас у спеў паэмны,*
*Ды нічога нібы не было:*
*Разбіткі адплываюць нема.*

## Душа мая

*Душа мая — дуга вясёлкі,*
*Не запрагаць кагось — дуга.*
*Пад ёю, хоць збірай іголкі,*
*Ці радасць побач, ці туга.*
*І цяжка мне з маёй душою,*
*што ўпарціцца не быць ляўшою,*
*а правіцай, каб праваруч*
*ля ўсіх быць безданяў і круч.*

***

*Туман мяне не затуманіць,*
*Імжа — не заімжыць,*
*Бо не з тых я, хто маніць —*
*Калі страх набяжыць.*
*Тым жыццём, што пражыў я,*
*Сведчу, покуль не знік:*
*Праўдзе адной служыў я —*
*Вечны яе даўжнік.*
*Праўдаю свет прыгожыцца,*
*Праўды нідзе не згубі:*
*Жыццё толькі ёю доўжыцца,*
*Карэнні яе ў глыбі...*

***

***Нілу Гілевічу***

*«А я лягу, прылягу...»*
*Вось і я, брат, прылёг*
*У апошнюю смагу*
*Развітальных дарог.*
*Усміхніся ж, мой гаю,*
*Не сумуй, родны мох.*
*Я навек прылягаю,*
*Край злюбіўшы, як мог.*

ПАЗІЦЫЯ

# З ПАГАРДАЙ ДА ІНШАДУМСТВА

*Станіслаў ДУБЯНЕЦКІ,*
*кандыдат філасофскіх навук*



**Калі на самым пачатку 1990-х гадоў над шматпакутнай Беларуссю нарэшце «засвяціла» доўгачаканая зорка незалежнасці, мы, абсалютна непадрыхтаваныя да такога павароту ў нашым гістарычным лёсе, не змаглі знайсці тое рацыянальнае зерне, з якога развіўся б плод сапраўднай палітычнай і эканамічнай суверэннасці беларускай нацыі, яе духоўнага разняволення і культурнага ўздыму.**

Палітычная сістэма, якая была ўсталявана ў Беларусі пасля першых прэзідэнцкіх выбараў 1994 г., не змагла б доўга праіснаваць, калі б яна не абапіралася на феномен т.зв. «масавага чалавека», які не здольны ўсвядоміць сваю людскую адметнасць, а адчувае сябе такім, «як і ўсе», які не разумее, што могуць быць людзі з іншым мысленнем, з іншым поглядам на навакольную рэчаіснасць. Такі збяднелы душой чалавек заўсёды прытрымліваецца аднаго жыццёвага прынцыпу: «Хто не такі, як я, хто думае не так, як я, той мой вораг», ён прызнае толькі «ўладу сілы», «моцнага кулака». Людзі з падобнай псіхалогіяй раба і плябея ёсць сярод усіх сацыяльных пластоў грамадства, у тым ліку сярод кіраўнічых кадраў.

Як ні горка гэта ўсведамляць, але добрым пажыўным асяроддзем для рэалізацыі такой наступальнай лініі ў адносінах да іншадумцаў стала частка т.зв. «інтэлігенцыі», якой авалодала пачуццё страху, боязі страціць міласціва выдзеленыя ёй уладай крыхі ад агульнага «пірага» і якая забыла, што ідэалам сапраўднай інтэлігенцыі заўсёды было служэнне народу і ўнутранае права крытыкаваць любыя дзеянні палітычнай улады, валодаючы ўладай іншай — над розумам людзей.

Сведчаннем такога непрадказальнага развіцця падзей у Беларусі стала фактычнае разбурэнне прававых асноў ва ўзаемаадносінах дзяржавы, грамадства і асобы, арышты і судовыя расправы над нязгоднымі, звальненні з працы і вучобы за выказванне самастойных ідэй і думак, беспакаранасць любых дзеянняў, накіраваных супраць тых, хто хоць у нечым адрозніваецца ад архетыпу ўладатрымальнікаў і таго ж «масавага чалавека».

Непрыхільныя адносіны да вальнадумства сталі характэрнай прыкметай амаль усіх афіцыйных грамадска-палітычных кампаній і мерапрыемстваў. За прайшоўшыя гады былі ліквідаваны некаторыя няўрадавыя дэмакратычныя арганізацыі, вядомыя адукацыйныя ўстановы, праваабарончыя арганізацыі і аналітычныя цэнтры, забаронена дзейнасць незарэгістраваных аб'яднанняў, спынены выпуск шэрагу незалежных выданняў («Пагоня», «Салідарнасць», «Свабода» і інш.).

Фактычнае непрызнанне ўладамі гарантаваных Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь правоў т.зв. меншасці на выказванне альтэрнатыўнай думкі, ігнараванне, а то і жорсткае падаўленне адкрытых спробаў яе выказвання прыніжае чалавечую годнасць, ставіць людзей перад складаным маральным выбарам паміж дэклараванай свабодай і пастаянным пошукам шляхоў пераадолення чыноўніцкага супраціўлення яе рэалізацыі.

Перад такой дылемай стаяць не толькі члены апазіцыйных (нават зарэгістраваных) палітычных партый і аб'яднанняў, але і шмат хто з тых людзей, што проста маюць сваю незалежную думку. Гэта прадпрымальнікі, маладзёжныя актывісты, вернікі з непрызнаных дзяржавай рэлігійных аб'яднанняў і арганізацый нацыянальных меншасцей, незалежныя журналісты, дэмакратычна і нацыянальна арыентаваныя прадстаўнікі навуковай і творчай інтэлігенцыі.

Пра тое, як беларускім літаратарам нялёгка было працаваць і выдаваць свае творы ва ўмовах адсутнасці свабоды творчай думкі і ганьбавання роднай мовы, расказаў Васіль Быкаў у сваёй кнізе ўспамінаў «Доўгая дарога дадому» (2002). «У мірны час, — пісаў ён, — літаратарам не стралялі ў патыліцу. Затое шырока практыкавалася забойства іх твораў. Творы не друкавалі, за імі палявалі, рукапісы перахоплівалі на пошце, тайна аддавалі ў карныя органы, якія выносілі свае прысуды — і творам, і аўтарам. І рабілі тое не акупанты, не людзі іншай нацыі ці рэлігіі, а свае — калегі, таварышы, нават сябры». Сам В.Быкаў доўгі час жыў і працаваў у атмасферы арганізаванай траўлі, непрыныццяя рэгламентаванай крытыкай т. зв. «акопнай праўды», што стала сімвалам яго рэалістычнай, бясстрашна праўдзівай творчасці.

Беларускія пісьменнікі неаднаразова выступалі ў абарону В.Быкава, супраць яго цкавання і злобнай лаянкі ў электронных і друкаваных сродках масавай інфармацыі. Так, у студзені 2000 г. Рада Саюза беларускіх пісьменнікаў асудзіла выпады дзяржаўнага тэлебачання супраць В.Быкава, выказала сваё негатыўнае стаўленне да той хлусні, якой быў абліты з тэлеэкрану выдатны пісьменнік ды нязломны грамадзянін. Аўтарам і высокім заказчыкам абразлівай крытыкі Генадзь Бураўкін парэкамендаваў лепш прыслухацца да разумнага чалавека, якому баліць усё, што робіцца ў Беларусі, а не слухаць наезных палітычных палкоўнікаў, якім нішто беларускае не толькі не баліць, а якім нічога беларускага не патрэбна, а можа, нават і ненавісна.

А ў красавіку таго ж года, пасля выхаду на Беларускім тэлебачанні паклёпніцкай праграмы «Тайные пружины политики», 18 членаў Саюза беларускіх пісьменнікаў, даўніх сяброў і паплечнікаў В.Быкава, выступілі з адмысловай заявай, у якой патрабавалі ад уладаў Беларусі спыніць ганебнае шальмаванне ў дзяржаўных СМІ гэтага вядомага ва ўсім свеце пісьменніка, змагара з фашызмам, ветэрана-франтавіка, чалавека, які ўсё сваё жыццё намагаўся паказваць у сваіх творах праўду, хоць і горкую. Дарэчы, ініцыятар заявы Алесь Пашкевіч сутыкнуўся тады з нежаданнем многіх літаратараў падпісваць ліст, і перш за ўсё тых, хто меў дзяржаўную пасаду ці разлічваў нешта атрымаць ад уладаў на чарговым пісьменніцкім з'ездзе.

На жаль, і сёння афіцыйная прапаганда адносіць да няўгодных, «няправільных» многіх таленавітых творцаў (не толькі з ліку літаратараў), уключаючы іх у нейкія «чорныя спісы», забараняючы публікацыю іх кніг, арганізацыю публічных мастацкіх выстаў, канцэртаў і інш. І ў рэалізацыі гэтай забаронна-абмежавальнай практыкі чыноўнікі таксама шырока карыстаюцца паслугамі былых таварышаў па пісьменніцкім цэху, а сёння актыўных членаў праўладнага Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Глыбокую занепакоенасць грамадзянскай супольнасці выклікае ўзмацненне наступу на незалежную журналістыку і настойлівыя спробы абмежавання доступу грамадзян да поўнай, дакладнай і аб'ектыўнай інфармацыі. Аб гэтым яскрава сведчаць адміністрацыйны ўціск і эканамічная дыскрымінацыя, неабгрунтаваныя папярэджанні рэдакцый, запалохванні і праслед вядомых журналістаў, пагрозы закрыцця недзяржаўных перыядычных выданняў і радыёстанцый, блакаванне інтэрнэт-сайтаў і інш.

Не абмінуў беларускіх літаратараў і незайздросны лёс многіх удзельнікаў мінулай прэзідэнцкай кампаніі і той шматтысячнай мірнай акцыі грамадзян, якая адбылася ў ноч з 19 на 20 снежня 2010 г. У сувязі з гэтым мне ўзгадваюцца разважанні Рыгора Барадуліна аб поўным драматызме жыццёвым шляху паэта Уладзіміра Дубоўкі, які ў сталінскіх лагерах, турмах і ссылках «адгрукаў» ад званка да званка каля 28 гадоў свайго жыцця. «Трэба аддаць належнае нюху чэкістаў, — пісаў Р.Барадулін, — ведалі, дзе сапраўдны талент, дзе патэнцыйны геній нацыі, — вынішчалі самых лепшых, драбяза трапляла ў чорны нерат ленінска-сталінскіх апрычнікаў па інерцыі, для валу, для масавасці».

Як аказалася, нядрэнным «нюхам» валодаюць і сучасныя беларускія чэкісты і спецназаўцы. Узяць хаця б праведзеную імі спецаперацыю па «нейтралізацыі» аднаго з кандыдатаў у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь Уладзіміра Някляева. Мне здаецца, што калі не непасрэдныя выканаўцы гэтага зладзейскага нападу, дык іх натхняльнікі добра ведалі, хто такі У.Някляеў.

Той жа Рыгор Барадулін у сваёй прадмове да выбраных твораў У.Някляева, выдадзеных у 2010 г., называе яго адным з самых непаўторных і геніяльных творцаў на мяжы стагоддзяў, Паэтам з вялікай літары, які ўзняў на еўрапейскі ўзровень беларускую паэзію і прозу, які ўражвае сваёй дасведчанасцю, абсягам сваіх інтарэсаў, даляглядnасцю мыслення.

Не паддаецца здароваму сэнсу спроба сілавых структур і штатных ідэолагаў падагнаць мірны пратэст грамадзян супраць вынікаў прэзідэнцкіх выбараў пад «справу аб дзяржаўным перавароце». Але ж гэта і не дзіўна. Версіі аб нейкіх патаемных змовах і імкненні да гвалтоўнага захопу ўлады, падрыхтоўцы за межамі Беларусі баявікоў і завозе зброі ў рэспубліку сталі пастаянным спадарожнікам усіх важнейшых палітычных кампаній і адным са сродкаў падрыхтоўкі грамадскай думкі да асуджэння палітычных апанентаў улады.

Тым часам яшчэ ў 1995 г. Васіль Быкаў падкрэсліваў, што калі дэмакратыя змушана карыстацца толькі дэмакратычнымі метадамі, дык іхнія супернікі заўсёды вольныя ў выбары сродкаў — ад раз'юшанай хлуслівай прапаганды да хітрасцей спецслужб, і што ў гэтай справе «ў іх ёсць вельмі разумныя памагатыя з ліку інтэлігенцыі, якія давядуць, што Народны фронт звязаны з ЦРУ, а ўсе нязгодныя з новай палітыкай — шпіёны-шкоднікі, гестапаўцы, здраднікі, калабаранты перыяду мінулай вайны і да т.п.», і што будуць здымаць фільмы накшталт Азаронкавага — з даволі вольным мантажом, але вельмі пэўнай ідэяй.

Прама-такі ў яблычак патрапіў наш класік-прарок, паколькі сёння мы маем і «ворагаў народа», і «пятую калону», і «местачковых прадажных палітыкаў і журналістаў», і «польскія і германскія спецслужбы», і, што вельмі сімвалічна, ананімны тэндэнцыйны фільм «Плошча. Железом по стеклу»!

Прычына ўсіх гэтых «анамалій» у тым, што ва ўзаемаадносінах улады з той часткай грамадства, якая думае і адчувае інакш, ёсць толькі адзін довад і адзіная дактрына — забароны, абмежаванні, татальны кантроль. Можа, менавіта пагэтаму аказаліся безвыніковымі неаднаразовыя спробы арганізацыі дыялогу паміж уладамі і прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасці. Таму, на маю думку, дасягнуць гармоніі ў гэтых узаемаадносінах можна толькі на аснове прызнання дзяржавай таго факта, што палітычны плюралізм, свобода поглядаў і перакананняў, вырашэнне ключавых пытанняў грамадскага жыцця большасцю галасоў пры ўважлівым уліку пазіцыі меншасці з'яўляюцца аб'ектыўнай умовай і адным з важнейшых фактараў эфектыўнага функцыянавання дзяржаўнага механізму і ўсяго грамадства ў цэлым.

АПАВЯДАННЕ

# ЗАБІ ГЭТА!

Уладзімір САДОЎСКІ

— Забі! Забі! Забі! — крычалі трыбуны. Гледачы заўзята надрывалі глоткі. У неба ўздымаліся сціснутыя кулакі і кавалкі ежы. Тысячы вачэй утаропіліся ў цэнтр арэны. Дзве постаці сярод скрываўленага пяску — гладыятар і зрынутая ім пачвара — прымушалі галосіць з усяе моцы вольны народ Рыма.

— Забі-забі-забі! — словы зліваліся ў бязлітасны рык.

Ксенас стаяў моўчкі. Паветра з хрыпам выходзіла з грудзей. Ныла запясце правай рукі. Даспехі і меч цягнулі да зямлі. Гладыятар падняў позірк да імператарскай ложы. Імператар кіўнуў і выцягнуў руку з накіраваным долу вялікім пальцам. Трыбуны зараўлі.

Упершыню пра жудасную пачвару з ускрайкаў імперыі Ксенас пачуў тры месяцы таму. Скочыліся памінальныя гульні ў гонар першага легата імператарскага легіёна — стары ваяка заслужыў пышныя хаўтуры. Ксенас сядзеў у лазні. Загойваў стомленае цела, прыслухоўваўся да размоваў іншых наведвальнікаў. Нездалёк два чыноўнікі з муніпалітэту, што займаліся наладжваннем гульняў, абмяркоўвалі нядаўнія плёткі. Размова ішла пра дзіўную істоту, якую выкарыстоўвалі ў якасці гладыятара ці то ў Палестыне, ці то ў Тунісе. Ксенас шмат з той размовы прапусціў міма вушэй, але запомніў, што тую істоту знайшло нейкае племя ў пустэльні, на месцы меркаванага падзення зоркі. Гладыятар пакінуў лазню раней за чыноўнікаў, таму не пачуў, чым скончылася тая гутарка.

Праз два месяцы Ксенас пабачыў пачвару на ўласныя вочы. «Сын багіні Тэлус у Рыме!», «Мінатаўр з Крыту на арэне Калізея!», ці проста «Пачвара з Палестыны» — як толькі не называлі вяшчальнікі незвычайнага гладыятара. Прыбыццё дзіўнай істоты ў горад, здавалася, прыцягнула ўвагу амаль усіх жыхароў Рыма. Ксенасу ледзьве не з боем давялося прадзірацца скрозь натоўп, каб патрапіць на месца, дзе праходзіла працэсія. Масіўная клетка, якую цягнулі чатыры дужых конікі. Суправаджэнне з дзясятка ўсходніх вершнікаў і цэлай кагорты легіянераў. Калона накіроўвалася да імператараскага звярынцу.

Ксенас стаяў ля збочыны. Легіянеры з картэжу рассоўвалі натоўп шчытамі, каб вызваліць дарогу для воза з клеткай. Адзін з іх падскочыў да гладыятара, каб адсунуць і яго. Але раптам натыкнуўся на суровы позірк Ксенаса і адступіў. Магутная постаць гладыятара заўжды выклікала павагу. Ксенас застаўся на сваім месцы.

Клетка набліжалася. Скрозь шчыльна пасаджаныя пруты можна было разгледзець сілуэт істоты. Чорнае масіўнае цела. Выцягнутае грудкаватае тулава. Пляскатая галава. Кароткія, падобныя да слупоў, ногі. І чатыры рукі. Ксенас назіраў, як пачвара павольна перамяшчалася з аднаго боку клеткі да другога. Вачэй істоты гладыятар тады так і не пабачыў.

Ксенас яшчэ раз глыбака ўздыхнуў. Выцер далонямі з ілба пот, змяшаны з крывёй. Моцна сціснуў ручку мяча і рушыў да зрынутага ворага. Чорная туша грувасцілася на пяску пасярод арэны. З парэзаў на баку і з абцінка на месцы адной з чатырох рук сцякала на пясок барвовая густая слізь. Пласціны панцыра, якім была пакрыта спіна і грудзі, ледзь заўважна уздымаліся. Пачвара яшчэ дыхала. Ксенас падышоў да тушы ўшчыльную.

— Забі! Забі! Забі! — шалелі трыбуны.

Гладыятар адкінуў шчыт, узяў меч у дзве рукі і ўзняў над галавой. Ён цэліў у месца, дзе тулава пераходзіла ў галаву — шыі ў пачвары проста не было. Твар істоты быў пакрыты лускавінкамі. З-пад нароста, які можна было б назваць брывёй, наўпрост на Ксенаса ўтаропіліся вока. Гладыятар перахапіў гэты позірк і не зводзіў вачэй убок. Ён цудоўна разумеў, што хоча паведаміць яму пераможаная пачвара.

Рукі з мячом няўмольна апускаліся. Трыбуны няспынна раўлі. Істота не рухалася.

Позірк пачвары. Ксенас упершыню сутыкнуўся з ім незадоўга да гульняў, прымеркаваных да дня летняга сонцастаяння.

Гэта павінны былі быць гульні, якіх яшчэ не бачыла Імперыя. Лепшыя байцы. Дзікія звяры. Рэканструкцыі знакамітых бітваў гісторыі. І — канешне— бой з Параджэннем Багоў, Крыцкім Быком, дзіўнай істотай з ускрайку Імперыі.

Да таго часу горад ужо поўніўся байкамі пра неверагодную моцу Палестынскай Пачвары. Казалі, што цягам адной бойкі істота перамагла дзесяць прафесійных гладыятараў. Казалі, звер разарваў Чорнага Тытана — непераможнага нубійскага ваяра. Казалі, пачвара гуляючы расправілася з усімі драпежнікамі Іерусалімскага звярынцу. Шмат чаго казалі.

Ксенас прымаў да ўвагі ўсё. Але не ўсяму даваў веры. У гладыятара былі свае крыніцы ведаў. Лар Мастарна — гаспадар Ксенаса — меў шчыльныя сувязі з чыноўнікамі муніпалітэту. За тыдзень да гульняў Лар выклікаў гладыятара да сябе.

— Ты лепшы, — казаў Мастарна, — я ведаю, ты пераможаш усіх людзей. Але ў цябе будзе і іншы супернік. Як мне паведамілі — пераможца гульняў будзе змагацца з Палестынцам. Я хачу, каб ты быў падрыхтаваны. Увечары пабачыш, што з сябе ўяўляе гэтая пачвара. Мой сябар правядзе цябе ў імператарскі звярынец. А цяпер ідзі. Рыхтуйся. І ўдачы табе.

Дзённая трэніроўка была цяжкай. Байцы адпачывалі ў цені ўнутранага дворыка гладыятарскага дома. Нехта расказваў апошнія навіны, хтосьці травіў байкі, большасць моўчкі слухала.

— Ведаеце што? Бык задыхаецца, — прамовіў адзін гладыятар



амаль шэптам. — Гэты палестынскі бык задыхаецца. Я чуў ад аднаго знаёмца — ён бачыў пачвару на арэне. Палестынец слабее цягам бою. Спачатку ён вельмі моцны. Рве направа і налева. Але чым даўжэй цягнецца бойка, тым больш слабым ён становіцца. Паветра для яго — атрута. Знаёмы мяркуе, што на нябёсах, адкуль, як кажуць, прыляцеў Палестынец, паветра іншае, чысцейшае. А нашае прыземнае для Палестынца занадта бруднае. Ён не можа яго вельмі часта ўдыхаць. Але калі б'ешся, даводзіцца часцей дыхаць, вось Палестынец і загінаецца.

Ксенас слухаў гладыятара вельмі ўважліва. Яшчэ адна байка пра Палестынскую Пачвару. Але цяпер, калі ён ведаў, што пачвара стане яго супернікам на арэне, любыя звесткі пра яе слабасці былі карысныя для Ксенаса.

Увечары ў дзверы пакоя, у якім ночыў гладыятар, пагрукалі. Госць прадставіўся пасланцам ад Лара Мастарны. Сказаў, што гаспадар загадаў, каб Ксенас ішоў разам з ім. Гладыятар пярэчыць не стаў.

У імператарскі звярынец яны ўвайшлі праз ход, які выкарыстоўваўся для падвозу ежы. Правaжатыі гладыятар прыладзіліся за возам, поўным гароднiны, і такім чынам прайшлі ў цэнтр звярынцу. Пасланец працягнуў руку:

— Табе туды. Толькі хутка: у нас мала часу. Чакаю тут.

Ксенас кіўнуў і накіраваўся ў праход паміж клеткамі, на які паказваў праважаты. Было цёмна. Толькі пара паходняў свяціліся на сцяне за шэрагам клетак. Застаялы жывёльны пах рэзаў ноздры. У клетках увесь час нешта рухалася, шамацела. З паўцемры даносіліся енкі, скавытанне і рыкат.

Праход вывеў гладыятара да чыстай, прыбранай пляцоўкі, пасярод якой высілася масіўная клетка. Тая самая, якую везлі праз горад. Ксенас стаў на ўскрайку пляцоўкі і не рашаўся падысці бліжэй. Гладыятар фізічна адчуваў, як ад клеткі разліваецца па паветры пах нянавісці, болю і смерці. Ён не адчуў яго раней, у спякотным паветры гарадскіх вуліцаў. Цяпер гэты пах пужаў Ксенаса. Знаходзіцца ў такой блізкасці ад пачвары яму было непрыемна.

Істота ў клетцы заварушылася. Палестынец адчуў прысутнасць чалавека. Ён выйшаў з ценю і ўзяўся за краты ўсімі чатырма рукамі. Скрозь шчыліну на гладыятара ўтаропіліся два невялікія чырвоныя вокі. Ксенас адчуў, як нешта ў глыбіні галавы пачало падштурхоўваць яго да клеткі. Ногі гатовыя былі самі накіраваць цела да пачвары. Ксенас стрымаў пазыў. Страпянуў галавой і самастойна падышоў бліжэй.

Вочы пачвары неадрыўна глядзелі ў вочы Ксенаса. Гладыятару здавалася, што Палестынец позіркам праціне яго наскрозь. Гэты позірк цяжка было вытрываць, але Ксенас не адводзіў вачэй. Як толькі ён стаў за некалькі крокаў ад клеткі, у галаве зноў нешта заварушылася. Перад вачыма паляцелі адна за адной карцінкі: зорнае неба, блакітны шар, агонь, пустэльня. Такім чынам Палестынец размаўляе са мной, зразумеў гладыятар.

Ксенас бачыў агромністую скрыню з бліскучага метала, што ляжала пасярод пяску. Бачыў чорнае цела пачвары, акружанае людзьмі. Бачыў клетку. Бачыў арэну. Бачыў, як Палестынец разрывае пашчу ільву. Потым выявы змяніліся незнаёмымі краявідамі. Гладыятар бачыў велічэзныя гарады, з высокімі дамамі, што ўздымаліся да самага неба. Бачыў караблі, якія плылі сярод аблокаў. Караблі, што ляцелі па чорнай прасторы. Раптам карцінкі зніклі.

— Вызвалі мяне, — гэта не былі звычайныя словы. Гэта была думка, якую пачвара наўпрост уклала ў галаву Ксенаса. Гэта была не просьба. Гэта быў загад. Гладыятару зноў міжволі захацелася падысці бліжэй да клеткі. «Вызвалі мяне, і я вярнуся туды, адкуль прыляцеў», — гучэла ў галаве Ксенаса. Гладыятар не паддаваўся. Ён адчуваў непераадольную чужасць істоты, што размаўляла з ім загадным бескампрамісным тонам. Пах смерці і нянавісці, які Ксенас адчуў раней, цяпер узмацніўся.

Гладыятар раптам зразумеў, наўпрост усвядоміў, што ўсе байкі пра Палестынскую Пачвару былі праўдай. Палестынец сапраўды перамог дзесяць прафесійных гладыятараў. І не проста перамог. Ён іх забіў. Усіх да аднаго. Забіў, а целы разарваў на кавалкі. Гэтак жа ён разрываў і драпежнікаў у Іерусаліме. Ксенас прыгадаў карцінку з ільвом, якую паказваў яму чужынец. Пачвара ненавідзела ўсё жывое. Ненавідзела сваёй чужынскай нянавісцю — і таму нішчыла.

Гэтак жа жорстка Палестынец забіраўся ў галаву гладыятара з загадамі. Але Ксенас не быў бязвольнай жывёлай, ён мог супраціўляцца.

— Не, — прамовіў гладыятар. — Ніколі. Ён глядзеў чужынцу ў вочы.

І раптам Ксенас зразумеў, чаму Палестынец павінен памерці. Чужынец прыйшоў з іншага свету. Свету, населенага такімі ж пачварамі, як і ён. Іх многа. Ксенас прыгадаў гарады да нябёсаў. Вельмі многа. Палестынец не ведае літасці. І ўвесь яго род таксама. Ён можа толькі падпарадкоўваць, а тое, што не падпарадкаванню — забіваць. Разам яны падпарадкоўваюць і забіваюць цэлыя сусветы. Калі адпусціць Палестынца, то праз пэўны час ён прывядзе сюды цэлы легіён такіх жа, як ён, бязлітасных пачвар. Яны знішчаць Імперыю, яны знішчаць людзей. Пацвярджэнне сваіх думак Ксенас бачыў у глыбіні чырвоных буркалаў чужынца. Палестынец павінен памерці.

«Тады ты памрэш», — адчуў Ксенас пагрозлівае пасланне ў сваёй галаве. Гладыятар ужо аддаляўся ад клеткі. Ён убачыў усё, што яму было трэба.

Адзінае, што засталося нявысветленым — гэта: ці сапраўды паветра з'яўляецца атрутай для пачвары? Але адказ на пытанне гладыятар знойдзе самастойна падчас бойкі. Смяротнай бойкі з Чужынцам.

— Здохні!

Магутны выкрык гладыятара на імгненне заглушыў гоман трыбун. Меч з хрустам увайшоў у цела ворага. Ксенас зрабіў яшчэ некалькі моцных удараў. Рассек панцыр і доўга варочаў мячом у вантробах пачвары. Ажно да таго моманту, пакуль іскра жыцця не пакінула яе чырвоныя вочы. Палестынец памёр.

Ксенас адкінуў меч, зрабіў пару крокаў і апусціўся на калені. Гэта быў цяжкі бой. І ён перамог. Трыбуны раўлі няспынна. Гладыятар чуў сваё імя, падхопленае тысячай галасоў. Імператар выцягнуў руку ва ўхвальным жэсце. Але Ксенас ні на што не звяртаў увагі. Ён быў далёка. Ён прыгадваў карцінкі, якія паказваў яму Палестынец: зорнае неба, блакітны шар, агонь.

Пройдуць гады, дзясяткі гадоў, але гладыятар так і не зможа спакойна ўспрымаць звесткі пра падаючыя зоркі — знічкі.

▸ ВЕРШЫ

# БЕЛАЕ МАЎЧАННЕ, ЧОРНАЯ НЕМАТА...

Валеры ДУБОЎСКІ



***

*З кожным уздыхам*
*крокам, паглядам,*
*страчаным нервам*
*урастаю ў сябе.*
*У дол, па якім крочу,*
*У воблака, у ластаўку —*
*вестаўку воблака.*
*У дзядоўнік.*
*У сям'ю.*
*У прахожых.*
*У гукі-званы*
*ўначэлай менскай ратушы,*
*у яе спрадвечныя быццам*
*замовы,*
*у старасвецкія сцені ўспамінаў.*
*Урастаю ў камяні.*
*У карані і кроны.*
*У лісце.*
*У крокі.*
*У стаянне і плынь вады.*
*У ветрань і бязветрань.*
*У маўчанне*
*задумнага маладзіка.*
*У салодкія вусны твае*
*пасля сметанковага марозіва…*
*Урастаю, каб некалі*
*быць вырваным*
*і пакладзеным.*
*Для новага ўзрастання.*

***

*Мінаю агарожы*
*То хітра, то сумленна.*
*З сябе ізноў выходжу —*
*У часе згінуць тленам.*

*Дзень з ноччу парадню,*
*Хоць час над тым рагоча.*
*А ноч дарые дню,*
*Як дзень дарые ночы.*

***

*З тых часоў,*
*З тых людзей,*
*З тых аблокаў,*
*З тых найменняў,*
*Што з намі рыфмуюцца,*
*Дух няўрымслівы*
*Вымусіў клёку*
*І слядоў*
*На замроеных вуліцах.*
*І чаканняў,*
*Нязнаных зняверцам,*
*І памкненняў —*
*Праз копшу і крушні,*
*І нязмушаных*
*Высілкаў сэрца,*
*І вызнанняў,*
*Нікім не парушаных.*

***

*А памятаеш?*
*У вар'яцтве жніўня,*
*Уначы, на пах і слых,*
*Адшукаў цябе,*
*Такі наіўны,*
*І заблукаў*
*У руках тваіх.*
*А памятаеш?*
*У чыстым верасні,*
*Як туман над Свіслаччу*
*Зусім ачах,*
*З табою побач*
*Я цябе прысніў*
*І патануў*
*У тваіх вачах.*
*А памятаеш?*
*У апошнім траўні*
*Мы гулялі —*
*Два аблокі.*
*Табе, як небу,*
*Ва ўсім патураў я.*
*І дзень быў нябёсны*
*І такі высокі.*
*А памятаеш?*
*Світанак віталі*
*Над Малкай,*
*Плешчаніцкай рачулкай.*
*Сэрцы нашыя*
*Біліся гулка…*
*А памятаеш,*
*Што будзе далей?*

***

*Купацца дзіцем*
*У дняпроўскім бродзе*
*Вярнуся,*
*Скуру скіну, як адзежыну.*
*І збыцца незбылому*
*Ды належнаму,*
*Ўсяму, што лёс зямны*
*Накарагодзіў.*
*Раку, нібы сябе,*
*Пераплываю.*
*І бераг даўнасці*
*Ва ўчора не пакінуты.*
*Цяпер з жыццём*
*Я не на «вы» — на «ты».*
*Аднекуль некуды*
*ды выведзе крывая.*
*Наноў вышэптваюць*
*Быльнёгу чараты*
*Сваю спрадвечнасць*
*Днямі і начамі...*
*Я набліжаюся*
*Да белага маўчання*
*І аддаляюся*
*Ад чорнай нематы.*

***

*Кветкай травеньскай —*
*Бзэам,бзэам*
*Да вакна твайго*
*Прытуляюся.*
*Я, спазнаўшы цябе,*
*Знаю ўсё.*
*Узнікаю.*
*Жыву.*
*Чэзну.*
*Ашаломлены сонцаваротам,*
*Закалыханы*
*Млявым месяцам.*
*За вакном мне б з табою*
*Месціцца*
*У духмянасці траўня*
*Употай.*
*І знайшоўшыся б,*
*Перахавацца.*
*Зноў згубіцца*
*І зноў знайсціся.*
*Духам быць*
*Уначэлай высі,*
*Тваёй любасці*
*Лепшым знаўцам.*

**Веснавое**

*Прасцягі перайшлі ўсе*
*Далёкія.*
*Да ісціны сваёй*
*Прыспешвалі.*
*Мы лёсу аднаго*
*З аблокамі*
*І з камянямі нашымі*
*Тутэйшымі.*
*Усё адно —*
*Тут хто каго паклікаў.*
*Тут даўніны*
*Ніхто не перайнача*
*Ад першага*
*Няўтрыманага крыку,*
*Ад першага*
*Знароўленага плачу.*
*Дабрэлі перуны*
*Па-над лясамі.*
*Ад нашых галасоў*
*Мацнела рэха.*
*І беларускі шэпт*
*Ціхоткі самы*
*Быў чутны ўсім.*
*Быў Богу на ўцеху.*

***

*Спрычыніся маёй нематы!*
*Спрычыніся і кроку, і крыку.*
*Адзінота, нібыта латынь.*
*Да яе мне ніяк не прывыкнуць.*
*Да хістання зацятых вятроў,*
*Да прыязнай маўклівай хітрэчы…*
*Ад вачэй адхрысціцца гатоў,*
*Ад якіх захварэў невылечна.*

***

*Верш.*
*Рыфмуецца*
*З вяршыняй.*

***

*Прайсці сябе*
*І прэч сыйсці ...*
*І не свяціцца больш*
*Бярозе пры дарозе?*
*Без мяне.*
*На ганку*
*Прычаканай вечнасці.*

***

*Урэшце*
*мне сэнс вядомы*
*і слоў,*
*і далёкіх дымоў.*
*Думаў —*
*дарога з дому.*
*Напраўдзе —*
*дарога дамоў.*

***

*Абсяг у высі*
*Зеўраў.*
*Купалле*
*Дух ахвоціла*
*У дні*
*Найменшай цемры,*
*Ды ў начной*
*Цямноце.*
*З гары каталі*
*Кола,*
*Вянкі жыцця*
*Сплялалі,*
*Купацца беглі*
*Голыя*
*І славілі Купалле.*
*Каб сёння,*
*Не збылое*
*Яснела небадолам,*
*Мы разамкнулі*
*Кола —*
*І стаўся час*
*Стралою.*

***

*Слухаю ноты —*
*дыханне пякельнае мроі,*
*рук*
*матыльковы узмах,*
*позірк*
*нясцерпных вачэй ...*
*Слухаю сэрца —*
*абмежаванае*
*мною*
*у бязмежжы і руху*
*прасторы…*
*Слухаю неба —*
*зямных*
*парадзіху пачуццяў*
*і Боскіх*
*таемных вестак…*

*Слухаю памяць.*
*Думы,*
*роўныя часу,*
*злучаюць сёння*
*і няўяўнае заўтра…*
*Слухаю быццам цябе.*
*А чую*
*і ноты,*
*і сэрца,*
*і неба,*
*і памяць ...*
*Выратаванне маё.*

***

*звініць струна*
*звініць струна*
*звініць струна*
*як верш*
*мая віна*
*мая віна*
*мая віна*
*найперш*

*надзея сноў*
*надзея сноў*
*надзея сноў-замоў*
*як дзеяслоў*
*як дзеяслоў*
*як дзеяслоў*
*ізноў*

*злучае нас*
*злучае нас*
*злучае ўначы*
*у гэты час*
*у гэты час*
*у гэты час*
*маўчы*

*калі мяне*
*калі мяне*
*калі мяне*
*мінеш*
*усё міне*
*усё міне*
*не знікне толькі*
*верш.*

ВЕРШЫ

# МЫ ЗА КРЭЎНАЕ

Эдуард ГРАКОВІЧ



**27 мая 1951 года спадару Эдуарду спаўняецца 60 гадоў. Ён нарадзіўся ў Мінску. Амаль сорак гадоў працаваў на Мінскім заводзе аўтаматычных ліній.**

**Аўтар вершаваных зборнікаў «Няхай гарыць свечка ў святліцы» (2006), «Залатая вербачка (2009). Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў.**

**З юбілеем!**

## Мы за крэўнае

*Вечнасць лічыць сваім кожны міг.*
*Мерна маятнік часу хістаецца,*
*Толькі ён не выказвае ўслых,*
*Як таемнае з яўным вітаецца.*

*Мудрых слоў і паданняў тамы*
*Нам, аднак, перададзены ў спадчыну.*
*Можам розумам, думкамі мы*
*Пабываць па-за межамі бачнага.*

*Мы за крэўнае цвёрда стаім,*
*Хай сабе і ў героі не выйсці нам.*
*Перакажам нашчадкам сваім,*
*Дзе часамі хавалася ісціна.*

## Ліхадзей

*Нарабіў чорных спраў ліхадзей —*
*Гнеў людскі на яго так і пеніцца.*
*Катавалі, стралялі людзей*
*Дурасліўцы з марскістаў і ленінцаў.*

*Кат-згубіцель адказу не нёс*
*Пры мундзіры, пагонах, пасведчанні,*
*А народа-гаротніка лёс*
*Прыніжаўся да лёсу авечага.*

*Смакавалі бязвінную кроў,*
*Як фашысты — Вялікай Айчыннаю...*
*І, падумайце, столькі гадоў*
*Усхвалялі сумленне партыйнае!*

## Сусвет мае мудрага творцу

*Зямля паміж іншых далёкіх планет*
*Падобна пагашанай зорцы.*
*Вялікі, дзівосны і вечны Сусвет*
*Свайго мае мудрага Творцу.*

*Што нельга жніву быць раней,*
*чым сяўбе, —*
*Усім зразумела і звыкла.*
*Мы ведаем добра: само па сабе*
*Нічога на свеце не ўзнікла.*

*Усе мы памалу адзін за адным*
*Адыдзем у прышласць навекі.*
*Сваё нас чакае ў жыцці незямным.*
*Жыццё ж на Зямлі — як праверка...*

## Незразумелая задача

*Не раз вастрыў я каменем касу,*
*Не раз трапляў касою на каменні.*
*Калі мяне даймае горкі сум,*
*Прыгадваю шчаслівыя здарэнні.*

*На пальцах можна ўсіх іх палічыць.*
*Прыносіў трапяткое тое шчасце*
*Не зорны дождж, што пырскае ўначы,*
*А прост мімалётны момант часу.*

*Але, прызнацца шчыра, дык часцей*
*Прыносіў горыч момант гэткі самы.*
*Шчымлівы боль*
*няспраўджаных надзей*
*Нярэдка пакідаў на сэрцы плямы.*

*Ці пагаджайся з гэтым, ці пярэч,*
*Жыццё — незразумелая задача.*
*Здараецца, адна і тая ж рэч*
*Удачы нам прыносіць і няўдачы.*

* * *

*Зацвілі пад майскім сонцам вішні.*
*То дажджлівы ранак, то сухі.*
*Для людзей старэецца Ўсявышні —*
*Надта не зважае на грахі.*

*Вечна нашы ўлічвае патрэбы,*
*Сцеражэ ад кайстры і турмы.*
*Праз дабро і шчодрасць, што ад Неба,*
*Робімся дабрэйшымі і мы.*

ПОСТАЦІ

# У ВІЛЬНІ І БОЛЬШ НІДЗЕ

РАЗДЗЕЛ З КНІГІ

Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК



Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК

**Жыццё Браніслава Тарашкевіча, невядомае беларусам, схаванае ў архівах, зняважанае бяспамяцтвам — жыццё незвычайнае, прыгодніцкае, шляхетнае, прыгожае, трагічнае.**

Яно цікавае рамантыкам і мянялам...

Тарашкевіч кіраваў Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамадой (БСРГ) — легальным парламенцкім клубам, пасля разгрому якога ў студзені 1927 г. на бясконцых допытах і судах даказваў следчым і суддзям, што Грамада не займалася змоўніцкай антыдзяржаўнай дзейнасцю і, галоўнае, не мела кантактаў з камуністамі.

Уяўляю, як следчыя і суддзі паблажліва ўсміхаліся, бо цудоўна ведалі пра сувязь кіраўніка БСРГ з лідарамі кампартыі Польшчы і кампартыі Заходняй Беларусі.

Кажуць, трагедыя Тарашкевіча ў тым, што звязаўся з камінтэрнаўскім рухам; кажуць гэтак, бо, пэўна, не хочуць разумець: у 1920-я гады кіраўніку масавай беларускай арганізацыі проста немагчыма было пазбегнуць стасункаў з Менскам і Масквой...

У крымінальнай справе Тарашкевіча, пачатай 31 жніўня 1932 г., а скончанай праз тры месяцы 29 лістапада, напаткаў заяву на беларускай мове:

«Да Пана Гарадзкога Старасты ў Вільні.

Паведамленьне.

Гэтым паведамляем Пана Гарадзкога Старасту ў Вільні аб тым, што на паседжаньні ініцыятыўнае групы 15 гэтага месяца ў памешканьні пры Вострабрамскай вуліцы № 27 утварыўся Беларускі Цэнтральны Сялянска-Работніцкі Выбарчы Камітэт у Вільні, старшынёй якога зьяўляецца грамадзянін Язэп Баліцкі, сэкрэтаром гр. Ўладзімір Кур'янка і скарбнікам грамадзянка Кацярына Шаблоўская.

«Беларускі Цэнтральны Сялянска-Работніцкі Выбарчы Камітэт у Вільні» месьціцца пры вуліцы Вострабрамскай у доме № 27.

Вільня, 16.09.1930 г. Старшыня Камітэту Я. Баліцкі.

Сэкрэтар Кур'янка Ўл.

Старшыня Я. Баліцкі пражывае — вул. Бэліна (?) 40 — 6 у Вільні.

Сэкрэтар Ўл. Кур'янка (пражывае) — вул. Вінгра 15 — 8 (у Вільні).

Скарбнік К. Шаблоўская (пражывае) — вул. Шкаплерная (?) 42 (у Вільні)...»

У той жа дзень, 16 верасня, паведамленне, а яно за нумарам 1, было зарэгістравана ў старостве, а вось новае, за нумарам 2, на тую ж тэму паведамленне, але ўжо на польскай мове, зарэгістраванае 11.10.1930 г.; яно сведчыць: ролі размеркаваліся інакш...

«Да Пана Гарадскога Старасты ў Вільні.

Паведамленне.

Гэтым паведамляем Пану Старасту, што 9.10.1930 года на пашыраным сходзе выбаршчыкаў быў рэарганізаваны перад гэтым заснаваны Беларускі Цэнтральны Сялянска-Работніцкі Выбарчы Камітэт на Беларускі Цэнтральны Работніцка-Сялянскі Выбарчы Камітэт «Змаганьне».

У склад Камітэта ўвайшлі: старшыня — Браніслаў Тарашкевіч, сакратар — Ян Грэцкі, скарбнік — Мікалай Верамей.

Камітэт знаходзіцца на вуліцы Вастрабрамскай № 27.

Вільня, 11 кастрычніка 1930 г.

За старшыню: Мар'яна Петкунова.

За сакратара: Вацлаў Баярчук...»

М. Петкунова — імя невядомае мне, а В. Баярчук — паводле нататак Тарашкевіча — былы вучань радашковіцкай гімназіі, выключаны з 7 класа; на той час яму было 24 гады, 4 месяцы адбыў за кратамі, 2 разы (у якасці кур'ера) ездзіў у Вішнева Маладзечанскага павета; Тарашкевіч адзначаў, што хлопец ён «...вельмі разумны...».

Прыведзеныя дакументы гавораць: у другой палове 1930 года Тарашкевіч паспрабаваў вярнуцца да легальнай палітычнай работы.

28 красавіка (прыкладна 5 месяцаў таму) яго выпусцілі з турмы, і ён, як піша Арсень Ліс у нарысе «Трагічны пошук свабоды»: «... з восені 1930 года абраны старшынёй Цэнтральнага сялянска-работніцкага выбарчага камітэта «Змаганне», уключыўся ў яго працу, даў згоду балатавацца ў дэпутаты. Аднак магчымасць дзейнасці была мізэрнай, улады «апякалі» ўзніклую структуру жорстка: спіс, пададзены выбарчай камісіяй, быў адразу анулюваны. Тарашкевічу, як і іншым вызваленым паслам, якія ўзялі ўдзел у новай выбарчай кампаніі, давялося перабрацца ў Гданьск і адтуль праз сувязных кіраваць ёю. Працавалі ва ўмовах поўнай канспірацыі...».

Аднак жа й «поўная» канспірацыя не ратуе ад турмы!

Дарэчы, турмы ў міжваеннай Польшчы былі, кажучы мовай 1970-х гадоў, ці не разлікова-гаспадарчымі прадпрыемствамі?!

Падлічваўся кожны злот.

Скажам, за 300 дзён (з 1 ліпеня 1929 г. па 26 красавіка 1930 г.), якія Тарашкевіч правёў у вязніцы Грудзёндза, на яго ўтрыманне згодна турэмнай бухгалтэрыі пайшло 450 злотых.

А вось яшчэ рахунак, падпісаны начальнікам турмы ў Каранове 11 жніўня 1933 г.: тут распісаны расходы на вязня Тарашкевіча, асуджанага 29 лістапада 1932 г. на 8 гадоў зняволення пасля вядомага арышту ў Тчэве (у дакуменце пазначаны й тэрмін сканчэння кары: 6 траўня 1939 г.).

За першыя два гады з 11.02.1931 г. па 23.02.1933 г. (744 дні) сума склала 1116 злотых.

Начальнік караноўскай турмы накіраваў рахунак у крымінальны аддзел Віленскага акруговага суда з просьбай распарадзіцца адносна пагашэння сумы.

Суд сабраўся ў складзе: старшыня — Бжазоўскі, суддзі — Сянкевіч і Занеўскі, віцэ-пракурор — Гедройц, пратакаліст — Вількавец і 21 верасня 1933 г. пастанавіў: спагнаць з асуджанага Тарашкевіча 1116 злотых.

І ўжо назаўтра дзве копіі пастановы былі высланы пракурору да выкання і асуджанаму да ведама.

І тут варта звярнуць увагу на такую акалічнасць: два тыдні таму, 7 верасня, у Коласаве адбыўся гістарычны абмен — польскага засуджанага Тарашкевіча памянялі на савецкага катаржніка Аляхновіча.

Два тыдні мінула, як Тарашкевіч ужо быў у СССР, а суд усё яшчэ разбіраўся з яго «неўпарадкаванымі» фінансамі!

Вельмі верагодна, што копію выслалі жонцы Тарашкевіча Веры Снітчанцы, яна ж з маленькім сынам Радаславам засталася ў Польшчы.

Магчыма й тое, што Веры Андрэеўне растлумачылі: 1116 злотых будуць пагашаны з тых сум, якія выяўлены ў яе мужа пры затрыманні ў Тчэве, а рэшта забіраецца ў бюджэт, бо суд не палічыў, што гэтыя грошы сумленна зароблены.

Празрысты намёк на тое, каб ніхто з сям'і аўтара «Беларускай граматыкі для школ» не прэтэндаваў на астачу камінтэрнаўскай гатоўкі...

А вось і данясенне пра затрыманне ў Тчэве.

27 лютага 1931 г. камісар паліцыі Люцыян Галчынскі далажыў у пракуратуру пры Варшаўскім акруговым судзе віцэ-пракурору па шпіёнскіх і палітычных справах: «5 лютага 1931 г. у цягніку № 118 «Гданьск — Мальборк», які прыбывае ў Тчэў у 21 г. 32 хв., падчас праверкі ў пасажыраў дакументаў кіраўнік Памежнага камісарыята дзяржаўнай паліцыі ў Тчэве падкамісар Скальскі ўстанавіў па фатаграфіі на адным з пашпартаў, што асоба, якая мае замежны чэхаславацкі пашпарт № 758 на імя Уладзіслава Паўляка (?), грамадзяніна Чэхаславакіі, — гэта збеглы ў другой палове мінулага года з Польшчы ў Гданьск былы пасол Сейма Польскай Рэспублікі Браніслаў Тарашкевіч...».

Заўважу: у далейшых данясеннях падробленае прозвішча «Паўляк» падаецца як «Паўлік»!

Працяг на стар. 8 (16) ▸

▸ ПОСТАЦІ

# У ВІЛЬНІ І БОЛЬШ НІДЗЕ

◂ Працяг.
Пачатак на стар. 7 (15).

Паводле камісара Галчынскага, у купэ (а Тарашкевіч ехаў адзін!) было знойдзена шмат літаратуры, змест якой звязваў беларускі рух з III-ім інтэрнацыяналам (Камінтэрнам); затрыманы прызнаў, што ў 1930 г. па выхадзе з турмы напісаў дэкларацыю, якую разаслаў дзеячам беларускага руху, а таксама надрукаваў яе ў «Звяздзе» і «Новым Пшэглёндзе» і ў гэтай дэкларацыі выказаў свае выразныя адносіны да польскай дзяржавы…

Сваё данясенне камісар завяршыў паведамленнем, згодна з якім 10.02.1931 г. акруговы следчы суддзя Уладзіслаў Хмеляж пастанавіў: затрыманага Тарашкевіча (Уладзіслава Паўляка), сына Адама і Алены, народжанага ў 1892 г. у Мацюлішках Віленскага павета, рыма-каталіка, жанатага, які апошнім часам жыў у Сопаце на вуліцы Швэдэнхофштрасэ 12, і які падазраецца па артыкуле 102 частка 1 крымінальнага кодэкса (пашырэнне рэвалюцыйнай прапаганды) — даставіць у варшаўскую турму, што на вуліцы Дзельная 24/26, у распараджэнне таго ж суддзі…

А яшчэ камісар Галчынскі адзначаў: Тарашкевіч у 1920 г. арыштоўваўся за камуністычную дзейнасць і ў дачыненні да яго ў Вільні вялося следства…

А яшчэ камісар пісаў пра вялікія грошы: у час арышту пры Тарашкевічу было 1792 даляры, 1790 злотых, 939 нямецкіх марак, 3 гульдэны і 59 пфенігаў.

Банкноты і манеты, вядома ж, былі ўзяты на ўлік — з кожнай (!) банкноты старанна перапісалі нумары.

Суддзя Я. Булгак вызначыў колькасць і якасць грошай, і 21 сакавіка 1931 г. склаў у Вільні на чатырох старонках пратакол агляду з такой высновай: даследаваныя прадметы маюць для судовай справы істотнае значэнне, іх трэба далучыць да справы ў якасці рэчавых доказаў…

Цікавы рукапісны тэкст Я. Булгака пачынаецца з апісання дзвюх 50-ці даляравых банкнотаў ЗША пад нумарамі О1267378 і О1027873, далей ідзе падрабязная абмалёўка марак, злотых і нямецкіх манет, а завяршаецца рукапіс апісаннем металічных галандскіх грошай — адной срэбнай паўгульдэнавай манеты, адной нікелевай пяціпфенігавай і чатырох медных аднапфенігавых манет…

У пратаколе адзначана: у Тарашкевіча знойдзена яшчэ й распіска на нейкія 10 злотых, атрыманых з дэпазіту.

Словам, была ўлічана любая драбніца…

Каб уявіць вартасць канфіскаванага багацця, нагадаю тадышнія цэны: за гадавое навучанне ў гімназіі плацілі 600–700 злотых, гектар зямлі каштаваў 500 злотых, карова — 250–300 злотых, аперацыя на апендыцыт — 150–200 злотых, конь — 100 злотых…

За адныя толькі злотыя, з якімі ў Тчэў прыехаў Тарашкевіч, можна было прыдбаць добры табун коней!



Браніслаў Тарашкевіч

Шкада грошай. Яны гінулі ў палітычным пяску, шырокай ручаінай сплывалі ў паліцэйскую касу, у бюджэт Польскай Рэспублікі

Улада, вядома, чакала паясненняў, і ён тлумачыў следчаму: такая ладная гатоўка падрыхтавана на тое, каб у Берліне заняцца выдавецкімі справамі і каб выдаць там свой пераклад «Іліяды».

Разумнае тлумачэнне.

Улада верыла і не верыла, ведаючы адно: Тарашкевіч заўсёды распараджаўся значнымі сумамі.

Вось паказанні старшага пшадоўніка следчай службы Яна Крулікоўскага, які сачыў за Тарашкевічам з 1924 года.

12 траўня 1931 г. у Вільні ўсё той жа суддзя Язэп Булгак дазнаўся ад Крулікоўскага, як ад сведкі, што, напрыклад, Мікалай Верамей атрымаў ад Тарашкевіча на выбарчыя справы 33440 злотых; актывіст ТБШ Юры Муха першы раз з «фонду» Тарашкевіча ўзяў 200 даляраў і 500 злотых, а другі раз — 13000 злотых; рэдактар варшаўскага часопіса «Рух» Уладзімір Павелкевіч займеў 3500 злотых, а за друкаванне выбарчых нумаркоў — 1100 злотых…

Шкада грошай.

Яны гінулі ў палітычным пяску, шырокай ручаінай сплывалі ў паліцэйскую касу, у бюджэт Польскай Рэспублікі.

Лепей было б, каб разумная рука накіравала іх на заснаванне беларускага ўніверсітэта, які мог бы дзейнічаць у той жа Празе ці, скажам, у Стакгольме!.

9 лютага 1931 г. старшы пшадоўнік следчай службы Уладзіслаў Грэла дапытаў Тарашкевіча ў Варшаве і склаў на 3,5 старонках запіску, з якой можна даведацца, што гульдэны, даляры і нямецкія маркі — уласнасць арыштаванага, а злотыя — узносы, прызначаныя для беларускага фонду ў Берліне.

Уласнасць Тарашкевіча (паводле яго дыпламатычнага тлумачэння!) паходзіла з наступных крыніц: 700 даляраў палітык атрымаў авансам за сваю «Беларускую граматыку для школ»; 500 даляраў — за «Сінтаксіс беларускай мовы»; 300 даляраў вярнуў інжынер з Коўні Клаўдый Дуж-Душэўскі, якому пазычыў іх яшчэ ў студэнцтве; 500 даляраў аддаў надзейны чалавек, які назаўтра па арышце лідара БСРГ (па Тарашкевіча «прыйшлі», як вядома, 14 студзеня 1927 г.) нейкім цудам паспеў забраць гэтыя грошы з яго варшаўскай кватэры № 14, што ў доме 8 на вуліцы Новасенатарскай, перад самым правядзеннем вобыску…

Магчыма, пан Грэла паверыў у ганарары за граматыку і сінтаксіс, а таксама ж у сумленнасць не названага, але надзейнага (!) чалавека, існаванне якога мог пацвердзіць Радаслаў Астроўскі.

У запісцы адзначана, што гісторыю вяртання 500 даляраў са сваёй варшаўскай кватэры Тарашкевіч расказваў Астроўскаму ў часе іхняга турэмнага побыту.

Але ці паверыў пан Грэла ў тое, што некалі ў Пецярбургу студэнт Тарашкевіч пазычыў студэнту Дуж-Душэўскаму 300 даляраў?

Ці мелі наогул студэнты, няхай сабе й царскія, такія грошы?

Анатоль Сідарэвіч сказаў на гэта проста:

— Тут Браніслаў Адамавіч прыдумаў не вельмі ўдала!

А мне здаецца: ён разлічваў на тое, што інжынера Дуж-Душэўскага не спытаюць, бо ён жа ў Літве…

А яшчэ з Грэлавай запіскі можна даведацца, што на часопіс, які меўся выходзіць у Берліне, знаёмая Тарашкевіча Кульчыцкая атрымала ад эміграцыі каля 150 нямецкіх марак, а сам ён у студзені 1931 г. у тым жа Берліне ад эмігрантаў і Беларуска-вызваленча-народнага фонду займеў 300 нямецкіх марак на выданне беларускай газеты, а таксама ж яшчэ былі атрыманы сродкі на выбары, на дапамогу вязням і зноў жа на выдавецкую дзейнасць.

Лінія абароны Тарашкевіча была простая: увесь час ён даводзіў следству пра свае кантакты з беларусамі на эміграцыі — з навучэнцамі, студэнтамі і рабочымі, якія вучацца і працуюць у Нямеччыне, Чэхаславакіі, Францыі, Амерыцы — гэта, маўляў, яны даюць грошы на беларускую культурніцкую (!) справу.

Нядаўні лідар БСРГ нібыта казаў: я займаюся асветніцкай дзейнасцю і нічым больш!

Пра грошы, якія йшлі з Менска, вядома ж, маўчаў — умовы палітычнага існавання прымушалі маскіраваць камуністычныя крыніцы фінансавання сваёй небяспечнай работы…

Шчыра кажучы, здзіўляюць не так гэтыя сумы, як тое, што палітык вёз з сабою цэлы архіў (сапраўдны скарб для паліцыі!) — рэфераты, пракламацыі, справаздачы, шматлікія запісы пра выбары, пракамуністычныя лекцыі, фінансавыя ведамасці, лісты з Парыжа і Берліна (там было бюро КПЗБ), 90 пустых, але заадрасаваных (!) канвертаў (збіраўся дарассылаць заяву-тлумачэнне пра сваё датэрміновае звальненне з турмы ў Грудзёндзу 28.04.1930 г.); урэшце меў пры сабе картатэку на 537 старонак з прозвішчамі і адрасамі падпісчыкаў…

Адрасы былі занатаваныя й на васьмі асобных старонках…

А яшчэ вёз доўгія спісы — напрыклад, на 16 машынапісных старонках спіс чальцоў Таварыства Беларускай Школы (ТБШ) з гродзенскага, маладзечанскага, ашмянскага, баранавіцкага, браслаўскага, беластоцкага і брэсцкага паветаў, а таксама ж спісы чальцоў ТБШ з асобных гмін; спіс студэнтаў з азначэннем іх спецыялізацыі і партыйнасці; спіс і адрасы выключаных за прыналежнасць да камсамола вучняў…

Адрасоў было шмат.

Вядома, паліцыя ўчыталася і ў асобныя чатыры старонкі, густа спісаныя адрасамі і прозвішчамі ад рукі па-польску; учыталася і ў адну польскамоўную паперыну, на якой была выкладзена прычына скасавання выбарчага спіса Беларускага Сялянска-Работніцкага Клуба «Змаганне», і старанна вывучыла ўсе беларускамоўныя старонкі…

Але найбольш старанна, трэба думаць, следчыя гарталі блакнот у чорнай скураной вокладцы з рознымі нататкамі па-беларуску і па-польску; з рознымі імёнамі, кароткімі характарыстыкамі і зноў жа адрасамі, найперш варшаўскімі:

1. Марыя Глесманова, вуліца Паркавая 39, кв. 16 (гандлярка).

2. Казімір Таран, вуліца Груйецка 39, пакой 414, інтэрнат (студэнт 2 курса ўніверсітэта, слухач агранамічнага факультэта, каталік, скончыў беларускую гімназію ў Дзвінску, грамадзянін Латвіі… «Вясковы хлопец. Жыве сціпла…»)

3. Уладзімір Павелкевіч, вуліца Бельведэрская 48 (рэдактар часопіса «Наш Рух», адміністратар газеты «На варце»).

4. Ян Піваварчык, вуліца Зэмбкоўская 45.

5. Міхал Шэўко (скончыў беларускую гімназію ў Навагрудку, былы камсамолец; 2 курс… «Мае арганізатарскія здольнасці. Вельмі добра працаваў у ТБШ… Найлепшы…»)

6. Уладзімір Тамашык (скончыў школу і беларускую семінарыю, з Вільні паехаў у Прагу; меў 4 гады турмы па 102 артыкуле /рэвалюцыйная прапаганда. — Л. Д.-М./)

7. Якуб Тарасевіч (скончыў беларускую гімназію ў Навагрудку, былы камсамолец, 2 год вывучае ветэрынарыю).

8. Пратасевіч (скончыў беларускую гімназію ў Навагрудку, былы камсамолец, студэнт універсітэта, 2 год вывучае хімію).

9. «Казік» (скончыў беларускую гімназію ў Дзвінску, грамадзянін Латвіі… «Уражанне, здаецца, добрае…»)

Паліцыя наведалася да М. Глесмановай — кабета часта ездзіла ў Гданьск, прадавала ў мясцовыя рэстараны прадукты і курэй з качкамі.

Праўда, вобыск у яе доме нічога не даў, і гандлярка заявіла, што пра Тарашкевіча нават не чула і камуністычную літаратуру з Гданьска не прывозіла.

Пэўна ж, 42-гадовая пані Глесманова была авантурысткай: 20 кастрычніка 1926 г. яе арыштавалі ў Гурнічай Дэмброве за тое, што пусціла ў абарот фальшывую манету; за гэта сядзела ў турме на вуліцы Дзельнай да 5 кастрычніка 1929 г., а 1 сакавіка 1930 г. здала пакой для працаўнікоў беларускай газеты «На варце».

Паводле следчага пратакола, газету спачатку рэдагаваў Сцяпан Дзядовіч, а тады ўжо рэдакцыяй кіраваў У. Павелкевіч.

М. Глесманова расказала, што аднойчы па пошце з Вільні рэдакцыя атрымала 300 злотых, што ў рэдакцыю часта заходзілі беларускія студэнты, у тым ліку і К. Таран; яна чула пра паслоўдэпутатаў Дварчаніна, Грэцкага, Крынчыка і Гаўрыліка, аднак жа наогул пра што йшлі размовы ў рэдакцыі не магла зразумець, бо не ведае беларускай мовы…

Будучы аграном 23-гадовы Казімір Таран (а ў яго інтэрнацкім пакоі паліцыя таксама нічога не знайшла) даў такія паказанні: палітыкай не займаецца, бо вельмі заняты вучобай; адрасоў Шэўко, Тарасевіча і Павелкевіча не ведае, а Пратасевіч жыве ў студэнцкім інтэрнаце… З беларускіх дзеячоў знае Радаслава Астроўскага, нават прасіў яго дапамагчы перавесціся ў Пражскі ўніверсітэт, аднак просьба засталася не пачутай; знае таксама Янку Станкевіча і Антона Луцкевіча, а пра Тарашкевіча толькі чуў, зрэдку чытаў пра яго ў газетах і, вядома ж, ніякіх грошы ад яго ніколі не атрымліваў.

# ФРАГМЕНТЫ

Грошы атрымлівае ад бацькоў з Латвіі, а яшчэ штомесяц мае 75 злотых ад пана Галуўкі з усходняга аддзела міністэрства замежных спраў.

Адзначу: стыпендыю Галуўкі атрымлівалі таксама Тарасевіч, Пратасевіч і Шэўко, і менавіта пан Галуўка фінансава паспрыяў, каб у Варшаўскім універсітэце 1 лютага 1931 г. паўстаў гурток беларускіх студэнтаў (у гурток увайшло 20 чальцоў)…

Казімір Таран прызнаўся, што заходзіў у дом, які на вуліцы Паркавай 39, кв. 16, але толькі для таго, каб пазнаёміцца з дзяўчатамі, якія жылі ў пані Глесмановай…

Як бачна, паліцэйскія чыноўнікі мала пажывіліся ад Казіміра Тарана, а з Уладзімірам Павелкевічам ім наогул не ўдалося спаткацца.

Апошнім часам Павелкевіч пражываў не на Бельведэрскай 48, а на Паркавай 48, але 12 снежня 1930 г. выпісаўся адтуль і выехаў невядома куды.

Ці праверылі адрас: Зэмбкоўская 45 (жытло Яна Піваварчыка) — у пратаколе не адзначана, але адзначана іншае: паліцыя не ўстанавіла адрасы Шэўко, Тамашыка, Тарасевіча, Пратасевіча і, напэўна ж, і «Казіка» таксама.

Усё, здаецца, для ўсіх складалася няблага, і ў сваіх паказаннях Тарашкевіч быў даволі асцярожны.

Пра таго ж Павелкевіча гаварыў зусім скупа і прыкладна так: знаёмства нейкі час было завочным, а наогул жа сустракаліся яны разы два; раіў Павелкевічу стрымана пісаць у часопісе «Наш Рух»; падтрымліваў рэдакцыю грашыма; абгаворваў магчымасць выдання часопіса «Беларускі Гаспадар», прысвечанага эканамічным, сельскагаспадарчым і культурным праблемам, але справа далей за гаворку не пасунулася, бо Павелкевіч раптам пакінуў грамадска-палітычную працу…

Відаць па ўсім, гэты Павелкевіч быў не зусім шараговым дзеячом, Тарашкевіч разлічваў на яго і ў сваіх нататках згадваў часта:

«…Газета Павел.(кевіч). Праз Мушку 21.10.(19)30 — 2000 зл.(отых). З забраных пры сваім прыездзе 1000 зл. з 3000 зл.

Прыблізны падлік: Павелк.(евіч). 1. Кватэра — 100; 2. Заробак Пав.(елкевіча) — 300; 3. Дагаворная стаўка 2 тыд.(ні) — 200; 4. Зіц-рэдактар — 50 зл., за нумар — 100 зл.; 5. Памочнік — 150 зл.; 6. Замежная экспедыцыя маркамі — 25-50; 7. Дробязь — 50; 8. Нумар разам з экспедыцыяй — 700-1400-2350 зл. На 10 (?) да гэтага часу трэба 1225, засталося 750, трэба 475.

Беларускі гаспадар. Фактычны рэдактар Павелкевіч. Эканоміка, гаспадарка, трохі літаратуры, вершы, хроніка. У Вільні. Прыблізны падлік. Наклад 1000 паасобнікаў. 1. Кватэра — 100; 2. Укладанне двух аркушаў — 250; 3. Вокладка — 20; 4. Пераплётчык — 30; 5. Папера — 30. Экспедыцыя, маркі — 100. Адказны рэдактар — 100, фактычны рэдактар — 250-880…»

Грошай Павелкевічу Тарашкевіч не шкадаваў.

На іншых старонках свайго славутага ў чорнай скуранай вокладцы блакнота пакідаў такія выразныя запісы: «… У Варшаве Павелкевіч надрукаваў № 8 — 250000; № 3 — 250000. Праз салдат распаўсюдзіў у Беластоцкім ваяводстве (гаворка пра выбарчыя нумары. — Л. Д.-М.)… Павелкевіч 4.11. — 10000; Павелкевіч 20.11. — 10000… Трэба грошы для Павелкевіча на газеты і харчы (падкрэслена. — Л. Д.-М.)…»



Грошы трэ былі, вядома, не толькі Павелкевічу, — і Тарашкевіч не шкадаваў іх нікому.

Ён выступаў як бухгалтар, як фундатар, як мецэнат, падрабязна занатоўваючы кожную дачу, кожную рату:

«… Памяняў 22.10.(19)30 2000 зл. (на) 223 даляры. Даў на дарогу 1. Бурсевічу 100 дал.(яраў); 2. Сымону 70 дал.(яраў); 3. Пятру 20 дал.(яраў); Бакачу 24.12.(19)30 — 2440…»

Праясню для сябе, аб кім гэтым разам паклапаціўся Тарашкевіч.

Бурсевіч — гэта, відавочна, Максім Бурсевіч (кіраўнік Цэнтральнага Сакратарыята БСРГ); Сымон — думаю, што гэта С. Ракі Міхайлоўскі; Пятро — магчыма, Пятро Мятла…

Апошні ж у спісе — гэта, мусіць, той Бакач, за якога ў 1938 г. прасіў у чэхаславацкага кіраўніцтва Васіль Захарка, калі хацеў, каб менавіта П. Бакач стаў загадчыкам Беларускага Заграніччага Архіва ў Празе…

А вось новы запіс:

«…Прасілі трохі грошай. Я паслаў прыблізна 6000 злотых…»

І тakі свядчанняў шмат.

Вышэй я казаў, што грошы гінулі ў палітычным пяску, шырокай ручаінай сплывалі ў паліцэйскую касу…

І гэта так.

Аднак жа часта яны йшлі і на вельмі патрэбную дапамогу сем'ям арыштаваных. Толькі адзін прыклад.

У жніўні 1930 г. былі кінуты ў вязніцу дэпутаты сейма Язэп Гаўрылік і Флягонт Валынец, а праз два месяцы ў кастрычніку ў турме апынуўся й знакаміты Рыгор Шырма.

Жонкам пацярпелых Тарашкевіч тут жа зрабіў наступныя выплаты:

«…Гаўрылікова — кастр.(ычнік) 300 зл., ліст.(апад) 300 зл.

Валынцова — кастр.(ычнік) 200 зл., ліст.(апад) 200 зл.

Шырмова — кастр.(ычнік) 300 зл., ліст.(апад) 300 зл. …»

У гэтым спісе былі таксама іншыя жанчыны, чые мужы сталі арыштантамі, таму агульная сума, якую Тарашкевіч выплаціў, склала 1360 злотых…

Дык вось, у сваіх паказаннях ён быў асцярожны — пра гандлярку Глесманову, студэнтаў Піваварчыка, Тарана, Шэўко, Тамашыка, Тарасевіча, Пратасевіча і «Казіка» заявіў: гэтых людзей не знаў і не ведаў, і толькі збіраўся з імі пазнаёміцца, а запісы пра іх зрабіў з чужых вуснаў…

Уведзена ў пратакол і такая ягоная характэрная фраза: «Знаёмых жыдоў у часе свайго побыту ў Гданьску і Сопаце не сустракаў…»

Не хацеў тапіць людзей!

І ўсё рабіў, каб даказаць: ТБШ — арганізацыя культурніцкая, а не палітычная, і ён, палітык, у яе рабоце не ўдзельнічаў (гэтак спрабавалі адвецці ад Таварыства Беларускай Школы пагрозу закрыцця).

І ўсё ж, і ўсё ж…

Чаму ён — вопытны канспіратар (вольны мысляр! рыцар чырвонай ружы!) паступіў так легкадумна?

Можна сказаць, даставіў у рукі паліцыі воз дакументаў, адна спецыфікацыя якіх склала ажно 77 пунктаў!

Ён вёз тэксты, змест якіх і малапісьменнаму паліцыянту праясняўся ж адразу, бо меў выяўнае «антыпанствовае» (антыдзяржаўнае) гучанне: «…Грамаду народ разумеў як падрыхтоўку да паўстання… Няхай жыве рабоча-сялянскі ўрад!. Папулярызацыя поспехаў сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР, увага на добраахвотную калектывізацыю, машынізацыю і механізацыю гаспадаркі…» і г.д.

Ці не стаўся палітык ахвярай правакацыі, скажам, таго ж Камінтэрна — выканаўчай структуры АДПУ?

Аляксандра Бергман у кнізе «Слова пра Браніслава Тарашкевіча» пісала: «Мяркуючы па судовых актах, арышт быў старанна падрыхтаваны. 5 лютага 1931 года Тарашкевіч павінен быў ляцець на самалёце з Гданьска ў Берлін. Калі ж прыехаў у аэрапорт, то выявілася, што самалёт, на які меў куплены квіток, вылецеў на паўгадзіны раней. Тады купіў квіток на наступны самалёт. Праз нейкі час яму сказалі, што другі самалёт не паляціць, вярнулі грошы і параілі ехаць цягніком. Паколькі меў устаноўлены тэрмін прыезду ў Берлін, сеў у цягнік. У купэ быў адзін, таму замкнуўся. У Тчэве ў купэ ўламаўся камісар паліцыі Тадэвуш Скальскі. Пакуль камісар тузаўся з дзвярыма, Тарашкевіч паспеў толькі знішчыць адрасы…».

Не, адрасы, як мы ўжо бачылі, знішчыў не ўсе…

Аналізуючы сітуацыю, можна пэўна сказаць: Тарашкевіч ужо быў непатрэбен камуністам (прынамсі, на свабодзе!); яму прапанавалі з усім рукапісна-машынапісным скарбам перабрацца ў Берлін (зманлівую легенду не цяжка было прыдумаць: тая ж выдавецкая дзейнасць, да якое беларусы заўсёды ахвочы!); яго забяспечылі грашыма, фальшывым пашпартам і, вядома ж, «стукнулі» пра пераезд у дэфензіву…

Дэфензіва ой як узрадавалася!

Невыпадкова ж, правяраць падроблены пашпарт узяўся сам кіраўнік памежнага камісарыята пан Скальскі, — нібыта на гэты час усе ягоныя падначаленыя былі занятыя…

Дарэчы пра пашпарт.

Следчаму Грэлу Тарашкевіч даў такое тлумачэнне: за 100 даляраў дастаў ліпу на імя Уладзіслава Паўліка, віза ў «дакуменце» несапраўдная, а фотаздымак яго; асобу ж, якая пасрэднічала ў вырабленні фальшыўкі, назваць не можа…

На пытанне, чаму вырашыў стаць чэхаславацкім падданым, адказаў, што збольшага ведае чэшскую мову — нямецкай жа, французскай і англійскай валодае не вельмі добра, каб выдаць сябе за немца, француза ці брытанца…

Чамусьці пра свае моўныя здольнасці выказаўся вельмі сціпла!

Аляксандра ж Бергман адзначала: «Побач з валоданнем беларускай, польскай, чэшскай і расійскай мовамі… грунтоўна вывучыў грэчаскую і лацінскую… лёгка чытаў па-французску і па-нямецку. Вывучаў літоўскую, англійскую мовы, а таксама санскрыт…».

У гэты зайздросны пералік можна яшчэ дадаць: іспанскую; за мову Сервантэса ўзяўся ў апошнія гады жыцця…

Справа з пашпартам набыла дыпламатычны розгалас.

Суддзя Я. Булгак звярнуўся ў чэхаславацкае пасольства ў Варшаве з адпаведным запытаннем, і 28 верасня 1931 г. атрымаў адказ:

«Консульскі Аддзел Чэхаславацкага Пасольства ў Варшаве мае гонар паведаміць, што згодна заявы Камісарыята Паліцыі ў Усці н./Л. (Усці-над-Лабай. — Л. Д.-М.) Уладзіславу Паўліку, які нарадзіўся 16.10.1893 г. у Усці н./Л., чэхаславацкі пашпарт не выдавалі. Памянёны грамадзянін ні ў якім паліцэйскім участку не зарэгістраваны і наогул такой асобы ў Усці н./Л. няма.

Праўда, названая ўстанова выдала пашпарт за № 758, аднак жа не на імя Паўлік (пасля коскі ўсё падкрэслена. — Л. Д.-М.), а на імя — Валерыі Хулзелавай, памочніцы ў гаспадарцы; В. Хулзелава нарадзілася 23.09.1909 г. у Страйкове, пав.(ет) Усці н./Л., дзе й жыве; яе пашпарт прыгодны для паездак у Аўстрыю і Нямеччыну да 19.06.1932 г.

З прычыны падробкі чэхаславацкага пашпарта Консульскі Аддзел Чэхаславацкага Пасольства просіць Вашай ласкі зрабіць і спешна выслаць фатаграфіі пашпарта, а перш за ўсё — зняць вокладку з абодвух бакоў і 1, 2, 3, 4 і 5 старонкі, а таксама ўкладышы з савецкай візай, выдадзенай 1.09.1930 г. Генеральным Консульствам СССР у Гданьску.

Таксама ж Консульскі Аддзел Чэхаславацкага Пасольства просіць Вас ласкава паведаміць пра выніке следства ў справе падробкі чэхаславацкага пашпарта, знойдзенага ў Браніслава Тарашкевіча.

За Вашу ласку Консульскі Аддзел Пасольства дзякуе наперад…».

Пісьмо гэта (1/2 старонкі машынапісу) прыйшло за нумарам 9562/31, і заместа пасла яго падпісала нейкая чыноўная душа.

На дакуменце, да слова сказаць, ёсць пасольская пячатка, аднак жа ніякай рукапіснай адзнакі па-польску — нібыта яго й не чыталі.

Мінула больш за два тыдні.

І што, пасольства атрымала адказ?

Не, ні радка не атрымала, таму 15 кастрычніка тая ж старанная чыноўная душа за нумарам 10.014/31 і пад дэвізам: «Уладзіслаў Паўлік — падробка чсл. (чэхаславацкага. — Л. Д.-М.) пашпарта» зноў напісала вяльможнаму пану Я. Булгаку ў Вільню: «Консульскі Аддзел Пасольства Чэхаславацкай Рэспублікі ў Варшаве мае гонар прасіць Вашай ласкі зрабіць і даслаць фатаграфіі вышэйназванага падробленага чэхаславацкага пашпарта для рэквізыцыйных спраў у Варшаве, Новы З'язд № 1. Аб гэтым ужо прасілі Пана Следчага Суддзю ў пісьме 9562/31 ад 28 верасня г.г., і маем надзею разам з фотаздымкамі атрымаць і судовыя пратаколы крымінальнай справы, заведзенай на Браніслава Тарашкевіча.

За аказаную прыязнасць Консульскі Аддзел загадзя ўдзячны Пану Суддзі…».

На дакуменце дзве паметкі, адну з якіх (чорным алоўкам) лёгка расчытаць: «Атрымана 19.10.31 г. Я.Б. (Язэп Булгак. — Л. Д.- М.)».

І што, пасля гэтага спадар суддзя, сараміўся ўздыхнуўшы, засеў за сваё пасланне?!

І блізка таго не было!

Пачакаўшы 19 дзён, 3 лістапада невядомы чэхаславацкі чыноўнік мусіў быў зноў скласці за свайго пасла эпісталу (№ 10.654/31) — вельмі кароткую і, здаецца, ужо з ноткай раздражнення: «Консульскі Аддзел Пасольства Чэхаславацкай Рэспублікі ў Варшаве ветліва просіць Вяльможнага Пана Суддзю тэрмінова адказаць на наша пісьмо ад 15.10. г.г. за нумарам 10.014/31…».

Гэты па аб'ёме тэлеграмны ліст паклалі перад Я. Булгакам 6.11.31 г., рэзалюцыю суддзя пакінуў зноў чорным алоўкам, але нечытэльную і, трэба думаць, на тым ліставанне й скончылася…

**30 красавіка 2011. Субота. Менск.**

**Цалкам кнігу можна прачытаць у часопісе «Дзеяслоў».**

АПАВЯДАННЕ

# ЦЯЖКАСЦІ РАЗУМЕННЯ

Сяргей КАЛЕНДА

**Раніца суботы. Якаў, як звычайна ў выходныя, збіраўся на лецішча, якое ён набыў год таму разам з новай Аўдзі А6, хоць на той момант у яго яшчэ не было пасведчання кіроўцы. Набыў ён усё гэта адразу, бо хваляваўся за тое, каб не растраціліся грошы пасля продажу двухпакаёўкі, якая засталася пасля бабулі.**





Якаў узяў з сабою кошык для грыбоў і спінінг, жонка адмовілася з ім ехаць, бо была стомленая ягоным змрочным настроем, калі ён сядзеў за стырном.

Якаў кіруе машынай толькі трэці месяц, але і да гэтага часу не надта добра прызвычаіўся да шашы і, нават калі шмат разоў ездзіў адным і тым жа шляхам, усё роўна не мог добра арыентавацца ў прасторы, таму, як толькі ён трапляў у салон аўто, станавіўся маўклівым, звышсур’ёзным і пільным, бровы насоўваліся на нос, і жонцы ён толькі даваў розныя загады і прамаўляў іх так, быццам ненавідзеў яе альбо ў наступны момант мог забіць.

— Паглядзі ў правы бок, там няма машын? — Цадзіў ён скрозь зубы на скрыжаванні, і гэта часта былі ягоныя першыя і апошнія словы за ўвесь час паездкі.

— Будзь уважлівай! — Хрыпеў Якаў, звяртаючыся хутчэй да самога сябе.

Зразумела, што ніякай гутаркі пра радыё альбо нейкую музыку нават не вялося. Трохгадзінная паездка разам з Якавам была пакутаю, знікала ўсялякае жаданне бавіць выходныя на лецішчы. Таму аднойчы жонка раптоўна захварэла і выправіла мужа аднаго, няхай прывязе грыбоў і рыбы, яна чаго смачнага згатуе.

Якаў завёў машыну, кінуў на суседняе месца спінінг, зашпілены ў футарал, паставіў кошык і паклаў каля яго свой улюбёны паляўнічы нож. Наступіў час канцэнтрацыі, унутранай барацьбы паміж хваляваннем і панікай. Якаву цяжка давалася гэта, але што паробіш, ён кожным разам спадзяваўся, што прывыкне да стырна, але гэта ніяк не адбывалася.

Васіль выправіўся да сваіх бацькоў а дзявятай раніцы і меў спадзяванне аўтаспынам дабрацца да іх у абед. Нельга сказаць, каб ён надта радаваўся перспектыве бавіць выходныя ў вёсцы, але яму было неабходна пазычыць колькі грошай.

Ён доўга ішоў уздоўж дарогі, выстаўляючы вялікі палец машынам, але чамусьці ніхто не спыняўся. Вось праляцеў бус з вялікай сям’ёй, і сабака на заднім месцы высунуў яму язык. Сонца вісела высока, і спякота паступова навісала над плячыма. Вось праляцелі адразу тры дальнабойнікі, жэстамі паказваючы яму, што будуць хутка заварочваць у правы бок. Васіль ішоў і няспынна выцягваў вялікі палец альбо рукою паказваў, што яму трэба ехаць прама. Прамінула яшчэ колькі дзясяткаў машын са шчаслівымі сем’ямі і сяброўскімі кампаніямі. Гэтая дарога доўгія кіламетры ішла ўздоўж новых лецішчаў, якія пачыналі толькі забудоўвацца і мелі сваімі гаспадарамі маладыя сем’і з дзецьмі-падлеткамі, якія неўзабаве праз колькі год мусілі пачаць самастойна вазіць у свае «катэджы» дзяўчын, сяброў і алкаголь.

Раптам на ўзбочыне спынілася Аўдзі А6, прычым цяжка было сказаць, дзеля чаго спынілася, бо ад Васіля яна была на даволі далёкай адлегласці, і замест таго, каб пад’ехаць бліжэй альбо канчаткова знерухомець, машына была заведзенай і павольна рухалася наперад, быццам кіроўца вагаўся паміж тым, каб спыніць машыну і падабраць папутчыка, альбо з’ехаць. Васіль вырашыў падбегчы да аўто, можа, яму пашчасціць...

— Добры дзень, падкінеце ў ...

— Так падкіну, але давай хутчэй сядай назад, бо я не хачу, каб машына заглохла, нешта сёння надта доўга заводзілася! — Гучна прамовіў Якаў, і правае павека сутаргава дрыганула.

Дзверы зачыніліся, Васіль уладкаваўся на заднім месцы, заўважыўшы, што машына амаль новая і не магла проста так кепска заводзіцца, і ўжо ў салоне ён прыкмеціў, што на пярэдняе сядзенне былі пакладзены нейкія рэчы і нешта падобнае да вялікага нажа ў похвах.

— Файнае сёння надвор’е, — вырашыў распачаць гутарку Васіль. — ...Я кажу, надвор’е — цудоўнае.

Але адказу ізноў не было.

Васіль, вырашыўшы, што кіроўца не надта ахвочы да гутаркі, вырашыў сачыць за краявідам. Пейзаж не мяняўся — дрэвы, палі і хаткі. Васіль засумаваў і адважыўся зноў распачаць гутарку.

— У вас, я гляджу, машына амаль як новая.

Якаў нічога не адказаў, ён моцна сціскаў стырно і вялікімі пальцамі сутаргава барабаніў па скураным пакрыцці. Васіль прыкмеціў гэта і занепакоіўся, магчыма, кіроўца маўчаў, бо ў яго нешта там здарылася, мо што з сям’ёй, а ён тут са сваімі глупствамі пра надвор’е і машыну, таму ён вырашыў запытацца.

— У вас, выпадкова, нічога не здарылася?

Раптам кіроўца нярвова загаманіў.

— Шаноўны чалавек, вы што, не бачыце, што я кірую аўтамабілем?! І я быў бы ўдзячны, калі б вы пакінулі мяне ў спакоі, я ўжо сумняюся ў правільнасці таго, што спыніўся, каб вас падвезці. Будзьце ціхамірным, і ў вас, і ў мяне ўсё будзе добра!!! — У голасе Якава чулася занепакоенасць і адначасова нейкая пагроза, і Васілю стала вусцішна.

Дарога хутка знікала пад калёсамі, і раптам машына скінула сваю хуткасць і звярнула з аўтастрады ў правы бок, на сельскую шашу.

— Прабачце, але гэта не ў мой бок! — захваляваўся Васіль.

— Не хвалюйцеся, так карацей, — суха прамовіў Якаў.

За акном замест самотных дрэў быў лес, дах машыны час ад часу з шапаценнем кранялі галінкі, пад колы трапляліся камяні, шаша пертваралася ў каляіну... Васіль занепакоіўся, калі зноў заўважыў, што на пярэднім месцы, каля кіроўцы, ляжыць нож у похвах. Ён зірнуў на Якава: той, не звяртаючы на яго ўвагі, працягваў сачыць за дарогай, час ад часу ягоныя вены на шыі набухалі і знікалі, а рукі сутаргава трымаліся за стырно, якое выслізгвала з іх.

Якаў сапраўды падаваўся крыху шалёным вар’ятам, і Васіль пачаў наганяць на сябе жах разважаннямі пра тое, што страшэннае можа з ім здарыцца, калі кіроўца — які-небудзь забойца.

Васіль пралічыў, што кіроўца не надта вялікі. Калі што, у яго будзе час і моца, каб пазмагацца за жыццё. Але што будзе, калі кіроўца апантана схопіць нож, і лязо на ўсю даўжыню паспее ўвайсці ў ягоны страўнік альбо сэрца, тады ён не зможа сябе абараніць! З яго нават ніякіх грошай не возьмеш! Ён бедны. Толькі вопратка ды мабільнік у яго ніштаватыя, і тое дзякуючы гаспадарлівым бацькам.

Бацькі! Любімыя бацькі! Родны дом раптоўна падаўся надта жаданым!

З кожным новым пераадоленым метрам Васіль адчуваў, як у салоне аўтамабіля хмарамі вісіць ягоны цяжкі лёс. Ён глядзеў у патыліцу кіроўцы, заламваў пальцы на руках, і з кожнай новай хвілінай жах смерці адольваў ягоную сутнасць.

Далоні пацелі, павекі сутаргава трэсліся, сэрца апантана грукалася. Васіль быў надта ўражлівым, і цяпер ехаў, адчуваючы сябе ахвярай незнаёмца. Ён моцна хацеў жыць, і паніка адольвала яго мацней і мацней, пакуль ён не пачаў нешта мармытаць сабе пад нос.

«Што будзе далей? Што рабіць?! Як мне так пашчасціла патрапіць у гэтую машыну! Што са мною будзе?! Трэба набрацца мужнасці! Трымаць сябе ў руках!» Як малітву шаптаў сабе пад нос Васіль, а дарога не мянялася, і толькі з кожным разам яшчэ больш нагадвала нейкую непралазную каляіну, недзе ў гушчары лесу, на мяжы жыцця.

— Што ты кажаш? — Запытаўся Якаў, пачуўшы, што ззаду аўтаспыншчык нешта мармоча. Кіроўца крыху стаміўся, яму цяжка было пераадольваць кіламетры лесу ў мэтах зэканоміць літр бензіна, праз колькі метраў мусіў скончыцца гэты шлях, і яны мусяць апынуцца каля поля жыта, і тады Якаў спыніцца ў прыбіральню і на кароткі адпачынак.

— Калі ты пра тое, каб зрабіць прыпынак на колькі хвілін, то толькі пазней, я сам, ведаеш...

Васіль не дачакаўся заканчэння сказу кіроўцы, які неяк надта раптоўна парушыў гадзінную цішыню, быццам пачуў, што ягоны план па забойстве можа не здзейсніцца. Ён, спрабуючы дацягнуцца да шыі кіроўцы, далонямі патрапіў яму ў вочы і нос і прыціснуў ягоную галаву да падгалоўніка сядушкі. Машыну тузанула, Якаў адпусціў стырно — і праз імгненне Аўдзі А6 ужо ляцела ў суседнія елкі.

## АНОНС

**Ала СЯМЁНАВА. У святой краіне выгнання: імпрэсіі, адлюстраванні / Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка», выпуск 10. — Мінск: «Кнігазбор», 2011. — 488 стар.**




У Бібліятэцы Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка» выйшла новая кніга Алы Сямёнавай «У святой краіне выгнання».

У кнігу ўвайшлі роздумы пра адухоўленае верай і думкай існаванне чалавека, пра сэнсавыя рытмы жыцця. Пачуццё і факт, эстэтычна-філасофскія разважанні і побытавыя замалёўкі, лірычныя споведзі і лёгкая іронія спалучаюцца ў адзіную плынь — спробу спасціжэння Часу і Вечнасці, Гісторыі і Быцця.

Ала (Альбіна) Іванаўна Сямёнава нарадзілася ў 1938 годзе на Камчатцы. У 1944-м з сям’ёй вярнулася ў Беларусь, скончыла школу ў Наваградку (які лічыць сваёй Вялікай Радзімай) і Белдзяржуніверсітэт. Працавала ў выдавецтвах «Навука і тэхніка», «Мастацкая літаратура», у рэдакцыі часопіса «Нёман». Аўтар кніг літаратурна-крытычных эцюдаў, эсэ і прозы «Гарачы след таленту» (1979), «Слова сапраўднага лад» (1986), «Святло загадкі» (1995), «Таямніцы пакутны колер» (2004), «Перад геніем лёсу» (2006). Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў з 1982 года.

ВІДАРЫСЫ

# ШОПІНГ ПА-БЕЛАРУСКУ

Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ

**Ногі мерзлі неймаверна. Напярэдадні пацяплела, мароз адваліўся, і я надзела ў дарогу ўмоўна зімовыя боты нямецкай вытворчасці. Той, хто іх прыдумаў, ніколі, мабыць, не бачыў сапраўднай зімы. Кабета спераду зжалілася і падала мне плед. Пары, што размясцілася па-суседству, прэзентавалі цёплы спальнік, прадбачліва ўзяты якраз на такі выпадак.**

Калі мы толькі выехалі з Мінска, я перш падумала, што гэтая пара не жанатая. Вельмі ж паважліва размаўляла з ім яна, і вельмі ж туліўся, гарнуўся да яе ён. Абодвум добра за 60. Мужчына ўладкаваўся насярод нас і ад мяне быў дэманстратыўна адвернуты — з чаго я зрабіла выснову, што ўсё-такі муж, а не сябра жыцця.

Даверху напакаваны баўламі і пакетамі міні-аўтобус мерна рухаўся ў Мінск, а новая і недаўгавечная чалавечая супольнасць ажыўлена гутарыла: дзялілася ўражаннямі аб пакупках і абмяркоўвала палітычнае становішча ў краіне. Жанкі так смела і дасціпна выказвалі свае погляды на падзеі, што іх грамадзянская пазіцыя сумневу не выклікала. Бел-чырвона-белы сцяг над вадзіцелем таксама сведчыў пра паўнаю ідэйную заангажаванасць. На сцяг паказаў польскі мытнік, тыпу — што гэта? «Усё яны ведаюць», — адкаментавалі мае спадарожніцы...

Усе мы выбраліся ў Беласток на так званы шоп-тур. «Мы» — гэта я і згаданая незнаёмая пара (трое нармальных, як сказаў кіроўца); пяцёра астатніх — вопытныя чаўночніцы. Прафесія ўзнікла ў 90-ых на глебе дэфіцыту і расквітнела зноў, калі ў Польшчы патанелі рэчы і прадукты. Даўно мінуўся час, калі палякі ездзілі да нас і закуплялі на перапродаж розную гаспадарчую драбязу. Яны выйшлі з крызісу і сталі на ногі. Новы статус краіны (Польшча ўвайшла ў Еўрапейскі Саюз і ўвяла візавы рэжым) спарадзіў з нашага боку новага чаўнака. Калі абагуліць, то гэта прыемнага выгляду жанчына сярэдніх гадоў, часта з вышэйшай адукацыяй. Тыя спекулянткі, што некалі вазілі праз мяжу цыгарэты і спіртное, адышлі ў мінулае. Патрабуецца такі культурны ўзровень перавозчыка, каб ён мог і візу сабе афоміць, і ў памежнікаў не выклікаў падазрэння.

Рухаліся мы не па гродненскай шашы, а неяк мудрагеліста. Сустрэчны транспарт трапляўся рэдка. У 12 начы аказаліся на беларуска-польскай мяжы і без праблем прайшлі ўсе належныя працэдуры. У мяне не выходзіла з галавы нявыказанае пытанне: «А што мы ноччу будзем рабіць у Беластоку? Спаць у аўтобусе?» Каб жа! Недзе пасля трох мы ўжо зварочвалі на загарадны аптовы рыначак, дзе адзінока свяцілася некалькі акенцаў. Ля аднаго з павільёнаў мы выстраіліся ў чаргу. Падаў сняжок, пачынала халаднець. Жанчыны нацягвалі капюшоны, пацепваліся. Ніхто не скардзіўся, усе, відавочна, былі прывычнымі да адсутнасці цяпла і камфорту. Мажны паляк запускаў пакупніц па адной. Па тым, як хутка яны арыентаваліся, што браць, адчуваліся іх абазнанасць і вопыт у прафесіі.

Атаварыўшыся ласункамі і пральным парашком, я стала ў другую чаргу. Прадавец упёр мне не два, а чатыры цяжкія шкляныя слоікі са спецыямі. Адбіваючыся ад яго, выпусціла з-пад увагі і не набыла гарбату. Пад'ехала яшчэ некалькі рускамоўных груп. Усе «бусікі» стаялі з уключанымі маторамі і атручвалі наваколле чадам. Наш кіроўца пры гэтым соладка спаў на рулі.

Збіраліся нашы нядружна, грузілі ў кузаў першыя пакеты. Далей у праграме значыўся начны маркет, які мы за гадзіну абысці не паспелі. Нямаладая пара нарэшце пайшла на кантакт, мы нават карысталіся адным вазком. Многія рэчы падаліся таннейшымі, чым у нас, асабліва рыба і зубная паста.

На вуліцы па-ранейшаму стаяла золкая цемра. Здавалася, гэтай начы не будзе канца. Спаць чамусьці не хацелася, есці таксама. Арганізм прывыкаў да шопэкстрыму. На беластоцкі рынак мы ўехалі а палове сёмай. Там, як ні дзіўна, было поўна народу. Натоўп нечага чакаў. Да нашага аўтобусіка кінуліся так, як быццам мы збіраліся штосьці задарма раздаваць. Кабета ў дублёнцы, падбегшы, на хаду грукала ў шыбіну: маўляў, я тут, тут я!

Рынак там без прэтэнзій, такі прыкладна, як у нашых раённых цэнтрах. Адчыніліся першыя павільёны. Зайшла — і сумелася: прыезджыя тавар не проста бралі, яны яго хапалі, як пры СССР хапалі дэфіцыт. Адчуваліся ўзбуджанасць і азарт. Прыезджыя добра ведалі, што тут танней і што ў нас карыстаецца попытам, набывалі гаспадарчыя тавары, бытавую тэхніку, шаўковую пасцельную бялізну. Я адчувала сябе лішняй на гэтым свяце гандлю. Кітайская сушка мне падалася сімпатычнай, і далей пра спіс патрэбных рэчаў я ўжо не памятала. Адчувальна мерзлі ногі ў імпартных ботах. Здагадалася купіць трыкатажныя гетры (яны мяне, можна сказаць, і ўратавалі), вярнулася ў «бусік» і там прыснула.

Задыханыя нашы жанчыны час ад часу прыцягвалі цяжкія пакункі і беглі па іншыя. Потым усё гэта важылі і грузілі — што ў сваё аўто, а што ў машыны перавозчыкаў. (Бо вываз, як вядома, абмежаваны па колькасці і вазе.) Дык вось хто чакаў нашага прыезду, як манны нябеснай! Так пры нашай «поўнай занятасці» зарабляюць жыхары беларускіх блізкіх да мяжы вёсак.

Муж з жонкай (ён ласкава зваў яе Кнопачкай) чынна прагуліваліся ўздоўж павільёнаў. Уся гэта рэчавая вакханалія зусім іх не датычылася, яны былі проста турыстамі і ўтульна сябе адчувалі ва ўласным кокане на дваіх. Мы зноў перасекліся, набываючы насенне кветак, і паводзілі сябе ўжо як знаёмыя.



Чатыры гадзіны, адведзеныя на рынак, таксама здоўжыліся. Жанчыны, якія паспелі атаварыцца, снедалі «сабойкамі» і размаўлялі. Адну мы чакалі поўным складам, бо ў апошні момант яна зноў панеслася «дабіраць» вагу. (На мяжы высветлілася, што мінчанка перастаралася: перабрала на 6 кілаграмаў.) Напярэдзе заставаўся шыкоўны гандлёвы цэнтр «Аушаны», хоць там я нарэшце адвяла душу і тое-сёе набыла.

Даведаўшыся, што я ўпершыню на такім выездзе, жанчыны паглядзелі на мяне спачувальна. Можа, яны падумалі, што я асмелілася ступіць на іх нялёгкі і небяспечны шлях. На самай справе ў мяне проста заканчвалася віза, і каб «прабіць талон», я падалася не ў блізкую Вільню, а ў дарагую сэрцу Беласточчыну.

Беласточчыну я палюбіла, можна сказаць, з першага погляду — з 2000 года, калі ўпершыню выехала ў Дуброву Беластоцкую. Мясцовае культурніцкае стаўвышэнне штогод ладзіла пленэры. З лёгкай рукі празаіка Міколы Самойліка туды запрасілі з Беларусі не толькі мастакоў, але і паэтаў. Невымоўная благадаць апускалася там на мяне, як вечаровы туман — на манастырскія муры Ружанастока, дзе нас размясцілі. Па польскіх мерках як бы і глуш (бліжэйшы цэнтр прыцягнення — Гародня, «бабці пешкі хадзілі»), але глуш нейкая самадастатковая, мяккая, без дзікасці і нядбальства. І так мне ўсё там клалася на душу, што я аднойчы пажартавала: «Мусіць, я жыла тут у мінулых жыццях».

На другое лета мяне запрасілі ўжо асабіста, і я прывезла з сабой цэлую групу творчых людзей з Беларусі. На трэцяе мы падаліся на адпачынак з мужам на сваёй машыне. І толькі чацвёртая давізавая вандроўка сталася для мяне вялікім стрэсам.

Выбралася я адпачыць у адной прыватнай гаспадарцы Сакульскага павета (у нас гэта называюць агратурызмам). А на зваротным шляху, ужо з білетам на цягнік, падсела ў чужое аўто. Маімі спадарожнікамі аказаліся два «оперы», што дабіраўся ў Масты, дадому, з замежнай камандзіроўкі. Пакуль ехалі да праходзілі мяжу, малодшы ўвесь час падліваў старэйшаму спірту, абодва напіліся і распаясаліся. А калі я зрабіла ім заўвагу, з іх вылезла службовая пыха, з каналізацыі паперла. Яны пачалі хаміць, пагражалі завезці мяне ў свае Масты і пасадзіць там на месяц як спекулянтку. Так што аднойчы ў жыцці і я пабывала ў гэтай несамавітай ролі і — скажу шчыра — страху нацярпелася. Назаўтра, з Мінска, я пазваніла на тэлефон службы даверу і расказала, як старэйшы па званні і па ўзросце сікаў сярод белага дня на сцяну жылога дома. Што яны там праверылі — не ведаю (гэтыя «праваахоўнікі» дужа выкрутлівыя, калі пападуцца), але сам інфернальны наезд запомніла надоўга, калі не назаўсёды.

...Перад мяжой настрой чаўночніц прыкметна пераменіўся: яны напружыліся і прыгатаваліся да памежных непрыемнасцей. Пра штосьць засяроджана думалі, зрэдку перамаўляліся. Стрэс быў напісаны на іх тварах. Некаторыя частку набытага польскага тавару — на ўсялякі выпадак — усучылі не абцяжараным дылетантам. Нам не цяжка — узялі. Шырокая целам кабета раздавала суседзям шчоткі для кузаваў; везла, па яе словах, падарункі мужчынам у працоўны калектыў да дня 23 лютага.

Маладая мытніца спрактыкаваным вокам агледзела нас і нашыя пакункі і адразу вылучыла трох перагружаных пасажырак. Клункі і скрынкі давялося пераважваць. Вінаватым грэзілі санкцыі ў выглядзе штрафу за лішнія кг. Пры гэтым астатнія, каму пашчасціла праскочыць праверку, не выказвалі радасці, а толькі цярпліва чакалі, калі і чым гэта ўсё скончыцца. З дапамогай кіроўцы інцэдэнт неяк уладзілі, і «бусік» весела пакаціўся праз мяжу. Няўжо ўсе кіроўцы такіх рэйсаў настолькі цярплівыя і самааданыя, як наш? Ён мо сто разоў даставаў і загружаў шматлікія пакупкі, ехаў, куды прасілі, чакаў, колькі трэба, у крытычны момант — падстаўіў плячо, і ўсё без аніякага бухцення і прыкметаў раздражнёнасці. Не то характар ад нараджэння залаты, не то адшліфаваўся спецыфікай працы.

Сам Беласток разгледзела толькі днём, пры выездзе. Адбудаваўся, папрыгажэў, стракацеў рэкламай «гуртоўняў» і «склепаў».

На тэрыторыі Беларусі пачалося нечакае: мы рухаліся не прама па шашы, а з заездамі ў навакольныя паселішчы: чаўночніцы збіралі ў перавозчыкаў свой раней перавезены тавар. Высветлілася, што знаёмства ў іх «шапачнае», увесь гешэфт трымаецца выключна на даверы. Адна паскардзілася, што яе перад Новым годам «кінулі» на 300 баксаў: па неасцярожнасці яна не запісала нумар машыны. Усе заезды суправаджаліся званкамі з мабільнікаў, узгадненнямі, нярвознасцю. Адчувалася, што гэта вельмі важны момант дзелавой паездкі. Нарэшце ўсё сабралі, уталкавалі і загрузіліся «пад завязку».

...І вось я грэю ногі ў чужым пледзе і вяду свецкія размовы з лепшай паловай пары, якая аказалася маёй цёзкай. Абое яны з сем'яў ваеннаслужачых, абое русакі. Бо дзе вы бачылі беларусаў, якія здольныя з'ездзіць у Вільню, каб пасядзець у якой-небудзь кафэшцы?! Да таго ж іх дзеці жывуць у Еўропе, і яны ўсю яе скалясілі ўздоўж і ўпоперак. Ён працаваў на тэлебачанні, яна філолаг, так што агульныя тэмы знайшліся.

Каб не заснуць, кіроўца ўключыў музон. Кажуць, ён ездзіць праз дзень і не паспявае адпачыць. Жанкі звоняць мужам і памочнікам, якія будуць іх сустракаць на стаянцы. Праз месяц яны паўтораць свой тур у Польшчу, або ў Літву, або яшчэ куды. Такі ў іх хлеб — экстрэмальны, з бяссоннымі начамі і дарожнымі нязручнасцямі, з фізічнымі перагрузкамі і страхам пры перасячэнні мяжы, з узаемападтрымкай і ўзаемадапамогай — іначай нельга.

Разгрузка адбылася куды хутчэй, чым загружалі. Мне здалося — вокамгненна. Мае новыя знаёмыя тапталіся, не знаходзячы сваю паўпустую сумку. Нарэшце яна адшукалася ля чужой машыны, і яе радасна «із'ялі». Дадому мы паехалі на таксі разам, бо яшчэ ж і жывём у адным раёне. І толькі назаўтра Галіне №2 прыйшла ў галаву простая і запозненая геніяльная думка: чаму мы ў Беластоку не ўзялі таксі і не паехалі паглядзець горад? Навошта падгадзіліся быць заложнікамі сітуацыі? Што ж. На ўсё трэба досвед. Чаго-чаго, а досведу і ўражанняў мы прывезлі цэлае бярэмя — і не пашкадавалі, што адважыліся на зімовы шопінг.

ПЕРАЖЫТАЕ

# «І СПЫТАЦЬ НЯМА З КАГО…»

Ніна БУЛАЎКА

**…У 1931 годзе ў сваёй роднай вёсцы Купіск пайшла ў школу ў першы клас. Школа была новая, у ёй першымі вучнямі сталі мы. Пачалі вучыць па-беларуску, а літары — лацінкай.**

Паступіць у гімназію было складана, бо цяжка бацькам плаціць за вучобу. З нашай Любчанскай сямігодкі пяць дзяўчат паехалі вучыцца ў гаспадарчую школу за Ліду, недалёка ад Жалудка. Там нейкая пані Лясковіч адкрыла прыватную школу. Туды падалася і я разам з іншымі. Казалі, што пасля заканчэння праз тры гады будзем працаваць у дзетсадзе. Увогуле ж грошы выкінулі на вецер.

Прыйшло 17 верасня 1939 года. Як казалі, вызвалілі нас ад панскага іга. Нашу вучобу прыраўнялі да шасці класаў савецкай дзесяцігодкі. Усё пачалося па-новаму. Вучыліся да вайны ў Любчы ў 6 і 7 класах. Жылося нам весела, толькі адзець і абуць не было чаго…

На трэці дзень пасля пачатку вайны ў нашай мясцовасці на матацыклах паявіліся немцы…. Патокам ішлі людзі. Казалі, што з аэрадрома, які будаваўся ў Лідзе. Стваралася ўражанне, што ніхто не ведаў, хто і куды прабіраецца. Усе — на ўсход: салдаты-акружэнцы, зняволеныя з турмаў, бежанцы…

Фронт пакаціўся на ўсход. Дзесьці ў лютым 1942 года арганізавалі ў Навагрудку шасцімесячныя настаўніцкія курсы. Падаліся на іх амаль усе, хто хадзіў у Любчанскую школу… У Навагрудку адкрылі настаўніцкую семінарыю. Напачатку — на два курсы. Мне вельмі хацелася трапіць туды, але тых, хто вучыўся на шасцімесячных курсах, прымушалі працаваць у школе, а ў семінарыю не дапускалі.

Мне дапамаглі ўладкавацца ў бухгалтэрыю, да нейкага дзядулі, і я з ім вяла ўлік прадуктаў, якія здавалі ў інтэрнат навучэнцы, што пражывалі ў ім. Днём ён пускаў мяне ў клас, і я паступова стала навучэнкай другога курса. Гэта недзе ўжо ў другім паўгоддзі.

Я вельмі адстала, вучылася няважна, можна сказаць, што кепска. Да таго ж пастаянным быў страх. Кругом беды: кагосьці забілі немцы, кагосьці павезлі ў Германію… Паявіліся партызаны. Словам, трывог і хваляванняў дастаткова. Нас, навучэнцаў, у Германію не бралі. Адной думкі пра яе мы вельмі баяліся. Калі бачылі немцаў каля семінарыі, то стараліся ўцякаць. Большасць трымалася семінарыі, каб не павезлі ў немецкую няволю.

Як бы там не было, я перайшла на трэці апошні курс. Якраз у семінарыі арганізавалі Саюз беларускай моладзі (СБМ). Прымушалі нас запаўняць анкеты, каб мы сталі яго членамі. Гэта было нашае няшчасце. Спачатку не надавалі гэтаму значэння, а потым стала трывожна, хаця, як нам тады здавалася, нічога злачыннага не зрабілі.



У 1944 годзе закончыла трэці курс, атрымала дыплом. Неўзабаве нас вызвалілі савецкія войскі. Зноў была дома. Праўда, летам нашу вёску спалілі. Дом наш згарэў, а хлеў ацалеў. У яго перайшлі жыць. Маёмасць усю знішчыў агонь.

Набліжаўся снежань 1944 года. Пайшлі чуткі, што каго-нікага арыштавалі. Узнікала недаўменне: за што?

А 18 снежня 1944 года прыйшлі ў клас, дзе я вяла ўрок, і забралі мяне…

Завярнулі дахаты, нешта шукалі, але нічога не знайшлі. Павезлі ў Любчу, дзе змясцілі ў камеру папярэдняга зняволення.

Была ўжо ноч. У камеры набілася шмат людзей. Былі і знаёмыя. Я амаль усю ноч праплакала. Раніцай выклікалі на допыт. Следчы па прозвішчу Чапец спытаў, ці была я ў СБМ падчас вучобы ў семінарыі. Ашукваць я не ўмела, таму і сказала: «Так, была…».

Нас трымалі ў КПЗ да 25 снежня, а ў гэты дзень пагналі пехам у Навагрудак у турму. Самі канваіры ехалі на конях вярхом.

У Навагрудку ў камеры, куды кінулі мяне, было шмат дзяўчат, былых навучэнак семінарыі. Усе яны былі членамі СБМ.

Мы ўсе думалі, што неўзабаве адпусцяць дахаты. На допыты выклікалі ўначы, напэўна, разы два.

З Навагрудка прывезлі ў Навальню. Падагналі састаў вагонаў-цялятнікаў і пагрузілі нас туды: цесната, адзін на адным, холадна і галодна. Я сядзела на верхніх нарах і ў маленькую шчылінку-акенца ўбачыла, што ідзе мой бацька да вагонаў з мяшком за плячыма. Аказалася, ён нёс сухары ў турму ў Навагрудак, але там мяне ўжо не было, і ён пехам падаўся ў Наваельню. Пакуль фарміраваўся эшалон да адпраўкі, бацька дагнаў мяне. Канвой адкрыў дзверы, і я ўбачыла яго. Ён перадаў сухары і сала, а сам у вялікім горы пайшоў дахаты.

У якіх жахлівых умовах нас везлі, немагчыма перадаць словамі. Неймаверная цесната. Калі кладліся спаць, то адна адной лажылі ногі на грудзі. Параша тут жа. Усё ў вагоне абмерзла і абледзянела. Мы самі ў дрыжыках.

Мінавалі Котлас. Стаяла снежная зіма. Вось і станцыя Свецікі (ці Цвецікі?). Там наш вагон затрымалі. Нас, прыкладна чалавек 100, пагналі ў лесанарыхтоўчую калонію № 21. Змясцілі ў асобныя баракі.

Пасля агляду камісіі мне далі першую групу па здароўі. Гэта азначала, што мне належыць цяжкая фізічная праца. Паслалі на пагрузку лесу.

Пад канвоем мы гуськом ішлі ў лес. На сабе неслі вяроўкі для пагрузкі бярвёнаў, сякеру, пілу. Ішлі туды, дзе былі пададзены вагоны-паражняк у тупік. Заданне — на чатырох пагрузіць вагон.

Аднойчы галава закружылася, і я ўпала ўніз з шостага рада. Ударылася галавой аб рэйкі. Ледзь жывую на падводзе прывезі ў зону ў санчасць. Лёсам было наканавана выжыць…

Кармілі вельмі кепска. К вясне мы пахудзелі, чапляліся за галінкі і падалі. Я была вагой 42 кг, а група мая па здароўі стала трэцяя.

Неўзабаве пасля Вялікадня дайшла да нас вестка, што закончылася вайна. Было шмат радасці. Мы думалі, што адпусцяць дахаты. Але па-ранейшаму ні следства, ні суда.

У гэта лета мяне перавялі ў новае месца — Урдому. Там будавалі воданапорную вежу. Я і Аня Плейша (яна з-пад Стоўбцаў) пілавалі дровы ўручную для экіпіроўкі паравоза. Працавалі ў зоне ачаплення. Было цёпла і вальней. Тут мяне выклікалі на допыт. Іх, следчых, было пяць чалавек. Усё пыталі пра БСМ. Я вельмі плакала і мітусілася. Адзін сказаў: «Масква слязам не верыць». Я заўважыла, што мая асабістая справа амаль пустая: падшыты толькі адзін ліст. Мне ставілі ў абвінавачванне, што я была дружынавай у Карэлічах. Але гэта — поўная хлусня. У Карэлічах я не была ніколі па сённяшні дзень. Хто гэта прыдумаў, я зразумела, калі мяне спыталі, ці ведаю адну асобу. Я адказала, што ведаю. Гэта была сяброўка па вучобе ў гімназіі ў Навагрудку з суседняй вёскі. Потым яна ўступіла ў партыю і добра ўладкавала сваё жыццё: працавала ў школе.

Пасля гэтага зноў пацягнуліся дні без надзеі… Летам 1946 года ў барак прыйшоў нарадчык і абʼявіў, што мне прывезлі тэрмін. Мне стала кепска, я страціла прытомнасць. Гэта ўжо другі раз. Аказалася ў бальніцы. Мяне лячылі, угаворвалі, а я ўспомню, што асуджаная, і мне зноў дрэнна… Урэшце прынеслі маленькую паперку, што я асобай нарадай у Маскве асуджана па 58 арт.4 тэрмінам на чатыры гады. Паабяцалі, што пашлюць на датэрміновае вызваленне і дадуць пропуск на свабодны выхад з зоны. Я ж усё пісала просьбы і скаргі Калініну, нават самому Сталіну. Нічога ў адказ не атрымала.

Наступіў верасень 1948 года. Прыйшоў у брыгаду, дзе я замярала драўніну ў лесарубаў, канвой і павёў мяне ў зону. Адтуль накіравалі на станцыю Мікунь у цэнтральную калонію, дзе змясцілі на перасыльны пункт. Сказалі, што тыя, каго вызвалілі па арт. 58, падлягаюць вывазу на пасяленне ў ссылку.

З Поўначы нас везлі да Кірава. Тут сядзелі ў камеры. Умовы жахлівыя. Заядалі клапы; мучылі голад і невядомасць…

Яраслаўль праехалі ўначы. Потым — Свярдлоўск. Тут кінулі ў турму. Вельмі моцна балелі ногі і паясніца. Не знаходзіла сабе месца. У камеры цесна, верхнія і ніжнія нары забіты людзьмі. Прывялі да нас зладзеек і блатных. Яны давай шукаць што ў каго ёсць з харчоў. У літовак, якія, напэўна, ехалі з дому, забіралі мяшкі з сухарамі і салам. У нас, хто ехаў з лагера, нічога не было…

У снежні прыехалі ў Петрапаўлаўск Паўночна-Казахстанскай вобласці. У абласным аддзяленні МДБ нас палічылі па картачках, далі па 5 руб., адвялі ў нейкае памяшканне. Я з Мікуні ехала з жанчынай Аняй з-пад Маладзечна (мястэчка Лебедзева). Вельмі прыгожа спявала. Абвінавачвалася таксама за членства ў СБМ. Вось мы ў дарозе ўвесь час пільнаваліся адна адной і разам прыбылі ў ссылку ў Казахстан.

На другі дзень нас на грузавой машыне з Петрапаўлаўска прывезлі вечарам у сяло Багалюбава. Перапісалі і сказалі, што кожныя дзесяць дзён мы павінны прыходзіць адзначацца ў аддзяленне МДБ, бо з'яўляемся ссыльнымі.

У першы дзень нам далі аванс. Здаецца, па 75 рублёў. Давід Сважэнскі (наш знаёмы начны вартаўнік канторы) прывёз хлеб. Сталі шукаць кватэру. Давід днём быў за конюха, і ён меў у распараджэнні валоў. Ён адвёз мяне з Аняй у адно месца, а там пляцень замест сяней, падпол адкрыты, вокны адразу над зямлёй павыбіваныя — словам, зямлянка. У ёй жыць немагчыма.

— Адвязу вас, дзяўчаты, — кажа Давід, — да сваёй гаспадыні. У ногі падайце, прасіце любы куточак у хаце, і сэрца не разжаліцца.

Так і атрымалася. Бурчала і адмаўляла нам цёця Саша Звягіна. Але прыняла ў сваю маленькую хацінку. Сама на печку, а мяне з Аняй на ложак. Давід уначы дзяжурыць, і яшчэ адзін стары ссыльны на куфэрку прытуліўся…

Аня пачала прыносіць работу на вечар на кватэру. Ёй закройшчыца давала больш выгадную, каб зарабіла грошай. Купілі бульбы, малака марожанага. Стала лепей з ядой.

Сталі хадзіць у клуб на танцы з мясцовай моладдзю. Народу тут было рознага. У асноўным ссыльныя. Мясцовыя хлопцы і маладыя мужчыны загінулі на фронце. Старыя толькі горка аплаквалі сваіх дзяцей. Помню сям'ю Смалянінавых, якая атрымала чатыры пахавальныя: з фронту не вярнуліся чатыры сыны.

Летам мяне зноў выклікалі ў аддзяленне МДБ. Прапанавалі быць асведамляльнікам. Інакш кажучы, даносчыкам. Маўляў, робіш у канторы, маеш кантакты са ссыльнымі і будзеш паведамляць пра іх. Зноў палохалі і лаялі, трымалі позна па вечарах — усё ўгаворвалі. Ужо думала што-небудзь з сабой зрабіць…

Такія допыты-ўгаворы цягнуліся доўга. А я ўсё плакала. Гаварыць мне не было чаго.

У сакавіку 1953 года памёр Сталін. На плошчы ў Багалюбава быў мітынг. Па радыё выступалі Малянкоў і Берыя. Усе плакалі. Плакала і я. Не прытваралася, а душой шкадавала яго.

Час бег. Ужо справа ішла к вясне 1954 года. Раптам выклікалі ў аддзяленне МДБ і абʼявілі, што нас вызваляюць ад ссылкі. У гэты дзень далі вольную 27 чалавекам. А неўзабаве на цаліну сталі прывозіць моладзь.

Я ўжо прывыкла да мясцовасці і людзей і магла б жыць у Казахстане. Дамоў ужо не надта і хацелася. Я думала: а дзе я ў Беларусі дзенуся? У мяне ж ніякіх дакументаў. Куды ўладкуюся на работу? Ясна было, што мяне ніхто нікуды не возьме…

Але настаяў муж ехаць у Беларусь. І мы ў чэрвені 1954 года прыехалі ў Купіск. Бацькі працавалі ў калгасе, жылі бедна; хата яшчэ не была поўнасцю закончана. Зрабіла спробу ўладкавацца на работу ў Нягневічы ў МТС у бухгалтэрыю. Дакументаў ніякіх не было. Усё забралі ў аддзяленні МДБ. Толькі працоўная кніжка з Багалюбава і характарыстыка. Праўда, вельмі добрая. Але нічога не выйшла. Маўляў, былая ссыльная, і сакратар партарганізацыі запратэставаў. Пра школу не было чаго і марыць. Так засталася дома…

…У пачатку 90-х паслала заяву, каб мне далі даведку аб рэабілітацыі. Патрэбна была для ўдакладнення стажу для пенсіі. Выслалі, што заключэннем пракуратуры Гродзенскай вобласці пастанова Асобай Нарады пры міністры ўнутраных спраў СССР ад 27 сакавіка 1946 года, па якой я асуджана па арт. 58.4 КК РСФСР да чатырох гадоў выпраўленча-працоўных лагераў, адменена і справа ў адносінах мяне вытворчасцю спынена за адсутнасцю ў маіх дзеяннях састава злачынства па палітычных матывах. Знаходзілася ў месцах пазбаўлення волі з 17 снежня 1944 года па 22 кастрычніка 1948 года. Пра ссылку нічога не сказана. Пазней пасля майго звароту ў МДБ Паўночна-Казахстанскай вобласці прыслалі архіўную даведку, што я на падставе нарады МДБ СССР ад 2 верасня 1948 года №18/30-118506 (артыкул не указаны) выслана на пасяленне (тэрмін не указаны). Прыбыла ў ссылку ў Прышымскі раён Паўночна-Казахстанскай вобласці з в. Купіск Баранавіцкай вобласці. (Усё хлусня. Павезлі з Поўначы з лагера.) Вызвалена з ссылкі-пасялення 8 мая 1954 года. Даведка дадзена на падставе спіса на знішчэнне асабовых спраў ссыльных. Маю справу знішчылі ў 1970 годзе.

Вось так. Пішу і плачу. Скалечанае, змучанае, разарванае жыццё сыйшло, і спытаць няма з каго. Ужо ў глыбокай старасці, на краю магілы думаю: за што гэта нас мучылі, адабралі маладосць, лепшыя гады?..

Публікацыя Яўгена ЛЕЦКІ

АГЛЯД

# «ХАЙ РАДАСЦЬ НАРОДЗІЦЦА ТАМ, ДЗЕ НЯМА ДЛЯ ЯЕ ПРЫЧЫНЫ»

ЛеГАЛ

**Для назову абраў вершаваную цытату з Чэслава Мілаша. Аднак агляд пачну з прозы, бо менавіта яна вызначае мастацкую вартасць літаратуры чарговага, 51 нумара часопіса «Дзеяслоў».**

Калі гаварыць, зыходзячы з нашай ментальнасці, то можна сказаць, што проза агулам добротная, заўважыўшы пры гэтым, што кожны прадстаўлены твор сам па сабе выразны і адметны. Ёсць паслядоўная традыцыйная лінія (В. Карамазаў), спавядальна-дзённікавая (С. Адамовіч) і фармальна-эксперыментальная (У. Бубен). Чытаючы гэтыя творы цікава было разважаць над тым, як прэпарыруецца характар і ментальнасць беларусаў: знутры (рускім мастаком у Беларусі), звонку (беларусам-выгнаннікам у Нарвегіі) і ў паралельным свеце (пацуком Шуршэвічам, які шукае свайго сярод сваіх)...

Новы раман **Віктара Карамазава** называецца «Мастак і парабкі». Тыя, хто ведае творчасць гэтага пісьменніка, адразу пазнаюць яго ўлюблёную тэматыку. Шмат блізкіх да біяграфічных твораў напісана В. Карамазавым пра мастакоў, якія звязалі сваё жыццё з Беларуссю. Не выключэнне і гэтая аб'ёмная проза. Аказваецца, вядомы расійскі мастак Мікалай Неўраў (аўтар карціны «Гандаль») жыў, тварыў і скончыў жыццё самагубствам у беларускай вёсцы Лыскаўшчына, што непадалёк ад Друцка. Маляваў ён пераважна прыгонных сялян, іх партрэты і побыт. Вось што піша ў прадмове да рамана сам аўтар: *«Мне хацелася ўбачыць мастака такім, якім ён быў у нашай вёсцы — псіхолагам, рэалістам-народнікам, чалавекам высокай культуры, вялікай душы і мужнай шчырасці, творча актыўным і годным перад любой сілай і ўладай — убачыць мастака ў асяроддзі тагачаснай беларускай прыгнечанасці і пакоры, выявіць яго рэакцыю на небяспеку, якую нясе ў сабе памяркоўнае суіснаванне агіднага дэспатызму і вольнага творчага духу».*

Мяркуючы па першай прачытанай частцы рамана, гэта ў пісьменніка ў асноўным атрымалася. Густая «пташнікаўская проза», засяроджанасць на дэталі і пэўнай думцы, ды няспешны-расцягнуты сюжэтны ход ствараюць своеасаблівую манатонную аўру пазнавальнай карамазаўскай творчай методы. Выратоўваюць чытача ад расслабленасці і одуму вельмі натуральна выпісаныя дыялогі, якія надаюць твору жыццёвай дынамікі і прасторавай рухавасці. Варта чакаць працягу публікацыі рамана.

У гэтым жа нумары завяршаецца друкаванне першай кнігі рамана **Славаміра Адамовіча** «Цана Еўропы, альбо Гісторыя Вільмана». Трэба сказаць, што гэтая частка больш чытэльная, чым папярэдняя, да якой я паставіўся досыць крытычна, у ёй шмат трапных адкрыццяў і мастацкіх праяўленняў таленту аўтара. Непрыхаваны нацыяналістычны погляд і антыглабалісцкая філасофія героя рамана, які напісаны ад першага імя, а напрыканцы, як выяўляецца, ад імя нейкага Вільмана, хоць аўтар усё ж не атрымлівае ад чытача поўнага алібі наконт уласнага «геройства». Выходзіць, што гэты постсавецкі беларускі ўцякач (герой рамана), які, атрымаўшы прытул у Нарвегіі, паводзіць там сябе даволі прыкра і агідна: крадзе, рыецца па сметніках і звалках, наўмысна набіваецца на арышты і непадпарадкаванне тамтэйшым законам, аднак жа, пры гэтым яшчэ й крытычна ставіцца да саміх, «прыгрэўшых» яго ў горкую часіну, абарыгенаў, — тым самым як бы даводзячы паспалітаму чытачу, што менавіта такой і была задумка аўтара: не баючыся прынізіць уласны твар, паказаць віткі нацягнутай спіралі чалавечых узаемаадносін у канкрэтным грамадстве і грамадзянскіх супольнасцяў у сучасным свеце. Шмат што з задумы атрымалася (ды і раман дарэшты яшчэ не скончаны), але ёсць і непаразуменні з аўтарам, якія зрэшты ніваліруюцца арыгінальнасцю і прыцягальнай шчырасцю большай часткі напісанага ім тэкста. Працытую тры адметныя месцы.

*«Нарвежскі пыл на падваконні — іншы, не наш. У сухія дні яго многа вісіць у гарадскім паветры, асядае на століках летніх кафэ. Такога бліскучага пылу ў нас няма. Наш пыл — цяжкі і тлусты, бадай, як лёс самой нацыі. Ён паўстае з нашага падзолу, з нашых тарфянікаў, бульбяных палёў і грунтаваных дарог — грунтоўны салідны пыл над Краем, які знаходзіцца ў становішчы перманентнай барацьбы.»*

*«Я не ўсміхаюся ім у адказ. Ну хіба што ў той шчаслівы момант, калі буду ўваходзіць з самаробнай бомбай у вагон перапоўненай пасажырамі электрычкі, якая ходзіць паміж аэрапортам Гардэмуэн і сталіцай Каралеўства.»*

*«Дарогі свабоды... Ёсць два генеральныя напрамкі, паводле якіх мы пракладаем гэтыя шляхі перамяшчэння. Адзін з іх — шлях да матэрыяльнай, фінансавай незалежнасці, Шлях, на якім здабываецца капітал, Прафесар. Другі — гэта пошукі Ідэі, духоўнага апірышча; гэта шлях, пракладаючы які, шукаюць Граль вызвалення, шукаюць Чысты Дух, які несувымерна мацнейшы за дух нажывы. Зразумець да якой ты дарогі падрыхтаваны, бывае складана, а то і немагчыма. І тады чалавек увогуле збіваецца з усіх дарог, арыентацыю губляе, слухае толькі элементарныя фізіялагічныя поклічы.»*

Гэта, на маё меркаванне, і ёсць «тры кіты», на якіх палягае ідэйная і мастацкая сутнасць рамана. Пабачым, пры магчымай далейшай публікацыі, чым усё гэта скончыцца. У тым ліку і для аўтара, і можа, найперш для яго.

А вось урывак *з казкі для дарослых* «Некрапацук» **Уладзіслава Бубена** парадаваў «па поўнай», як кажуць маладзёны. Чыталася з захапленнем, угадваліся паралелі з сучасным беларускім жыццём. Бадай, менавіта гэты твор я і назваў бы лепшай прозай гэтага года, выдрукаванай у «Дзеяслове»... калі б не навязлівыя асацыяцыі з «Фермай» Джорджа Оруэла. Аднак і сусветная класіка пераадольная, калі да яе ставіцца не як да чыстага перайманння, а як да мастацкага падаўжэння і ўласнай рэканструкцыі. Дзякаваць Богу, у Бубена, як мне падаецца, менавіта так і атрымалася. Таму свярбіць прага працягу...

Яшчэ з прозы выдрукаваны аповед навапалачаніна **Вінцэся Мудрова** «Нячысцік». Чытэльная рэч, але не новая, як для чытача, так і для самога аўтара, напісаная ў стылі рэтра (мяккі гумарны сарказм з часоў «загніваючага сацыялізму»). Шукшынска-дудараўскія мястэчковыя «чудзікі»-дзівакі ў сваім фельетонным амплуа.

Цікавае назіранне за жыццём сучаснага маладога чалавека-спажыўца вядзецца ў кароткім дэбютным аповедзе **Уладзіміра Садоўскага** «3.15». Але па вялікім рахунку, гэта ўсё ж не апавяданне, а хутчэй нататка, абразок-развага, сутнасць якой можна было б укласці ў два–тры сказы (*бессюжэтнае жыццё,* відаць, мажлівы намёк на «бяздумны электарат»). Аднак, калі малады аўтар і надалей практыкавацьмецца ў пошуках *складанага ў простым,* абапіраючыся пры гэтым на ўласны жыццёвы вопыт, — будзе плён.

З паэзіяй — прасцей, калі гэтая прастата ад таленту. Вось і **Уладзімір Арлоў** апошнім часам усё часцей выступае з вершамі, але гэта не ад прастаты быцця, а ад складанасці ўласнага жыцця, духоўных і душэўных пэратурбацый. І вершы, як ні дзіўна для яго ўзросту, — пра каханне. Праўда, нізка названая «На поўнач ад кахання». Намёк на пахаладанне ці што... Бо самі вершы дастаткова імпульсіўныя, арыгінальныя ў сваім зародку і пасыле, хоць і сюжэтныя, аднак, дастаткова лірычныя, каб быць прылучанымі да паэзіі. Іх ратуе мяккая аўтарская іронія ды мастацкая правакацыйнасць, што прыцягвае ўвагу чытача, робіць яго прыхільнікам творчасці паэта. А гэта нешта ды значыць. Праўда, часам, напружвае выкарыстанне слэнга і нецэнзуршчыны, якая ў сучасных «раскручаных» аўтараў пастунова перарастае ў фізічную, а то і душэўную хваробу. Дарэчы, верш «Сэкс прыдумалі зулусы», на мой погляд, не больш як іранічны рэчытатыў-рэфрэн, разлічаны на прыцягальнасць маладой чытацкай публікі да вульгарнай, заяўленай у загалоўку, тэмы. Уласна я прапанаваў бы чытачам звярнуць увагу на верш «Дзяўчына з касой», які сваёй мастацкай цнатлівасцю і метафарычнай глыбінёй перавагжвае шмат **што** з паэтычных публікацый гэтага нумара. І гэта паказчык адмысловага таленту У. Арлова.

Вершы **Васіля Зуёнка** — простыя і зямныя, як неба і трава. Нібыта кінуты пранізлівы позірк чалавека за бязмежны далягляд, які глыбінна зніставаны з зямлёй, нераўнуючы, як громаадвод. На гэтых «выскураных» творах паэта ляжыць пячатка канкрэтнага чалавечага жыцця і вечнага зямнога быцця ў самаадноснасці і ўзаемапранікненні. Аўтару гэтую думку ўдалося выказаць больш афарыстычна: «І без крыжа пустое неба...».

Вершы **Валярыны Куставай** уразілі высокай энергетыкай і хаатычнай аляпаватасцю (часткa лішняга пару, як казалі раней, ідзе ў свісток). Часам, чытаючы яе вершы, складваецца ўражанне, што яны «нараджаюцца» паэткай залішне паспешліва (з пэўнай прыхамаці), і *выходзяць* на свет неданошанымі да тэрміну свайго натуральнага з'яўлення. Але ёсць і адметныя творы, скажам, верш «Званок шчасця», які *рэабілітуе* талент Куставай. Вось яго заключная страфа:

*Перадайце, калі ласка, шчасцю,*
*што гэта яго апошні шанец:*
*альбо цяпер,*
*альбо я знайду штосьці іншае —*
*і хай потым не прыходзіць*
*сярод ночы,*
*не просіць упусціць*
*патлумачыцца.*
*Не адчыню.*
*Гэй, хто ўбачыць, —*
*перадайце шчасцю:*
*няхай тэрмінова патэлефануе!*
*Гэта яго апошні шанец!*

Думаю, менавіта з падобнымі ўдачамі ў В. Куставай ёсць надзея і на ўласнае паэтычнае шчасце.

Яшчэ ў нумары публікуюцца вершы **Ларысы Раманавай** (своеасаблівая лірыка ўяўнага свету, які не згарманізаваны мастацкімі сродкамі сучаснай камунікацыі: *«зберагае павук успаміны пра сны ды сны успамінаў»*). А таксама — дзіўныя ва ўсіх сэнсах (зместу і формы) «лірычны ружанец» **Міколы Касцюкевіча,** з духоўным зместам якога аўтару трэба было жыць і выжываць, іначай не напісалася б тое, што напісалася...

Па-свойму цікавы вершаваны дэбют **Уладзіміра Плавінскага.** Сучасны па форме і стылю паэт, з трохі *паказной* інтэлектуальнасцю. Адзін верш даволі адметны («Цырымонія, фестываль, Оскар»). Будзе з чалавека паэтычны толк. Але тады, калі малады аўтар, як ён сам зазначае, будзе пісаць *«не парушаючы нормаў распусты».*

У дэбютных тэкстах **Яўгеніі Носаравай** ёсць таксама адзін удалы маленькі верш, як першая пераадоленая прыступка ў вялікі свет паэзіі. Працытую:

*Хачу дадому.*
*Назбіраю дзьмухаўцоў*
*сівых. Палячу.*

Яшчэ адзін дэбютант **Аляксей Абрамчук** пакуль піша вершы для сябе, але, на ўсякі выпадак, паказаўся чытачу сваімі пакуль няпэўнымі абрысамі твару. Трэба маладому аўтару, як любіць казаць М. Вайцяшонак, *трудзіць душу.*

Нельга абысці ўвагай і вельмі годную публікацыю да 100-гадовага юбілею нобелеўскага лаўрэата і блізкага нам па духу польскага паэта **Чэслава Мілаша.**

Мяркую, з цікавасцю будуць прачытаныя вершы, якія не ўваходзілі ў кнігі, са спадчыны паэта і празаіка **Міколы Купрэева** (прадмова Л. Галубовіча). Не пакінуць чытача абыякавымі і сабраныя **Сяргеем Шапранам** матэрыялы пра кінадраматургічны лёс Васіля Быкава, прынамсі яго праца над сцэнарыем фільма «Трэцяя ракета». Своеасаблівае эсэ **Алеся Твархновіча:** «Блышыны рынак» у Берліне, дзе развагі-асацыяцыі аўтара, звязаныя з прамінулай вайной, тонка пераплецены з сучаснай явай — збытам шырпатрэбу вялікім мноствам людзей розных нацыянальнасцяў і поглядаў, якія ў выпадку новай вайны, магчыма, зноў будуць... забіваць адно аднаго...

У рубрыцы «Словы» **Сяргей Масквін** у сваім арыгінальным стылі гутарыць з паэтам Сержам Мінскевічам. Пісьменнік **Анатоль Бутэвіч** дзеліцца «юбілейнымі рэфлексіямі» з нагоды 75-годдзя з дня нараджэння незабыўнага Барыса Сачанкі. Тут жа змешчаны даволі «эксклюзіўныя» успаміны яго дачкі, пісьменніцы **Галіны Багданавай** пра жыццё бацькі і ўсёй творчай сям'і Сачанкаў. Друкуецца гутарка **Кацярыны Безмацерных** з мастакамі Ігарам Рымашэўскім і Людмілай Шчамялёвай.Змешчаны пачатак літаратурнага артыкула **Яўгена Лецкі** да творчага партрэта Вячаслава Адамчыка «Зрухі жыцця і літаратуры». У рубрыцы «Крытыка» друкуюцца рэцэнзіі **Леаніда Галубовіча** «Ад поўні — да поўдня» (на кнігу Міхася Скоблы «Акно для матылькоў») і **Алесі Лапіцкай** «Песня мястэчку» (на зборнік апавяданняў Міхася Андрасюка «Вуліца Добрай надзеі»). Завяршаецца нумар вершаванай сатырай **Алеся Няўвеся** і афарызмамі «Мімавольныя думкі» **Алега Аблажэя** (вельмі сціслая, але ёмкая публікацыя, якую раю не прагарнуць, асабліва занудлівым і бюракратычна скроеным людзям (як па мне, дык сустракаюцца зацемы, часам нічым не горшыя, чым, бывала, у самога Ежы Ленца). Ну вось хоць бы гэта:

*«Некаторым людзям не гаварыць добрых словаў.*

*Ашчаджаюць для некралогаў».*

Бадай, на гэтай, небяспечнай і грэшнай для літаратурнага крытыка, думцы і спынімся.

НАТАТКІ

# ХАДЖЭННІ ПА «БОЖАЙ ЗЯМЛІ»

Валерый СТРАЛКО

**Кастрычнік 2010-га. Востраў Готланд (Швецыя). Галоўны горад вострава — Візбю. Тут — Балтыйскі Цэнтр пісьменнікаў і перакладчыкаў. Гаспадыня (дырэктрыса) Цэнтра — Лена Пастэрнак з бліжэйшым памочнікам Патрыкам і некалькімі супрацоўніцамі дзейнічаюць клапатліва, амаль непрыкметна, а лепшых умоў для творчасці дый адпачынку ў Цэнтры нам, часовым пастаяльцам з розных краінаў, цяжка і жадаць.**



Фота аўтара



***

З вакна адкрываецца фантастычна прыгожая панарама старажытнага горада. А далей — «сіняе мора, белы параход»… Пачаў ненадоўга выскокваць на вуліцу, адыходзячы ўсё далей, захоплена, але чамусь крыху насцярожана, узірацца ў незнаёмае, фатаграфаваць. Ды нешта скоўвала, замінала. Вяртаўся. Зноў шыбаваў уніз, да мора, не даходзячы аднак да яго, пакідаючы гэта на пазней. Усё больш падабалася бачанае, бо з дзяцінства цягнула туды, дзе сівыя скалы, лес, мора, старажытнасці. Сюды б сваіх, сюды б усіх, хто душу грэе, каб разам… Вось адкуль няёмкасць. Бы пранізала. І тады я ўхапіўся перапісваць тэлефонную запісную кніжку. Гады з тры насіў старую, што ўшчэнт рассыпалася, і новую, якая пачала таксама старэць. Старонкі дзве раней неяк агораў. А далей — хоць забі… Цяперака — аж засвістала. Кожнага з любоўю прапісваў я тут, на гэтай мілай зямельцы. І тых, каго ў кніжцы не было… Палягчэла… Павітацца з морам пайшоў я ўжо не саматою…

Старэчая сентыментальнасць?.

***

Яшчэ ў Менску, ды й тут спрабаваў хоць трохі разабрацца, што ж гэта за край, куды ласкава і нечакана закінуў мяне лёс.

Дык вось… Востраў Готланд (Gotland) азначае «Зямля готаў», бо менавіта готы, як сведчыць гісторыя, адны з першых асвоілі і абжылі гэты немалы, у тры тысячы квадратных кіламетраў, кавалак сушы. Але тым, хто пабываў, больш да душы была б назва вострава з двума «t» (Gottland), што з нямецкай — «Божая зямля», бо столькі там прыгожых мясцін, столькі цікавага, прыемнага, людскага! Канечне, у кастрычніку і кветак меней і фарбы крыху не тыя, чымсьці летам. Сапраўды, дзе-нідзе пачынаюць ужо прабівацца плямы аранжавага і жоўтага адценняў. Ды зелені пакуль хапае. Ружы таксама ўпэўнена палымнеюць, цягнучыся іншым разам проста з-пад брукоўкі да вакон утульных старажытных будыначкаў. А ў невялікім батанічным садзе Візбю яны яшчэ, быццам, і не думаюць пра восень. Тое ж — і ў нягуста раскіданых па тэрыторыі вострава, дбайна дагледжаных сядзібах.

***

Праз пару дзён па прыездзе гадзіне а дзявятай раніцы падыходжу да дзвярэй нашага суседняга корпуса, як з крыкамі «Panie! Panie!» падлятае да мяне польская пісьменніца Ева. Уся дрыжыць, няёмка ўсміхаецца. Выйшла а сёмай рабіць зарадку, а ключ забылася. На радасцях вызвалася мне, збавіцелю ад холаду, і літоўскай перакладчыцы Юратэ паказаць цікавыя мясціны вострава. У Евы тут уласнае аўто. Назаўтра па шашы №140 мы пракаціліся добрую сотню кіламетраў да самай паўднёвай кропкі Готланда, час ад часу рыскаючы ўбакі, каб аглянуць тую ці іншую славутасць. Цікава было бачыць дагледжаныя дарогі, ляскі і пералескі, палі, невялічкія мястэчкі, хутаркі, сэрвісныя комплексы, кемпінгі… Усё гэткае стацыянарнае, дасканалае, завершанае, будпляцовак не відно. Сімпатычнае ўражанне пакінула царква (kyrka, чытаецца па-шведску — чурка) звонку і знутры, з яе акуратным цвінтарам навокал; хвалююча было ў іншым месцы адведаць старажытнае (500 год да н. э.) пахаванне ў выглядзе 20-мятровага ў даўжыню і метры 3-4 шырынёю контура ладдзі, выкладзенага з валуноў. Цікава, што гэта пахаванне аднаго чалавека, а не, скажам, каманды нейкага загінулага карабля. Каля аднаго з кафэ, дзе перакусвалі, сустрэў скульптуру каменячоса, фотадымак якой бачыў гадоў 40 назад у часопісе «Амерыка». Уразіў масіў гіганцкіх ветравых энергетычных установак, якія дзелавіта вымахвалі сваімі лопасцямі-крыламі. Вярталіся дзеля разнастайнасці амаль паралельнаю да 140-й шашою 142...

***

…Звыш года таму я змушаны быў узяцца за хадзьбу і бег. Сёлета не толькі трэніраваўся, а й удзельнічаў у сур'ёзных рэспубліканскіх і міжнародных спаборніцтвах па працяглыя, у тым ліку і марафонскія адлегласці, займаў нават прызавыя месцы ў сваёй узроставай групе (каму за 70). З такімі «напрацоўкамі», відома ж, цяжка было ўтрымацца, каб па прыездзе на месца не пусціцца ў паходы па Візбю і ў радыяльных ад яго напрамках. Канешне, падахвочвала на падарожжы і звычайная цікаўнасць. Пратупаў на працягу 28 дзён сумарна звыш 300 км, адыходзячы на 10, 20, а то і больш кіламетраў ад горада. Умоўна — абышоў Готлад па перыметру. У вандроўках сустракаў процьму незнаёмага, нязвычнага, незвычайнага.

***

Хадзіў я на Готландзе не толькі па глухіх, рамантычных сцежках, дзе пападаў часам у розныя пераплёты (аднойчы, напрыклад, ледзь не сарваўся са скалы), але й па дагледжанай шашы, балазе на аўтатрасах адлегласці пазначаны. Двойчы без прыпынку цягам аднаго дня праходзіў нават крыху болей ад класічнай марафонскай дыстанцыі (43 і 45 км). Спачатку на ўсход. У 20 км ад Візбю, углыб вострава, на мапе выявіў мястэчка з назваю Roma. Загарэўся. Вельмі ж спакуслівa пабываць у Рыме, калі ён не за тысячы кіламетраў, а нечакана зусім побач! Дайшоў, пабываў, пракрочыў крыху і за межы гучнага населенага пункта… Вяртаюся, падыходжу ўжо пры ліхтарах да Цэнтра, ды чамусьці сустракае з дальняга паходу небараку-марафонца дырэктрыса Лена Пастэрнак і… вачам сваім не веру — пасол Швецыі ў Беларусі Стэфан Эрыксан! Я аслупянеў, а спадар Стэфан цісне мне радасна руку. Выявілася, што ён заходзіў у Цэнтр яшчэ ў полудзень, каб пабачыцца са мною. Мабыць, яму было цікава даведацца, як пачуваецца грамадзянін і жыхар Беларусі ў яго краіне, ў яго дзяржаве. А радаваўся ён, мабыць, яшчэ й таму, што змог так мяне ашаломіць нечаканым сваім з'яўленнем. Вось гэта прыз за «марафонскі дэбют» у Швецыі, вось гэта гонар, вось гэта пашана адпетаму бадзягу!. Так падмывала думаць. Насамрэч атрымалася, што Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Швецыі ў Рэспубліцы Беларусь прыляцеў у Візбю на нейкую сур'ёзную канферэнцыю ці нараду, ды адначасова неафіцыйна здзейсніў яшчэ адну добрую справу. Шкада, што ён вельмі спяшаўся, і выпала мала часу нам на гаворку. Аднак парадавацца фантастычнай сустрэчы, перакінуцца некалькімі беларускімі фразамі (на здзіўленне дырэктрысы) і пагарачаць соладка мы паспелі...

***

Швецыя займае плошчу 411 тыс. кв. км, удвая большую за плошчу Беларусі, а Готланд, складаючы меней працэнта ад усёй тэрыторыі Швецыі, з'яўляецца найбольшым востравам краіны дый усяе Балтыкі. Што датычыць памеру плошчы, сутыкнуўся з незразумелым: у нашых, няхай не самых новых, даведніках яна раўняецца 2960 кв. км, а ў новых шведскіх крыніцах — 2994 і 3140 кв. км. У чым справа? Не магла ж плошча павялічыцца сама па сабе, гэта, мусіць, звычайная памылка. Можа, і не выпадковая: савецкія вучоныя з лёгкасцю маглі занізіць паказчык (на зло буржуям!), а шведскія патрыётывучоныя, можа, не супраць былі хоць віртуальна павялічыць уладанні сваёй любай краіны.

Аднак выплыў і трэці, цалкам верагодны варыянт… Апошні ляднік меў над Готландам таўшчыню лёду 2 км. Ён так сплюшчыў гэты ладны кавалак сушы, што калі лёд растаў, узяўся востраў, бы сціснутая губка, выпростацца, падымаць галаву. Нават цяпер, калі пасля звальнення ад лядовага панцыра прайшла добрая сотня вякоў, Готланд у год «падрастае» болей чым на сантыметр, павялічваючы тым самым сваю тэрыторыю. За нейкіх 50–70 гадоў вынік можа скласці метр і болей! А гэта «выліваецца» ў дзясяткі, а то і сотні квадратных кіламетраў дадатковай плошчы, калі ўлічваць звілістую, часам нізінную, берагавую лінію і тое, што Готланд распасціраецца ў даўжыню кіламетраў на 130, а наўшыршкі дасягае 50 км. Магчыма, шведы скарысталі апошнія дадзеныя сваіх вучоных.

***

Готланд людзі засялілі каля чатырох тысячаў гадоў таму, у тым ліку, мабыць, і мясціну, дзе цяпер Візбю з 26-ю тысячамі (на Готландзе пражывае 65 тысяч жыхароў). Назва горада, на думку гісторыкаў, азначае нейкае рытуальнае месца (капішча?) язычнікаў. Мне ж хочацца выкласці сваю прымітыўную, жартоўную версію. Уявіце сабе: да берага, на якім прыляпіліся нешматлікія невялічкія, але ўтульныя хаткі паселішча, падплываюць ладдзі з вандроўнікамі або ваярамі, славянамі ці вікінгамі, якія пабывалі на славянскіх землях і назапасілі там упадабаных слоўкаў. Убачыўшы ўтульныя жытлы, над якімі ўюцца мілыя дымкі, адкуль даносяцца пахі ежы, змучаныя выпрабаваннямі і часам барадачы, якія да таго ж знудзіліся па хатняму цяплу і жаночай ласцы, пачынаюць па аднаму, а затым ужо й хорам з нецярпеннем выгукваць: «Ізбы! Ізбы! Ізбы! Ізбы!..» Апошні гук паступова ашведзіўся, трансфармаваўшыся ў не вельмі выразнае «ю» — Візбю.

***

Прынамсі, у 13-м стагоддзі паселішча ўжо мела выгляд прыметнага па тым часе партовага горада, які гандляваў са многімі портамі Балтыкі і больш далёкіх краёў, пра што сведчаць знойдзеныя ў нашыя часы сотні скарбаў. Тады ж, пасля канфліктаў між жыхарамі Візбю і рэштаю насельнікаў Готланда, візбянамі быў узведзены навакольны мур працягласцю каля 3 км з трыма дзясяткамі абарончых вежаў па перыметры. Ёсць сведчанні, што напачатку Візбю насялялі пераважна католікі. Але

паступова канфесійныя прапорцыі мяняліся, і ў стагоддзі, мусіць, 15-м на першае месца выйшлі пратэстанты-лютэране, таму храмы каталікоў былі ці зруйнаваны, ці самі па сабе прыйшлі ў запусценне. І цяпер у Візбю можна ўбачыць з паўдзясятка старажытных храмаў (Святога Нікалауса, Святой Катарыны, іншыя), руіны якіх за кошт кансервацыі і догляду ўтрымліваюцца ад далейшага руйнавання і з цікаўнасцю аглядваюцца турыстамі.

Сёння ў Візбю галоўная пратэстантская кірха-чурка — храм Святой Марыі. Варта адзначыць, што храм гэты — буйная, велічная спаруда, збудаваная на працягу 1250–1258 гадоў і рэканструяваная ў 16 стагоддзі, дамінуе над мясцовасцю. Не кранаючыся ўнутранага абсталявання храму, хаця кідаецца ў вочы ўрачыстая прастора памяшкання і традыцыйна ўбраныя сцены і столь, адзначыў бы тое, што падлога яго высцеленая надмагільнымі плітамі, на кожнай з якіх — адпаведныя пахаванаму нябожчыку адмысловыя надпісы. Падлога-могілкі… Хадзіць па храме псіхалагічна цяжкавата. Акрамя богаслужэнняў, храм адкрыты для турыстаў, якія ахвоча наведваюць таксама і штонядзельныя арганныя канцэрты. Дзякуючы таму, што яго характэрны сілуэт можна ўбачыць практычна з любой кропкі Візбю, у першыя дні прабывання там лёгка было знайсці, снуючы па лабірынце вузкіх вулачак, найкарацейшы шлях дахаты (да Цэнтра).

* * *

Гісторыкі сведчаць, што ў канцы 14-га стагоддзя на працягу некалькіх гадоў улада ў Візбю і на ўсім Готландзе належала піратам, так званым «віталійскім братам», якія зрабілі востраў пірацкай базай усяе балтыйскай марской прасторы. Можа, з таго часу ў горадзе зарадзілася манера ці звычка (якая перарасла ў традыцыю і захоўваецца дасюль) не завешваць, нават нанач, вокны. Каб прасцей было адсачыць змову ці іншыя падазроныя дзеі гараджанаў. І тое, што кожны падваконнік упрыгожаны разнастайнымі цацкамі, ракушкамі, статуэткамі, макетамі парусьнікаў, свяцільнічкамі (раней — свечкамі), што магло б адцягнуць увагу назіральнікаў, неяк працуе на гэтую версію. Прыхільнікі ішага пункту гледжання тлумачаць традыцыю дэманстрацыяй адкрытасці пратэстантаў. Як бы там ні было, ды падваконні Візбю — гэта любоўна абладаваныя своеасаблівыя міні-музейчыкі, што вабяць і мілуюць вока.

* * *

Зацікавілася вокнамі з падваконнікамі латышская пісьменніца Андра Манфельдэ. Не маючы фотаапарата, папрасіла мяне зрабіць здымкі для яе будучай кніжкі. Дзякуючы гэтаму занятку, пазнаёміліся мы са шведам, суседам па нашай Nygatan (Новай вуліцы), «пагаварылі» (Андра таксама не ведае ні шведскай, ні ангельскай). Прыветлівы знаёмец наступнага дня зайшоў у Цэнтр, каб пабачыцца, ды не застаў нас — і пакінуў ліст на шведскай ды кампутарны пераклад на расійскую мову, які выглядаў так:

«Привет, я живу в черный дом!

Дом около 250 лет. Он всегда был окрашен смолы. Дом был принадлежащих семье моей жены



Фота аўтара

более 70 лет, но теперь мы его владельцем. Моя жена родилась в доме. Ранее мы уже жил и работал в Стокгольме, но когда мы были пожилые, чтобы вернулись в Висбю. Был приятно встретиться с вами сегодня, даже если мы не понимаем друг друга так хорошо! Надеюсь, вы хорошо и приятного пребывания здесь в Висбю!

Приветствия. Фредерик.»

Кранутыя такой увагай, мы назаўтра прынеслі яму нейкія сціплыя сувеніры. Фрэдэрык не разгубіўся, у адказ па-майстэрску склаў з кавалкаў паперы і ўручыў нам па арыгінальным арыгамі ў выглядзе сімпатычнай кашулі з гальштукам.

Што датычыць «черного дома»… У Візбю сцены будынкаў, галоўным чынам, з вапняку, але ёсць і драўляныя. Раней зрубы канапацілі і пакрывалі, як і чаўны, чорнаю смалою. Прастаяўшы не адну сотню гадоў, яны і цяпер быццам новыя. Будынак Фрэдэрыка — з такіх.

* * *

Падчас вандровак нельга было не звярнуць увагу на пашыранасць на востраве нязвычных, мабыць, вельмі старажытных, платоў, жардзіны якіх усталяваны між шэрагу папарных тычак і ўмацаваны без ужывання цвікоў, на адмысловых лазовых перамычках пад вуглом каля 30 градусаў да паверхні глебы. І чалавеку, і зверу няпроста пераадолець незвычайную агароджу. Такая канструкцыя платоў абумоўлена кемнасцю шведаў і пашыранасцю ў лясах ядлоўцу, які моцны і досыць устойлівы супраць гніення. Лес на востраве сустракаўся мне пераважна сасновы, у якім пападаліся елкі, рэдка бярозы, яшчэ радзей асіны, ды амаль спрэс — ядловец. Дрэвы з прычыны малаглеб'я на камяністай платформе — невысокія, на ўзмор'і да таго ж — больш каржакаватыя і нахіленыя вятрамі да сушы. У населеных пунктах пашыраныя ліпы, каштаны, дубы. Уздоўж набярэжнай у Візбю і радзей у іншых месцах вострава сустракаюцца дрэвы, падобныя на глог.

* * *

Час ад часу каля аўтатрасы можна было ўбачыць фермерскую гаспадарчую будоўлю, а побач цудоўна дагледжанае поле ці лугсенажаць, дзе пасвіцца невялікая атара авечак, на вушах якіх замацаваны аднолькавыя прыкметныя «кліпсы». У суседскай атары «кліпсы» іншага колеру. Авечка здавён карміла і апранала мясцовых жыхароў, таму яна — вельмі паважаная тут, знакавая, брэндавая жывёліна. У Візбю часта сустракаюцца любоўна зробленыя, адлітыя з бетону натуральных памераў найсімпатычнейшыя баранчыкі. Імі ўпрыгожваюць асобныя мясціны горада, іх ставяць у якасці далікатнай «цагліны», каб часова ці пастаянна закрыць праезд аўтамабілям… Так што недарэмна выява барана (раней — авечкі) — на сцягу Готланда…

* * *

Ля дарог іншым разам траплялíся дробныя статкі коней, панакрываных гунькамі ад дажджу ці холаду. Коней трымаюць тут выключна для язды верхам. Сена ж для іх захоўваюць у запаяных у пластык цюках ці рулонах, якія складваюць прама на сенажацях. Гунькамі, да слова, шведы накрываюць і сабак, якія вельмы выхаваныя, добразычлівыя. Брэху сабачага ні разу не чуў, не бачыў і бяздомных сабак. Дый катоў таксама. Затое аднойчы, адышоўшы на поўнач ад Візбю кіламетраў 20, не надта далёка ад шашы ўгледзеў сямейства… зубраў, асобін 8-10, якія спакойна, не агароджаныя, адпачывалі на сваім лежбішчы. Паперадзе велічна стаяў і жаваў траву магутны бык-важак. Быццам перанесены сюды лапік нашай Белавежы… А неяк патрапіліся ўзбоч дзве такія нерухомыя авечкі, што здаліся скульптурай. Толькі падумаў: як удала зроблена!. Калі адна з іх… варухнулася. А каб цябе!.

* * *

Неяк шыбаваў па 140-й шашы ў раёне Тофты, натхнёны прайсці яшчэ адну марафонскую дыстанцыю. З інтэрвалам метраў 80 абагналі мяне з тузін бронетранспарцёраў, на кожным з якіх сядзеў салдат за буйнакаліберным кулямётам. Пазней на працягу 3-4-х гадзін за лесам уздоўж мора чуліся кулямётныя тра-та-тахі. Вучэнні, мабыць… Працяглы лясны масіў, колькі і йшоў я, быў акантаваны забароннымі таблічкамі, якія папярэджвалі аб ваеннай зоне. Чуў, у ранейшыя часы Готланд быў нашпігаваны ракетамі, нацэленымі на СССР. Цяпер, мабыць, неяк інакш…

Так што вайскоўцаў шведскіх нечакана пашэнціла сузіраць, а вось убачыць паліцэйскага… Ну хоць бы нягеглага якога. Хоць як ён выглядае. Ды ўжо хаця б даішніка… Бедныя шведы. Далібог… А мо таму й багатыя, што… Бо кожны жыхар, без сумневу, ведае, як звязацца з паліцыяй пры неабходнасці. А неабходнасць?. Даводзілася ж бываць і ў порце, і ў крамах, і ў кафэ, а найчасцей — у буйным гандлёвым масіве. Дый у блізкіх ці аддаленых вандроўках. І што? Ні п'янтосаў, ні хулігання, ні аварый… Дзіўныя людзі, гэтыя шведы, дай ім Бог здароўя.

* * *

Швецыя, маючы 0,15% насельніцтва зямнога шара, выпускае 1% сусветнай прамысловай прадукцыі, вядомая сваімі судна-, авія-, аўтамабільнымі заводамі, металургіяй (шведская сталь — вышэйшай якасці), займае першае месца ў свеце па вытворчасці шарыка- і ролікападшыпнікаў, славіцца прадукцыяй электратэхнікі і радыёэлектронікі, дрэваапрацовачнай і цэлюлоза-папяровай прамысловасцю і г.д.

А што на Готландзе — абасобленым, спецыфічным шведскім рэгіёне?

Тут людзі ловяць рыбу, здабываюць вапняк, вырабляюць цэмент, будуюць, гандлююць, займаюцца фермерствам, працуюць у аўтамайстэрнях, на мініптушкафабрыках, на іншых дробных прадпрыемствах, у тым ліку па перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі. Праблемаў з экалогіяй, лічы, няма. Затое на востраве шмат жывапісных мясцінаў, зручных пляжаў, цудоўных помнікаў гісторыі і культуры, што прываблівае значную колькасць турыстаў. Да іх паслуг створана шырокая сетка гатэляў, баз адпачынку, кемпінгаў, рэстаранаў, кафэ і г.д. У Візбю ёсць тэатр, цудоўная бібліятэка, гісторыка-этнаграфічны музей, карцінная галерэя, процьма старажытнасцяў. Са Стакгольмам і іншымі гарадамі Готланд звязаны паромнымі і авіяцыйнымі лініямі, з вострвам Фарё існуе аўтобусна-паромная сувязь. Так што максімальную колькасць працоўных месцаў стварае турыстычная сфера, яна ж з'яўляецца і галоўнай крыніцай папаўнення дзяржаўнага і мясцовага бюджэтаў.

* * *

У Цэнтры пазнаёміўся з пісьменнікамі, прадстаўнікамі Швецыі, Фінляндыі, Нарвегіі, Даніі, Бельгіі, Ісландыі, Польшчы, Нямеччыны, Грэцыі, Літвы, Латвіі і нават Кітая. Асабліва жвава-каларытнымі былі грачанка Агарыца, грэк з Нямеччыны Тэа, дзелавітасцю вылучалася літоўка Паўліна, добразычлівасцю — ісландка Гроа, кітаец Чан… Уявіце, якія наогул тут, у Цэнтры, цудоўныя магчымасці для наладжвання міжнародных творчых сувязей для пісьменнікаў і асабліва перакладчыкаў!

Некалькі вечарын-знаёмстваў улаштоўвала адміністрацыя Цэнтра, частуючы нас чароўнымі чырвонымі іспанскімі вінамі і экзатычнымі, няўяўна смачнымі стравамі. Кожны распавядаў пра сябе і слухаў іншых. Задавалі пытанні, жартавалі, смяяліся. Было ўрачыста. Было святочна. Было весела і цікава. Канечне, перакладчыкі дапамагалі мне ажыццяўляць прамую і зваротную сувязь з прысутнымі, аднак… І ўсё ж вельмі прыемна было. А які імпульс матывацыі да вывучэння патрэбных моў!

* * *

Сустракаліся, знаёміліся, кантактавалі штодзень звычайна мы ва ўтульнай залі, якая служыла нам, кажучы па-флоцку, і камбузам, і каютт-кампаніяй. Гатавалі, частавалі адзін аднаго, абмяркоўвалі нешта, смяяліся. Дарэчы, камбузная частка абсталявана бездакорна: электрапліты, пасудамыечная машына, халадзільнікі, кіпяцільнікі, посуд які толькі хочаш, спецыі, бакі для рознага даруйце, смецця і г.д. Кают-кампанская састаўляючая — вялізны стол з крэсламі, свежыя газеты і часопісы. Тут час ад часу праводзіліся афіцыйныя і звычайныя абеды ці вечарыны. Тут кожны мог і асобна ў любы час згатаваць нешта, падсілкавацца або й сур'ёзна паесці.

Харчблок суседнічаў з духоўнай часткай корпуса, дзе месцілася бібліятэка на двух паверхах з кампутарамі, ксераксам, піяніна. Там было ціха. Там творцы тварылі…

А ўнізе, у падвале, была саўна, стаялі пральныя машыны.

Спальны корпус — праз дарогу. Але на першым паверсе можна было згатаваць каву ці гарбату, а на другім стаяў кампутар. Вось так…

* * *

Балтыйскі Цэнтр быў створаны ў 1993 годзе па ініцыятыве групы пісьменнікаў і перакладчыкаў балтыйскага рэгіёна, якая зарадзілася у іх падчас круізу вакол Еўропы ў 1991 ці 92 годзе. Фінансуецца Цэнтр на 70% з дзяржаўнага бюджэту і на 30% — з гарадскога. Як на нас — дурноцце нейкае: кожнаму аплаці дарогу, жытло, харчаванне. Ды яшчэ ж і на сувеніры каб засталося. Задачы табе ніхто ніякія не ставіць, справаздачы не патрабуе. Весяліся, пісака! Гуляй!. Гуляй… Прагматычны «захад» гарбеў за ўласнымі ноўтбукамі і цэнтраўскімі компамі. Разважлівая літоўка Паўліна, звярнуўшы ўвагу на мае «злоўжыванні» вандроўкамі, спыталася, хоць як бы й жартам, але і страгавата: а што гэта я [такі-сякі], маўляў, сабе думаю? Набіраюся ўражанняў, кажу, а «раман» потым накрэмзаю... Насамрэч, вельмі прадуктыўна час правёў. І не толькі ў паходах. Нават вершы пісаў, якія тут немагчыма не пісаць. А наконт дурноцця… Канешне, нават для заможнай Швецыі ўтрыманне такога Цэнтра ў нешта ўлятае. Ды з другога боку, пішучая брацiя па вяртанні дае, безумоўна, неблагі розгалас у СМІ сваіх краін пра Готланд і Візбю, хтосьці — і пра паром, пра Стакгольм, пра матэрыковую Швецыю… Гэта абавязкова прыцягне ў казачны край дадатковую колькасць наведвальнікаў-турыстаў. З палітычнага і культурніцкага боку ўзаемная карысць таксама вялізная і бяспрэчная. А творчае братэрства?.

**Кастрычнік-лістапад 2010**

АНОНС

# «ПРАЙДЗІСВЕТ» ВЯРНУЎСЯ З АФРЫКАЙ

**Выйшаў сёмы нумар інтэрнэт-часопіса перакладной літаратуры «ПрайдзіСвет», прысвечаны афрыканскай літаратуры і літаратуры пра Афрыку «Finis Africae». У перакладзе на беларускую мову ў часопісе прадстаўленыя творы афрыканскіх пісьменнікаў, як сучаснікаў, так і класікаў, проза і паэзія еўрапейскіх і амерыканскіх аўтараў, тым ці іншым чынам звязаная з «чорным кантынентам», а таксама крытычныя артыкулы і агляды, якія закранаюць праблемы і асаблівасці афрыканскага літаратурнага свету ў беларускім кантэксце.**

За савецкім часам, ды і пасля здабыцця Беларуссю незалежнасці літаратуры афрыканскіх краінаў былі прадстаўленыя па-беларуску больш чым сціпла. Выйшла ўсяго некалькі асобных выданняў і крыху невялікіх публікацыяў у газетах і часопісах; многія тэксты перакладаліся праз пасярэдніцтва расійскай мовы. Зусім не было перакладаў з уласна афрыканскіх моваў (адзінае выключэнне — пераклады, зробленыя Уладзімірам Палупанавым з малагасійскай). У новым нумары «ПрайдзіСвета» рэдакцыя выдання палепшыла акрэсленую сітуацыю, адкрываючы чытачам як творы новых і сучасных паэтаў і празаікаў з Нігерыі, Сенегалу, Заходняй Афрыкі, ПАР, Анголы і інш., так і звяртаючыся да творчасці ўжо вядомых аўтараў — нобелеўскіх лаўрэатаў Ўоле Шоінкі, Жана-Мары Леклезіё, Дж. М. Кутзэе, а таксама лаўрэатаў прэстыжных афрыканскіх літаратурных прэміяў. Яшчэ адна адметнасць нумара — першыя беларускія пераклады з мовы афрыкаанс.




Традыцыйна ў інтэрнэт-нумары, апроч уласна перакладаў, крытычных артыкулаў і аглядаў змешчаныя інтэрв'ю (са славацкім пісьменнікам Марэкам Вадасам, беларускім празаікам і перакладчыкам Альгердам Бахарэвічам, а таксама перакладчыкам яго рамана «Сарока на шыбеніцы» на нямецкую Томасам Вайлерам), пераклады пераможцаў конкурса і чарговы майстар-клас — ад перакладчыка і выдаўца Змітра Коласа, які мае досвед не толькі афрыканскіх перакладаў, але і жыцця на «чорным кантыненце».

З лепшымі «афрыканскімі» старонкамі інтэрнэт-выдання «ПрайдзіСвет» можна будзе пазнаёміцца ў наступным — чэрвеньскім — нумары «Літаратурнай Беларусі».

**Прэс-служба СБП**

СВЕТ

# КНІГІ, НА ЯКІЯ НАЙБОЛЬШ СКАРДЗЯЦЦА Ў ЗША

**Бібліятэчная асацыяцыя ЗША апублікавала штогадовую дзясятку кніг, на якія часцей за ўсё скардзяцца чытачы: пінгвіны з нетрадыцыйнай арыентацыяй вярнулі лідэрства, класіка прадстаўленая антыўтопіяй «Пра дзівосны новы свет» Хакслі, «Галодныя гульні» апярэдзілі «Змярканне».**

Кніга «З Танга іх трое» Піцера Парнелла і Джасціна Рычардсана вярнула сабе лідэрства ў штогадовым спісе раманаў, на якія больш за ўсё скардзяцца чытачы (складаецца Амерыканскай бібліятэчнай асацыяцыяй (American Library Association, ALA)). Гэтая праца была выдадзеная ў 2004 годзе, а апошнія пяць гадоў нязменна прысутнічала ў «лісце нянавісці», прычым не на апошніх ролях: тры гады займала першае месца, і толькі ў мінулым саступіла серыі «раманаў» Лорэн Міракль («ttyl», «ttfn» і «l8r, g8r»).

Раман заснаваны на рэальнай гісторыі пары імператарскіх пінгвінаў з Нью-Йоркскага заапарка, якія воляю лёсаў засталіся без самкі, стварылі ўласную сям'ю і нават выхавалі малога Танга.

Калі іх прыгоды сталі вядомыя, Рой і Сайлоў (так звалі пінгвінаў) сталі кумірамі гей-супольнасці і героямі дзіцячай кнігі «З Танга іх трое», якую абураныя чытачы патрабуюць выключыць са школьных бібліятэк з-за прапаганды гомасэксуалізму, непрымальнасці тэмы сяроддзяцей і па рэлігійных меркаваннях.

Акрамя таго, чытачы скардзяцца на Шэрмана Алексі (Sherman Alexie), які напісаў «Абсалютна праўдзівы дзённік індзейца па сумяшчальніцтве» (The Absolutely True Diary of a Part-Time Indian).




Вокладка кнігі «З Танга іх трое» Пітэра Парнелла і Джасціна Рычардсана

Напісаны ад асобы індзейца-спокана раман пра яго жыццё ў свеце «бледнатварых» вінавацяць у брыдкаслоўі, расізме, непрыстойнасці ды іншых не вельмі «дзіцячых» рэчах. Цікава, што ў 2007 годзе тая кніга атрымала Нацыянальную кніжную прэмію ЗША ў катэгорыі «дзіцячая літаратура».

Сёлета спіс абнавіўся даволі сур'ёзна. Акрамя леташняга лідэра з яго зніклі такія класічныя творы, як «Забіць перасмешніка» Харпер Лі або «Над прорвай у жыце» Дж. Сэлінджэра. У гэтую кампанію патрапіла і кніга «Цяжкасці жыцця ізгоя» (The Perks of Being a Wallflower) Стыва Чборскі, нягледзячы на тое, што яна застаецца на слыху: аўтар вырашыў стаць рэжысёрам, а ў экранізацыю (фільм павінен з'явіцца ў 2012 годзе) запрасіў акторку Эму Ўотсан, вядомую дзякуючы фільмам пра Гары Потэра.

На патэрыяну, дарэчы, за мінулае дзесяцігоддзе скардзіліся часцей за ўсё — у асноўным па рэлігійных прычынах.

Але без класікі спіс ALA не застаўся: сёлета ў яго ўпершыню патрапіла антыўтопія Олдаса Хакслі «Пра дзівосны новы свет», кнігу пра гадоўлю людзей на чалавекафабрыках з лаянкамі і расізмам.

Трылогія «Галодныя гульні» Сьюзан Коллінз патрапіла ў спіс адразу на пятае месца дзякуючы адкрытым сцэнам гвалту і сэксу. Не падыходзіць яна, па меркаванні чытачоў, і для абранай узроставай групы: галоўным героям раманаў усяго 16 гадоў, а яны праводзяць час у забойствах сваіх аднагодкаў ды прызнаннях у каханні. Цяпер пра кнігі Коллінз гавораць шмат: задуманая іх экранізацыя, а на галоўную ролю абраная ўзыходзячая зорка Галівуда Джэніфер Лоурэнс. Выхад карціны запланаваны на 2012 год.

Сага Стэфані Майер «Змярканне», якая летась здолела прабіцца ў першую пяцёрку «антысіса», гэтым разам апынулася на мяжы вылету і заняла толькі дзясятае месца. Чацвёртае ж месца дасталося «Амфетаміну» (Crank) Эллен Хопкінс за прапаганду наркотыкаў, лаянкі і распусту: у кнізе распавядаецца пра маладую дзяўчыну, якая пад дзеяннем вынесенага ў назоў рэчыва была згвалтаваная сваім жа сябрам, заціжарыла і затым адна гадавала дзіцё.

Але не варта думаць, што скаргі на кнігі з'яўляюцца ў ЗША агульнапрынятай з'явай. Супрацоўнікі бібліятэчнай асацыяцыі падлічылі, што за 20 гадоў вядзення статыстыкі яны атрымалі каля 10 тысячаў лістоў, большасць з якіх напісалі бацькі. У 2010 годзе скаргаў было ўсяго 348 — менш было толькі ў 1990-м, калі сістэма толькі арганізоўвалася.

Акрамя таго, ALA не мае права нешта забараняць. «Мы падтрымліваем права кожнага чытача выбіраць кнігі для сябе або сваёй сям'і. Тым, хто скардзіцца на якую-небудзь кнігу, нельга даваць магчымасць абмяжоўваць правa іншых чытачоў на доступ да таго або іншаму твору», — заявіла дырэктар офіса інтэлектуальнай волі ALA Барбара Джонс.

**Ігар Караў**

**Паводле http://www.gazeta.ru**

СТАЛІЦА

# МІНСК УЛІТАРАТУРВАЕЦЦА. ПАСМЯРОТНА…

**У Мінску з'явяцца вуліцы імя пісьменнікаў Яна Баршчэўскага (пісаў у XIX стагоддзі), Уладзіміра Дубоўкі (28 гадоў правеў у сталінскіх лагерах і высылцы) і народнага пісьменніка Беларусі Івана Навуменкі.**

Такое рашэнне 29 красавіка прыняла Камісія па назвах і перайменаванні вуліц, праспектаў ды плошчаў Мінска. Аб гэтым паведаміў «nn.by» сябра камісіі кандыдат гістарычных навук Іван Сацукевіч.

Паводле яго слоў, гэтыя вуліцы будуць знаходзіцца ў новым мікраараёне, які прапануецца назваць Хмарынскія Пасекі і плануецца збудаваць паміж былым пасёлкам Навінкі і былой вёскай Зацень.

Акрамя таго, вуліцу Чацвёртае транспартнае кальцо, якая знаходзіцца паміж праспектам Дзяржынскага і чыгункай Мінск–Брэст, вырашана назваць у гонар літоўскага мастака і кампазітара Мікалоюса Чурлёніса, цешча якога родам з-пад Мінска — з былой вёскі Пятроўшчына, што знаходзілася побач з гэтай вуліцай, сказаў навуковец.

У назвах мінскіх вуліцаў загучаць і імёны з прозвішчамі беларускіх мастакоў Івана Хруцкага і Пятра Сергіевіча, а таксама музычнага дзеяча Генадзя Цітовіча.

Цягам апошніх гадоў геаграфічна ўвекавечаныя ў сталіцы беларускія народныя пісьменнікі Пімен Панчанка, Кандрат Крапіва і Янка Брыль.

Па-ранейшаму «няма месца» ў Мінску (як і ва ўсёй Беларусі) праспектам ці вуліцам імя народных пісьменнікаў Васіля Быкава ды Івана Шамякіна…

## ПАЛІЦА

### ШМАТМОЎНАЯ КНІГА СЯРГЕЯ ПАНІЗЬНІКА

**Сяргей Панізьнік. На ўсе вякі…: Зборнік вершаў на беларускай мове і ў перакладах на англійскую і французскую мовы. — Мінск: Выд. В. Хурсік, 2011. — 174 с.**

«На ўсе вякі…» — так называецца новы — праілюстраваны лірычнай цеплыней, душэўнай цеплынёй і светлымі фотаздымкамі — паэтычны зборнік Сяргея Панізьніка. Кнігу складаюць вершы беларускага паэта на беларускай мове, а таксама пераклады яго твораў на англійскую і французскую мовы, зробленыя Дагмар Т. Уолкат, Аленай Таболіч і Нінай Дзябольскай.




Прадмову да кнігі напісаў Міхась Скобла.

### ВІДАРЫСЫ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАМЯЦІ

**Алесь МаRа, Уладзімір Сіўчыкаў. Рыцары Пагоні і Арла. — Мінск: Рыдыёла-плюс, 2011. –68 с., іл.**




Аснову незвычайнай кнігі склалі выявы славутых дзеячаў беларускай і польскай гісторый, якія стварыў знаны мастак Алесь МаRа (па-сутнасці, унікальная выстава «Постаці, або на Ростанях гісторыі»), а таксама эсэ-прадмова «Слова пра настаўніка і сябра» ды кароткія біяграмы да героеў карцін Уладзіміра Сіўчыкава па-беларуску, па-польску і англійску. Еўфрасіння Полацкая, Міндоўг, Альгерд, Вітаўт Вялікі, Жыгімонты, Скарына, Баторый, Цяпінскі, Сапега, Радзівілы, Агінскі, Касцюшка, Міцкевіч, Манюшка, Каліноўскі ды іншыя дзеячы культурніцкага, грамадскага і нацыянал-вызваленчага рухаў спазіраюць скрозь прызму гісторыі на чытачоў кнігі — найлепшага падарунка, які прэзентуе нашую Беларусь і на сваёй зямлі, і за яе межамі.

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91.
Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by

## 3 ЧЭРВЕНЯ, ПЯТНІЦА

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.35** Навіны.
**06.05, 07.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.05** Зона Х. Дарожныя навіны.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.15** Сфера інтэрасаў.
**08.40** «Маша і Мядзведзь». Мультфільм.
**08.50** Выпускныя іспыты.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша» (Расія).
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**11.00** Меладраматычны серыял «Маруся. Вяртанне» (Украіна).
**12.10** «Адчайныя хатнія гаспадыні-5». Камедыйны серыял (ЗША).
**13.45** Патрабуецца.
**14.00** Відэафільм АТН «Спадчына зямлі Аршанскай» цыклу «Зямля беларуская».
**14.20** «Клуб рэдактараў».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** OFF STAGE LIFE.
**15.55** Меладраматычны серыял « Дыхай са мной « (Расія).
**16.55** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**18.00** Меладраматычны серыял «Маруся. Вяртанне» (Украіна).
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.45** «Салярыс». Меладрама (ЗША).
**23.45** Інфармацыйна-забаўляльная праграма «Праверка чутак».
**01.15** Дзень спорту.

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.20** «Смак».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Чакай мяне». Беларусь.
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Зваротны адлік».
**21.40** Футбол. Беларусь - Францыя. Прамая трансляцыя з Мінска.
**23.45** «Што? Дзе? Калі? у Беларусі». Летняя серыя гульняў.
**01.00** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Даішнікі 2». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.45** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Фірмовая гісторыя». Серыял.
**14.40** «Next 2». Серыял.
**15.30** «Забойная сіла». Серыял.
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** Ток-шоў «Лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.40** Фільм «Няўдачлівыя». Францыя - Мексіка, 1981 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.15** Фільм «Дзень Калумба». ЗША, 2008 г.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Меладраматычны серыял «Ты маё жыццё» (Аргентына).
**09.05** Серыял «Дзяржаўная мяжа».
**10.20** Час футболу.
**10.50** Кінаспробы.
**11.10** Жывы гук.
**11.55** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**12.55** Драма «Палата №6» (Расія).
**14.30** «Зорка ўзышла над Беларуссю». Гала-канцэрт.
**15.30** Мультсерыял (Расія). 2-я і 3-я серы.
**16.00** Пазакласная гадзіна.
**16.15** «Кулінарыя для дзяцей». Мультфільмы. Заключныя серыі.
**16.30** Прыгодніцкі серыял «Тры талеры» (Белтэлерадыёкампанія-»Беларусьфільм»). 4-я серыя, заключная.
**17.30** Усё аб бяспецы.
**18.00** Меладраматычны серыял «Ты маё жыццё» (Аргентына).
**19.05** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**19.40** Серыял «Дзяржаўная мяжа».
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**22.15** «Пра мастацтва».
**22.45** Дыялогі аб рыбалцы.
**23.10** Крымінальны трылер «Змей» (Францыя).

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** «Прамы эфір».
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Сямейны агмень».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** «Юрмала». Фэст гумарыстычных праграм.
**22.25** Тэлесерыял «Брыгада».
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** Фільм «А Вы яму хто?».

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Вочная стаўка».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «І зноў добры дзень!».
**11.15** «Развод па-руску».
**12.05** «Да суду».
**13.00** Сёння.
**13.35** «Суд прысяжных: галоўная справа».
**15.00** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** «Следства вялі…».
**20.35** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**21.00** Прэм'ера. «Другое прышэсце Вангі».
**22.45** Прэм'ера. «Песня для вашага сталіка».
**23.45** Трылер «Парфумер: гісторыя аднаго забойцы».

### EUROSPORT

**09.30** Аўтагонкі. Сусветная серыя Рэно.
**10.00** «WTCC з..» Часопіс.
**10.30** Футбол. Моладзевы фэст. Тулон (Францыя). Групавы этап. Францыя - Мексіка.
**11.30** Тэніс. Гейм. Сэт. Матс.
**12.00** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. 1/2 фіналу.
**14.30** Тэніс. Гейм. Сэт. Матс.
**15.00** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. 1/2 фіналу.
**19.45** Тэніс. Гейм. Сэт. Матс.
**20.15** Футбол. Эўра-2012. Часопіс.
**20.25** Футбол. Моладзевы фэст. Тулон (Францыя). Групавы этап. Калумбія - Кот-д'Івуар.
**22.15** Футбол. Моладзевы фэст. Тулон (Францыя). Групавы этап. Італія - Партугалія.
**23.00** Самыя моцныя людзі планеты. Лондан.
**23.30** Самыя моцныя людзі планеты. Лондан.
**00.00** Футбол. Эўра-2012. Часопіс.
**00.45** Ралі. IRC. Украіна. Дзень 1-ы.
**01.15** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. 1/2 фіналу.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** «Школа на санцапёку», серыял: 13 серыя.
**07.50** «Гняздо», серыял: 1 серыя.
**08.40** Два на два (тэледыскусія).
**09.10** YoLife!
**09.40** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**10.05** «Пўаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 8 серыя.
**11.00** Беларусы ў Польшчы .
**11.15** «Дзяк і «Трохграшовая опера», дак. фільм, 2007 г., Італія.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Курдыстан зблізку», дак. фільм, 2007 г., Германія.
**13.50** «Школа на санцапёку», серыял: 13 серыя.
**14.15** «Гняздо», серыял: 1 серыя.
**15.05** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**15.35** Два на два (тэледыскусія).
**16.05** YoLife!
**16.30** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Таямніца Сагалі», серыял: 14 серыя.
**17.25** «Драма Васіля Старавойтава»: ч. 1, 2.
**17.55** Форум (ток-шоу): Купляем беларускае?
**18.35** «Пўаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 8 серыя.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.10** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.40** Аўтастопам праз Еўропу.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** «Меней-болей», дак. фільм, 2008 г., Румынія.
**23.10** «Пітбуль», серыял: 13 серыя.
**23.55** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**00.00** Аб'ектыў (інфармацыйная праграма).

## 4 ЧЭРВЕНЯ, СУБОТА

**07.00** Мультфільмы.
**07.25** Існасць.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** Здароўе.
**09.45** «Шэф-кухар».
**10.50** «Я не я». Лірычная камедыя (Расія). 1-я серыя.
**12.10** «Рагаты бастыён». Камедыя.
**13.45** Адмысловы рэпартаж АТН «Прамая сувязь».
**13.55** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**14.20** «Час Саюза». Грамадска-палітычнае ток-шоў.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Вакол планеты.
**16.15** Nota Bene.
**16.45** Дак. цыкл «Атлас «Дыскаверы».
**17.35** Відэафільм «Докшыцы. Паміж Бярэзінай і Віліяй» цыклу «Зямля беларуская».
**17.55** «Ваша лато».
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.20** «Месца сустрэчы». Музычна-забаўляльная праграма.
**21.00** Панарама.
**21.40** «Вяртанне». Трагікамедыя (Іспанія).
**23.50** Канцэрт «Рэтра FM» (2007).

**07.00** «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Серыял «Мая выдатная няня».
**09.45** «Здароўе».
**10.35** «Смак».
**11.15** Прэм'ера. «Юры Вяземскі. Пытанне на засыпку».
**12.15** «Разумніцы і разумнікі».
**13.00** Мультфільм.
**13.20** Фільм «Нечакана-негадана».
**15.00** Асяроддзе пасялення.
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Давай ажэнімся!».
**17.20** Камедыя «Дыяментавая рука».
**19.15** Прэм'ера. Юбілейны канцэрт групы «ВІА Гра».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Клуб Вясёлых і Знаходлівых». Вышэйшая ліга.
**23.30** «Пражэктарпэрысхілтан».
**00.10** «Што? Дзе? Калі?».

**06.15** Фільм «Пажарны сабака». ЗША - Канада, 2007 г.
**08.00** Фільм «Няўдачлівыя». Францыя - Мексіка, 1981 г.
**09.40** «Давай паспрабуем?».
**10.30** «Мінск і мінчане».
**11.05** СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**11.40** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**13.30** «Новыя падарожжы дылетанта».
**14.00** Фільм «Афоня». СССР, 1976 г.
**15.45** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.40** Фільм «Як знайсці ідэал». Расія, 2008 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.30** Фільм «Бандыты». ЗША, 2001 г.
**23.45** Фільм «Падземка». Францыя, 1985 г.

**07.50** Нашы тэсты.
**08.20** Усё аб бяспецы.
**08.50** Рэальны свет.
**09.25** Дыялогі аб рыбалцы.
**10.00** Жансавет.
**10.35** Дача здароўя.
**11.20** Тэлебарометр.
**11.25** Серыял «Дзяржаўная мяжа».
**12.40** Серыял «Дурнушка Бэці-3». 1-я серыя.
**13.35** «Страсці па культуры».
**14.20** «Вялікая прыгода». Прыгодніцкі фільм («Беларусьфільм»). 1-я і 2-я серыі.
**17.10** Прыгодніцкі баявік «Капітан Алатрыстэ» (Францыя- Іспанія-ЗША).
**19.50** Тэлебарометр.
**19.55** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення».
**21.00** КЕНО.
**21.05** Эксцэнтрычная камедыя «Вясёлыя і загарэлыя» (Францыя).
**22.55** Жывы гук.
**23.40** Валейбол. Еўраліга. Жанчыны. Беларусь - Харватыя.
**00.50** Канцэрт «Anastacia. Live At Last» (ЗША).

### РОССИЯ

**07.00** Дэтэктыў «Знайсці і абясшкодзіць».
**08.35** «Юрмала». Фэст гумарыстычных праграм.
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** Фільм «А Вы яму хто?».
**13.35** Мультфільмы.
**13.45** «Уся Расія».
**14.00** Весткі.
**14.15** Фільм «Дом, у якім я жыву».
**16.05** «Сумленны дэтэктыў».
**16.35** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**17.05** «Улада факту».
**17.55** «Суботні вечар».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.45** Прэм'ера. Фільм «Я дачакаюся…». 2011 г.
**00.05** «Дзяўчаты».

### НТВ

**07.35** «Агляд».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Выратавальнікі».
**08.50** «Медыцынскія таямніцы».
**09.20** «Жывуць жа людзі!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.50** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Жаночы погляд».
**14.10** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Знакі лёсу».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Развод па-руску».
**17.25** «Вочная стаўка».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.00** «Праграма Максімум».
**21.05** «Рускія сенсацыі».
**22.10** «Ты не паверыш!».
**23.10** «Апошняе слова».
**00.10** Трылер «Я ведаю, хто забіў мяне».

### EUROSPORT

**09.30** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Эўра-2012.
**10.15** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Эўра-2012.
**11.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Эўра-2012.
**12.00** Футбол. Эўра-2012. Часопіс.
**12.45** Футбол. Моладзевы фэст. Тулон (Францыя). Групавы этап. Італія - Партугалія.
**14.00** Аўтагонкі. Гран-пры. Гонка 1-я.
**15.00** Футбол. Эўра-2012. Часопіс.
**15.30** Тэніс. Гейм. Сэт. Матс.
**16.00** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Фінал. Жанчыны.
**18.00** Тэніс. Гейм. Сэт. Матс.
**18.30** Футбол. Эўра-2012. Часопіс.
**19.25** Футбол. Моладзевы фэст. Тулон (Францыя). Групавы этап. Францыя - Кітай.
**21.15** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Эўра-2012.
**22.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Эўра-2012.
**22.45** Конны спорт. Global Champions Tour. Гамбург (Германія).
**00.00** Футбол. Эўра-2012. Часопіс.
**01.00** Ралі. IRC. Украіна. Дзень 2-і.
**01.30** Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Фінал. Жанчыны.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** «Таямніца Сагалі», серыял: 14 серыя.
**07.50** Калыханка для самых маленькіх.
**08.25** «Пўаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 8 серыя.
**09.15** Праект «Будучыня».
**09.45** «Меней-болей», дак. фільм, 2008 г., Румынія.
**11.25** Аўтастопам праз Еўропу.
**11.40** «Драма Васіля Старавойтава»: ч. 1, 2.
**12.15** «Таямніца Сагалі», серыял: 14 серыя.
**12.40** Калыханка для самых маленькіх.
**13.10** «Пўаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 8 серыя.
**14.05** Праект «Будучыня».
**14.30** Форум (ток-шоу): Купляем беларускае?
**15.10** «Курдыстан зблізку», дак. фільм, 2007 г., Германія.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 14 серыя.
**17.50** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**17.55** Дакументальная гадзіна: «Бронзавы жаўнер Алёша», дак. фільм, 2008 г., Эстонія.
**19.05** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**19.30** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** Англійская для дзяцей.
**19.50** Госць «Белсату».
**20.05** Еўропа сёння.
**20.30** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** «Уладзімір Драбо Камандор», рэпартаж, 2007 г., Беларусь.
**21.45** Суботні сеанс: «Разбіраючы Гары», маст. фільм, 1997 г., ЗША.
**23.15** «Афіцэры», дэтэктыўны серыял: 1 серыя.
**00.05** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**00.15** Аб'ектыў.

ЦІКАВА

# ПЕСНЯ І ВАЙНА

Алег НОВІКАЎ

**Перамога азербайджанскага дуэта на конкурсе «Еўрабачанне–2011» яшчэ больш пасварыла Азербайджан з Еўропай і выклікала новы віток канфрантацыі ў адносінах з Арменіяй.**





Азербайджан на конкурсе «Еўрабачанне» дэбютаваў у 2008 годзе, пасля таго, як мясцовы тэлеканал ОТВ далучыўся да Еўрапейскага вяшчальнага саюза. Да 2010-га найбольш высокім дасягненнем азербайджанскіх музыкаў было 3-е месца, якое здабыў дуэт Айсель Тэймурадзэ і Араш у 2008-м. У 2011 годзе прадстаўнікам Краіны Агнёў (так паэтычна называюць Азербайджан) пакарылася першае месца. Нігяр Джамал і Эльдар Гасымаў сталі лаўрэатамі фестывалю.

За фіналам у Дзюсельдорфе сачыла ўся краіна. Як толькі былі абвешчаны пераможцы конкурсу, святкаваць на вуліцы выйшаў увесь Баку. Аднак не прайшло і сутак, як перамога стала падставай для шматлікіх спекуляцый на глебе палітыкі і дыпламатыі.

Так, кіраўнік камітэта знешніх сувязяў Адміністрацыі прэзідэнта Азербайджана Наўруз Мамедаў выступіў з крытыкай саюзнікаў Азербайджана, якія, па яго словах, не занадта актыўна падтрымлівалі бакінскі дуэт. «Шраг краін, якія цесна супрацоўнічаюць з Азербайджанам, на жаль, не выставілі нашым выканаўцам нават 2, 3 ці 4 балаў», — сказаў Мамедаў.

Асобна дасталася заходнікам. Па слова Мамедава, «такія дзяржавы, як Вялікабрытанія, Германія, Італія, Нарвегія, Данія, Балгарыя, не выставілі нашым выканаўцам ніводнага бала. Магчыма, прадузятае стаўленне тлумачыцца дынамічным развіццём Азербайджана, рэалізацыяй ім незалежнай палітыкі», — лічыць кіраўнік камітэта.

Згаданыя вышэй выказванні службоўца — спроба інструменталізацыі «Еўрабачання» ў палітычных мэтах. Справа ў тым, што напярэдадні Азербайджан і Беларусь выступілі тандэмамі як самыя вялікія парушальнікі грамадзянскіх свабодаў у былым СНД. Так пастанавіў Еўрапарламент.

За гэта Баку трапіў у фокус крытыкі заходніх СМІ. Яны растлумачылі, чаго каштуе «Еўрабачанне» простым азербайджанцам.

«Еўрабачанне» мне не трэба, мне патрэбныя грошы», — цытуе выданне «New York Times» 23-гадовага Арыфа, які хавае сваё прозвішча, асцерагаючыся пераследу з боку ўладаў. Па яго словах, ён працуе ў краме і зарабляе ўсяго 190 долараў у месяц. «Што мне рабіць з вынікамі гэтага конкурсу? — скардзіцца хлопец. — Наша краіна з'яўляецца нафтаздабываючай дзяржавай, а мы жывём у галечы».

Аднак найбольшае вывяржэнне негатыўных эмоцый з нагоды перамогі Азербайджана назіраецца ў Арменіі. Праблемы чалавека тут не пры чым. Законсерваваны вайсковы канфлікт вакол Карабаху перавёў супрацьстаянне армян і азербайджанцаў у іншыя галіны, у тым ліку культурна-музычную.

Дадаўся і той факт, што спявачка Эмі, прадстаўніца Арменіі на «Еўрабачанні–2011», увогуле не атрымала пуцёўку ў фінал. Такім чынам, упершыню за шэсць гадоў удзелу ў «Еўрабачанні», Арменія не была прадстаўлена ў фінале. Гэта стварыла сапраўдную нацыянальную траўму. Адпаведна, у нацыяналістычных колах адразу ж пачаўся пошук стрэлачніка.

Перш за ўсё дасталася кіраўніцтву армянскага тэлебачання, якое выбрала Эмі ў якасці канкурсанткі. «Пытанні, звязаныя з выбарам песні і выканаўца для ўдзелу ў музычным конкурсе «Еўрабачанне», у будучым павінны абмяркоўвацца і ў парламенце Арменіі», — лічыць дэпутат Нацыянальнага сходу ад урадавай Рэспубліканскай партыі Арменіі Гагік Мелікян.

На думку некаторых экспертаў, у правале Эмі вінаватыя не столькі армяне, колькі армянская дыяспара. «Не сакрэт, што Арменія заўсёды ўскладала вялікія надзеі на дыяспару, і заўсёды папярэдне вялася актыўная лабісцкая праца. Хутчэй за ўсё, сёлета было прыкладзена недастаткова высілкаў», — піша выданне «Панарама».

«Прычына таго, што Арменія не прайшла ў фінал конкурсу «Еўрабачанне–2011», хутчэй за ўсё, крыецца ў збоях у сістэме галасавання», — сказала журналістам армянская спявачка Шушан Петрасян. Не будучы здольнымі дэталёва абгрунтаваць механізм змовы супраць Эмі, патрыёты ад музыкі не знайшлі нічога лепшага, як сцвярджаць, што Нігяр і Эльдар выйгралі конкурс з дапамогай падману.

«Гарманічны кірунак песні «Running Scared» дуэта з Азербайджана, які заняў першае месца на «Еўрабачанні», гучыць вельмі падобна на хіт «Secret» амерыканскай групы «One Republic», лічаць зоркі расійскага шоўбізнэсу, пра гэта паведамляе «Armenian news».

Асобнай тэмай для атакі на азербайджанцаў стаў канфуз са сцягам. Пасля таго, як былі абвешчаныя вынікі, пераможцы чамусьці з'явіліся на сцэне са сцягам… Турцыі. Яго несла Нігяр.

Гендырэктар тэлебачання Азербайджана Ісмаіл Амараў паспрабаваў апраўдацца: «У руках Нігяр быў сцяг Турцыі, а сцяг Азербайджана павінен быў вынесці Эльдар, аднак з-за хвалявання ён забыўся зрабіць гэта». Версія, аднак, выглядае слабай, паколькі іншая азербайджанская газета «Трэнд» па слядах конкурсу радасна паведаміла, што азербайджанскія канкурсанты наўмысна махалі толькі турэцкім сцягам, сімвалізуючы такім чынам прыязнь да канцэпцый адзінства цюркскага свету.

На фоне ўсёй гэтай істэрыкі кантрастам выглядае думка армянскай благасферы. Большасць блогераў прызнае, што Эмі правалілася, і гэта нават лепш. «Напэўна, на шчасце, Арменія не прайшла ў фінал — і нам застанецца спакойна пражыць бліжэйшыя дні», — піша папулярны блогер Карнелій.

Аднак доўга спакойна жыць не давядзецца. Усяму віной — правіла «Еўрабачання», адпаведна якому краіна-пераможца фестывалю прымае ў сябе свята на наступны год. Такім чынам, наступнае «Еўрабачанне» адбудзецца на берагах Каспію. Адпаведна, і ў Баку, і ў Ерэване адразу ўзнікае пытанне, ці прыедзе армянскі выканаўца на «Еўрабачанне–2012»? Армянская прэса актыўна выступае за байкот. Сярод іншых аргументаў — пытанне бяспекі. У якасці аргументаў ёсць спасылкі нават на газеты гомасэксуалістаў.

«Панарама» піша: «Прадстаўнікі сэксуальных меншасцяў з Вялікабрытаніі і Германіі павінны байкатаваць конкурс «Еўрабачанне–2012», паколькі прадстаўнікі сэксуальных меншасцяў часта сутыкаюцца з грубіянствам паліцыі». З гэтага выданне робіць выснову, што з-за дэфіцыту геяў у Баку конкурс адбудзецца пры пустых трыбунах.

Адным словам, эмоцыі вакол «Еўрабачання–2012» імкліва награваюцца, аднак ёсць тут і свой пазітыў. Тая ж армянская прэса радуецца, што ўвесь год азербайджанцы будуць жыць выключна «Еўрабачаннем». Значыць, вайна за Карабах пакуль што адкладаецца.




## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Ці рэальна дастукацца да афіцыйнага Мінска? Дастаткова паглядзець на афіцыйны сайт прэзідэнта РБ і азнаёміцца з галоўнымі прынцыпамі дзяржаўнай палітыкі. У тэксце неаднаразова можна сустрэць слова «пераемнасць» у розных галінах, але ні разу не згаданы «дэмакратыя» і «апазіцыя». Беларуская ўлада глухая, яна не імкнецца ў Еўропу, ёй туды не трэба. Аляксандр Лукашэнка стварыў сваю мадэль краіны, унікальную і непаўторную, мадэль-мару. Любыя перамовы — гэта загадзя зразумелы «глуханямы фармат». Тут пануюць свая эканоміка, статыстыка, стандарты, паняцці пра якасць жыцця. Сёння за кратамі апынулася еўрапейская Беларусь, а на волі — штучна створаны свет.

**«Дзеркало Тиджня» (Украіна)**

Рэйтынгі фінансавай сітуацыі Грэцыі і Беларусі ацэньваюцца міжнароднымі інстытутамі аднолькава. Розніца палягае ў тым, што Грэцыя можа разлічваць на дапамогу Еўрасаюза, а Мінск, які пераследуе палітычных супернікаў і нахабна маніпулюе вынікамі выбараў, спаліў усе масты ў адносінах з Еўропай і Захадам. Беларусь на краю бездані, дастаткова невялікага штуршку.

**«Occidentale» (Італія)**

Тым часам аналітыкі выказваюць сумневы ў тым, што нават жаданыя крэдыты дапамогуць выратаваць беларускую эканоміку. Уліванне дадатковых сродкаў не вырашыць яе фундаментальныя праблемы: тут не абысціся без кардынальных структурных рэформаў і змен у палітычнай сістэме.

**Утро.ру (Расія)**

Сённяшняя дэвальвацыя ўжо слабага рубля выглядае недарэчна: хутчэй за ўсё, беларускія ўлады імкнуцца паказаць патэнцыйным крэдыторам, у прыватнасці ЕўрАзЭС, што прымаюць меры для нармалізацыі сітуацыі ў дзяржаве, каб атрымаць крэдыты. Без гэтых сродкаў сітуацыя ў Беларусі будзе станавіцца ўсё больш крытычнай. На сённяшні дзень Мінску лагічна было б займаць пазіцыю двоечніка, які выпраўляе свае памылкі, каб атрымаць хоць нейкія запазычанні.

**«Регнум» (Расія)**

Эфект ад уведзеных абмежаванняў на імпарт можа быць, але часовы. Эканоміка невялікая, усё пад кантролем, абысці абмежаванне будзе складана. Але ў доўгатэрміновай перспектыве гэта няправільны ход, абмежаванні рэдка спрацоўваюць.

**Газета.ру (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ФРАНЦЫЯ. МІТЭРАН — ЖАНДАР АФРЫКІ?

Дзіўным чынам адрэагавала афрыканская грамадскасць на 30-ю гадавіну прыходу да ўлады Франсуа Мітэрана ў маі 1981 года. У той час, як большасць французаў з настальгіяй узгадваюць часы дзядзькі Франсуа (мянушка Мітэрана), у афрыканцаў, наадварот, цалкам супрацьлеглыя пачуцці. Эра Мітэрана была часам безумоўнай падтрымкі Парыжам самых заўзятых аўтарытарных рэжымаў у былых афрыканскіх калоніях Францыі. Дэвізам палітыкі Мітэрана, па яго ж словах, сталі словы Шарля дэ Голя: «У Францыі няма сяброў, а ёсць выключна інтарэсы». З дапамогай былой метраполіі замацавалі сваю ўладу дыктатары ў Габоне, Конга, Заіры. Наадварот, спробы дэмакратычных рэвалюцыяў (як у Буркіна-Фасо) былі падаўленыя з дапамогай французаў. Толькі ў 1990 годзе Мітэран пагадзіўся на дэмакратызацыю Афрыкі, і тое выключна з-за таго, што дэмакратычныя свабоды былі пашыраныя ў Паўднёвай Афрыцы і афрыканскіх краінах — былых саюзніках СССР. Аднак пасля таго, што нарабілі французы на Угандзе, было позна. Наўрад ці калі-небудзь афрыканцы выбачаць французам і Мітэрану генацыд народу тутсі. Знішчаць гэты этнас улады Руанды пачалі з санкцыі Парыжу. Нагадаем, што ў выніку масавых забойстваў было знішчана 800 тысяч чалавек.

**Па матэрыялах французскай прэсы**

### ЛІВІЯ. ФАНАТЫ АТРЫМАЛІ СВАБОДУ

Хто, на вашу думку, самыя заўзятыя працаўнікі Кадафі? Як не дзіўна, гэта футбольныя фанаты. А дакладней, прыхільніка футбольнага клубу з Бенгазі. Яны ахвотна бяруць удзел ва ўсіх мерапрыемствах новага апазіцыйнага ўраду. А частка з іх добраахвотна пайшла на фронт. Справа ў тым, што апошнія 30 гадоў галоўным канкурэнтам клуба з Бенгазі ў чэмпіянаце Лівіі быў клуб Трыпалі. Спачатку гэта было выключна спартыўнае спаборніцтва. Аднак пасля дырэктарам сталічнай каманды стаў сын Муамара Саад. Саад паставіўся да справы вельмі катэгарычна. На перамогу Трыпалі працаваў увесь судзейскі корпус. Пасля аднаго з судзействаў, калі перамогу аддалі футбалістам з Трыпалі, пачаліся пратэсты. У наступных дні спецслужбы арыштавалі і каталі прыкладна 12 фанатаў. Сам бенгазійскі клуб быў пазбаўлены права ўдзельнічаць у турнірах. Нарэшце, меў месца судовы працэс, на якім 34 фанатаў клубу абвінавацілі ў спробе стварэння апазіцыйнай палітычнай партыі. Траіх нават асудзілі да смяротнага пакарання. Толькі ў 2005-м санкцыі з клубу былі зняты.

**Па матэрыялах «Le Figaro» (Францыя)**

### ІРЛАНДЫЯ. СУПРАЦЬ ВІЗІТУ КАРАЛЕВЫ



Упершыню за сто гадоў галава кіруючай у Вялікабрытаніі дынастыі наведала Ірландыю. У свой час Лондан не толькі захапіў Ірландыю, аднак фактычна праводзіў свядомую палітыку на знішчэнне ірландскай нацыі. Нават тое, што пасля Першай сусветнай вайны Ірландыя здабыла незалежнасць, не палепшыла стасункаў Дубліна і Лондана. Шматлікія ірландскія палітыкі дасюль патрабуюць вяртання ў склад дзяржавы Паўночнай Ірландыі. Менавіта для таго, каб трошкі замірыць народы, каралева наведала Ірландыю. Пры гэта сведчыць яе маршрут. У прыватнасці Яе Вялікасць разам з прэзідэнтам наведвала мемарыял героям вайны за незалежнасць Ірландыі. Левая апазіцыя, аднак, не верыць у жэсты Елізаветы Другой. У Дубліне прайшла вялікая маніфестацыя пратэсту. Маніфестанты патрабавалі ад Елізаветы афіцыйнага выбачэння за расстрэл маршу ірландцаў у 1972 годзе ў Белфасце (так званая «крывавая нядзеля»). У выніку сутычак з паліцыяй арыштавана 21 асоба. Дарэчы, чатыры дні турне каралевы з-за ўзмоцненых мер бяспекі абышліся бюджэту Ірландыі 36 мільёнаў еўра.

**Па матэрыялах брытанскай прэсы**

### УКРАІНА. ШТО БУДЗЕ НА МЕСЦЫ ДЗЕСЯЦІННАЙ ЦАРКВЫ?

У Кіеве адбылося пасяджэнне журы, якое павінна вызначыць, што рабіць з Дзесяціннай царквой, а дакладней, з месцам, дзе яна была. Дзесяцінная царква, нагадаем, самая старая царква ў Кіеўскай Русі. Яны была пабудаваная Уладзімірам Вялікім і разбураная ў выніку нашэсця мангола-татараў. Ужо ў наш час археолагі знайшлі яе фундамент. Адразу нарадзілася ідэя аднавіць храм як сімвал хрысціянскай цывілізацыі. Аднак аказалася, што не ўсё так проста. Па-першае, будаваць царкву жадалі кожная з дзвюх вядучых дзеючых ва Украіне праваслаўных канфесій: Украінская праваслаўная Царква (Кіеўскія патрыярхат) — УПЦ — КП і прамаскоўская Украінская праваслаўная Царква (маскоўскі патрыярхат) — УПР—МП. Януковіч адразу вырашыў гэту спрэчку на карысць УПЦ—МП. Аднак на гэтым праблемы не закончыліся. Пытанне ў тым, што выяваў будынку не захавалася. Існуюць 16 навуковых рэканструкцый. У такой сітуацыі нацыяналісты, якія бачаць у будаўніцтве Дзесяціннай царквы пад эгідай УПЦ—МП парушэнне балансу ўплываў абодвух цэркваў, усякім шляхам сабатуюць прыняцце канчатковага рашэння. Яны прапануюць будаваць царкву за стандартамі старажытнасці, што патрабуе больш часу. Гэтай фракцыі супрацьстаіць блізкая да УПЦ — МП група, якая выступае за будаўніцтва вялізарнага сучаснага храму. Ходзяць чуткі, што Януковіч асабіста паабяцаў мітрапаліту Кірылу лабіраваць ягоны праект.

**Па матэрыялах украінскай прэсы**

▸ З НАГОДЫ

# ТРЫМАЙСЯ, БАЦЬКА!

**Алег НОВІКАЎ**

**Беларускі чорны аўторак 24-га стаў шокам для расійскіх прыхільнікаў беларускай эканамічнай і палітычнай мадэлі. У іх нараджаюцца самыя экстравагантныя версіі нашага крызісу і канцэпцыі выратавання любімага лідара. Прапануем агляд блогасферы расійскіх прыхільнікаў Лукашэнкі.**




У Расіі шмат каму цяжка прыняць тое, што беларуская эканоміка дыхае на ладан.

Нехта Сяргей Кажамякін за два дні да дэвальвацыі пісаў у сваім блогу: «А што адбываецца насамрэч? Раздулі паніку (не без удзелу тых жа «свабодных» СМІ), у выніку людзі кінуліся скупляць харчовыя і нехарчовыя тавары. Як вынік — дзе-нідзе спустошылі паліцы. А як інакш? Цяпер становішча выпраўляецца. Гэта прызнаюць і самі беларусы, з якімі я меў зносіны ў апошнія дні». Праўда, у якасці доказу Кажамякін спаслаўся на цытату перадавіцы суботняй «СБ»: «Людзі супакоіліся і перасталі атакаваць крамы і банкаматы. Хваля ніздаровага ажыятажу сышла».

Як аказалася, хваля не сышла. У аўторак афіцыйны Мінск дэвальваваў рубель на 56 працэнтаў. І расійскім фанатам нашай стабільнасці нічога не заставалася, як заняцца пошукам прычын такога канфузу.

Пры гэтым перш за ўсё абавязкова падкрэсліваецца, што праблемы ў РБ не сістэмныя, а выкліканыя нейкімі штучнымі фактарамі.

Так, вядомы левы эканаміст Міхаіл Дзялягін сярод гэтых фактараў называе наступствы сусветнага эканамічнага крызісу і… эканамічную палітыку расійскага кіраўніцтва. «Калі б у Расіі ішла мадэрнізацыя, то попыт на беларускую прадукцыю быў бы высокі, і беларусы проста б працавалі на нашу мадэрнізацыю. Усё было б у парадку, і ўсе былі б задаволеныя», — лічыць эканаміст.

Безумоўна, у шэрагу галоўных фактараў, якія, на думку патрыётаў, дэвальвуюць «зайчык», называецца «змова». За ёй, натуральна, стаяць злосныя заходнія імперыялісты.

«Вінаватыя тыя, каму Лукашэнка не даваў раскрасці краіну, яе прамысловасць і сельскую гаспадарку. Мэтанакіравана выкарыстоўваючы свае сувязі ў Еўропе і ў нас, яны тапілі Беларусь палітычна і эканамічна. Туды толькі што войскі NATO не ўвялі, як у Лівію» (блогер lpwka).

Больш таго, на думку некаторых патрыётаў, супраць Бацькі выкарыстана новая зброя. Больш дакладна пра яе піша на сваім блогу нехта Эль Мюрыд: «Беларускія ўлады падвяргаюцца новаму віду атакі. Вельмі не зразумелы тэракт на фоне няпростага эканамічнага становішча, відавочна, быў накіраваны на тое, каб паказаць неабароненасць беларусаў (якраз беларусы пачувалі сябе ў бяспецы). Разбурыўшы (ці парушыўшы) гэта пачуццё, тэракт надламаў псіхіку, калектыўнае несвядомае — і людзі паступова адмовілі ў даверы ўладзе, пачаўшы, як ім здаецца, асабістае выратаванне па прынцыпе «Ратуйся, хто можа».

Канспіратары, праўда, могуць сядзець не толькі ў Брусэлі, аднак і ў першапрастольнай.

«Ёсць падазрэнні, што мы маем справу з добра арганізаванай інфармацыйнай хваляй, заклікай стварыць патрэбную грамадскую думку. Зваліць Лукашэнку, заваструшць увагу на памылках і праваах яго кіраўніцтва. І адначасова паказваць у правільным святле мудрую дзейнасць нашага ўрада, пры якім жыць стала лепш, жыць стала весялей», — думае блогер Big Royal Malamba.

Перавесіўшы ўсіх сабак на знешніх ворагаў, патрыёты думаюць, як можна выратаваць беларускую мадэль. Праўда, па большасці нічога канкрэтнага не прапануюць. Хіба што чуюцца заклікі да ўвядзення ў Беларусі расійскага рубля. Гэтыя прапановы, аднак, выклікаюць пратэсты з боку тых, хто баіцца, што такім чынам Пуцін і К° прыбяруць да рук «крыштальны сасуд».



**Дэфіцыт комплекснай праграмы выклікае ў стане чырвона-карычневых пачуццё таго, што сітуацыю ўжо не выратаваць**

У выніку большасць сляпа верыць у геній АГЛ. «Як у гэтых умовах не дапусціць поўнага рабавання краіны і закабалення яе, — гэта, думаецца, цяпер для Лукашэнкі самае важнае пытанне. Хочацца верыць, што і з гэтага найскладанага становішча ён усё ж знойдзе выйсце. Трымайся, Бацька!» (Аль Мурыд).

Больш прагматычным выглядае план згаданага Дзялягіна, аднак ён сам не верыць у яго поспех, паколькі такі план патрабуе кадравай рэвалюцыі ў беларускім кіраўніцтве: «Выйсце Беларусі з цяперашняй цяжкой сітуацыі — ператварэнне краіны ў тэхнапарк, канцэнтрацыя ў сябе ўсіх савецкіх прадукцыйных тэхналогій. Іншая справа, што за апошнія гады адбылася даволі значная ратацыя кадраў, і на змену людзям, якія ў 1994–1996 гадах выцягвалі Беларусь з ліберальнай пamyйніцы, прыйшлі проста добрасумленныя выканаўцы. А ва ўмовах крызісу патрэбныя не добрасумленныя выканаўцы, а ініцыятыўныя людзі, якія некалі былі часткова выкінутыя з дзяржапарату, а хтосьці ў яго так і не патрапіў. Ці здолее Лукашэнка ажыццявіць гэту замену — ад гэтага і залежыць лёс Беларусі цяпер».

Дэфіцыт комплекснай праграмы выклікае ў стане чырвона-карычневых пачуццё таго, што сітуацыю ўжо не выратаваць і трэба шукаць нешта добрае нават у самым кепскім.

Каментуючы прагноз пра тое, што Беларусь чакае хваля масавай працоўнай эміграцыі, нейкі нацыяналіст Mutoids адзначае: «Ёсць шанец, што працоўныя эмігранты ў нашай айчыне здабудуць больш славянскую знешнасць. Што добра прынамсі з эстэтычнага пункту гледжання».

Яшчэ далей пайшоў карыстальнік пад нікам Totent17. Ён пабачыў у беларускім крызісе хуткі эканамічны заняпад ненавіснай яму Заходняй Украіны: «Беларусы ўвозілі і марнавалі ва Украіне да 8 мільярдаў долараў штогод на ўсякія кітайска-турэцкія шмоткі, узбагачаючы ўкраінскіх гандляроў. І тут халява скончылася. Цяпер нават зробяць бар'ер для спынення насычэння валютай. А гэта значыць, што будуць масавыя звальненні галічан. Не кажучы таго, што не будзе масавага заезду беларусаў на ўкраінскія курорты. Хай пакутуюць, укры!»

Такім чынам, назіраецца новы этап эвалюцыі пралукашэнкаўскай супольнасці ў Расіі. Яе галоўнай характарыстыкай стаў крызіс аргументаў, які праяўляецца ў няздольнасці давесці перавагу беларускай мадэлі за кошт эканамічнай статыстыкі. На першы план выходзяць канспіратыўныя тэорыі і прынцып веры ў Бацьку, што, безумоўна, з'яўляецца прыкметай маргіналізацыі расійскай супольнасці.

ФУТБОЛ

# ЧЫРВОНАЯ КАРТКА ДЛЯ ФАНАТАЎ

Алег НОВІКАЎ

**Польскі ўрад абвясціў татальную вайну футбольным хуліганам. На думку апазіцыі, за кампаніяй хаваецца палітычны піяр, які можа дорага каштаваць кабінету.**



Першы сігнал прагучаў у Каўнасе, дзе сустракаліся зборныя Літвы і Польшчы. Тады для разгону польскіх фанатаў паліцыі давялося ўжываць слезацечны газ, а каля дзясятка найбольш агрэсіўных заўзятараў былі арыштаваныя.

Традыцыя працягнулася 5 мая ў фінале Кубка Польшчы ў Быдгашчы. Матч паміж варшаўскай «Legia» і познаньскім клубам «Lech» завяршыўся перамогай сталічнай каманды. Фанаты зламалі агароджу і прабіліся на поле, збіваючы спартовых фатографаў, а таксама вырвалі вялікую колькасць крэслаў на сектарах. Паліцыі спатрэбілася ўжыць вадамёты, каб нейтралізаваць хуліганаў.

З таго часу тэма футболу не сыходзіць з першых палос польскіх СМІ. Прэм'ер Дональд Туск асабіста загадаў забараніць наведванне стадыёнаў самым агрэсіўным фанатам, жорстка караць клубы за праявы вандалізму з боку іх прыхільнікаў. «Больш ніякай талерантнасці да псеўдабалельшчыкаў», — рашуча заявіў старшыня ўраду і лідар ліберальнай партыі «Грамадзянская платформа» (PO).

Футбольныя хуліганы з'явіліся ў Польшчы вельмі даўно. Яшчэ ў 1935 годзе прэса пісала пра ўдзел паліцыі ў разгоне бойкі паміж прыхільнікамі клубаў «Cracovia» (Кракаў) і «Ruch» (Хоржув). Падчас нацысцкай акупацыі ўсе спартовыя мерапрыемствы ў Польшчы былі забароненыя. Аднак клубы працягвалі сустракацца нелегальна. Адна з такіх нелегальных сустрэчаў кракаўскіх клубаў «Cracovia» і «Wisla» ў 1943 годзе выйлілася ў масавую разборку фанатаў. Пабоішча хутка перакінулася са стадыёну на вуліцы. Нямецкай паліцыі спатрэбілася некалькі гадзін, каб супакоіць натоўп. Такога кшталту інцыдэнты назіраліся і пасля 1945-га. Так, у 1947 годзе ў Сасноўцы 20 тысяч фанатаў паспрабавалі атакаваць гульцоў гасцявога клубу. Міліцыя ўжыла аўтаматы.

Аднак як пра феномен пра фанатаў пачалі казаць у 1970-х. Як і ў СССР, для моладзі паход на стадыён быў сродкам пазбавіцца ад сумнай рэчаіснасці. Напрыканцы 1970-х у краіне склалася фанацкая сістэма. Арганізацыі фанатаў, або «фірмы», дзейнічалі пры 10–12 клубах. Яны сябравалі або наадварот ненавідзелі адзін аднаго.

Паступова бойкі паміж фанатамі пачалі выклікаць трывогу ў партыйным кіраўніцтве. Трыванне скончылася пасля падзеяў 9 мая 1980 года, калі ў Чэнстахове перад фіналам кубка Польшчы адбылася маштабная бойкі прыхільнікаў сталічнай «Legia» і познаньскага клубу «Lech». Факт сутычкі быў замоўчаны ў афіцыйных СМІ. Аднак дуэль паміж фанатамі клубаў «Widzew» і «Legia» ў 1981 годзе схаваць было немагчыма. Яна адбывалася на футбольным полі падчас прамой трансляцыі. Польскаму камсамолу было дадзенае заданне «прыручыць» фанаў у рамках дазволеных дзяржавай фан-клубаў. У выніку ідэя правалілася.

Падзенне камуністычнага рэжыму і рынкавая трансфармацыя, з аднаго боку, дазволілі казаць пра тэму хуліганаў адкрыта, з іншага — спрыялі росту шэрагаў фанатаў. Сярод маладых беспрацоўных стала модным быць хуліганам. Росту агрэсіўнасці садзейнічала пашыраная сярод моладзі мода на неанацысцкі стыль skinhead (брытагаловых).

Хаця на пачатку стагоддзя эканамічная сітуацыя трошкі стабілізавалася, хуліганства застаецца сур'ёзнай грамадскай праблемай. Самая вялікая мабілізацыя паліцыі адбываецца напярэдадні сустрэчаў клубаў, фанаты якіх знаходзяцца ў стане доўгатэрміновай вендэты. Да такіх антаганістычных пар адносяцца тая ж «Cracovia» — «Wisla». Нянавісць паміж хуліганамі настолькі вялікая, што іх этыка дазваляе выкарыстоўваць падчас бойкі нажы і нават сякеры. Не дзіўна, што ў гісторыі шмат разоў падобныя бойкі заканчваліся з лятальнымі зыходамі.

Часопіс «Polityka» паспрабаваў намаляваць профіль сярэдняга польскага фаната. Гэта, як правіла, людзі 17–30 гадоў з крызісных рэгіёнаў, з так званых «цяжкіх» сямей, якія выраслі ў крымінальных раёнах, дзе формай арганізацыі моладзі з'яўляюцца вулічныя групоўкі, для якіх характэрны культ сілы і нянавісць да чужых. Напэўна, лепшым варыянтам праявіць сілу супраць чужога ёсць так званая ustawka — рытуальная бойка паміж футбольнымі фанатамі напярэдадні матчу.

Хаця, як было сказана вышэй, праблема фанатаў існавала даўно, казаць пра яе пачалі толькі зараз. Некаторыя лічаць, што тут не абышлося без палітыкі. Тым больш, што хутка парламенцкія выбары. Так, правыя блогеры пішуць, што кампанія — не што іншае, як помста за Адама Міхніка. Міхнік — вядомы польскі ліберальны інтэлектуал яўрэйскага паходжання — стаў аб'ектам здзекаў з боку тарсіды клубу «Legia».

Крытыкуюць Туска і левыя. Як піша папулярная левае выданне «Krytyka Polityczna»: «Абмежаванне грамадзянскіх свабодаў, устанаўленне больш жорсткага кантролю над грамадствам былі для кожнага ўраду вялікай спакусай. Самы цяжкім было пры гэтым абмежаваць свабоды такім чынам, каб грамадства не крытыкавала міністраў, а наадварот дарыла ім апладысменты. У такой сітуацыі важна знайсці групу, абарона ад якой была б падставай для рашучых мераў. Такой групай зараз сталі фанаты», — папярэджвае аўтар.

Для партый парламенцкай апазіцыі «Права і Справядлівасць» (PIS) або Саюза левых дэмакратаў (SLD) ход Туска — спроба адцягнуць увагу ад больш важных праблем польскага соцыуму. У дадатак правая фракцыя PIS лічыць, што фанаты клубаў трапілі ў фокус зачысткі з-за сваіх патрыятычных перакананняў.

Першыя вынікі апытанняў паказалі, што кампанія Туска карыстаецца падтрымкай. Рэйтынг «Грамадзянскай платформы» падвысіўся на 4 працэнты.

Аднак колькі грамадства будзе падтрымліваць прэм'ера ў яго паходзе супраць фанатаў, пакуль не ясна: тэма вельмі далікатная. Забароны на збіранне стадыёнаў, асабліва ў правінцыі, выклікаюць пратэсты з боку нармальных людзей, што, як след, можа ўдарыць па рэйтынгу PO.

Знішчыць агрэсіўную частку фанатаў паліцэйскімі метадамі цяжка. Сама паліцыя кажа, што фанацкія групоўкі амаль герметычныя. Вярбоўка інфарматараў або інфільтрацыя агентаў практычна не магчымая. У такой сітуацыі пераможныя рэляцыі ўраду пра перамогу над фанатамі могуць аказацца пшыкам.

Сам Туск трапляе ў спіс тых, каго нельга пускаць на стадыён. У 1970-х ён, тады яшчэ юнак, сам быў заўзятым хуліганам, які бараніў гонар клуба з роднага Гданьску.

Усе гэта дазваляе прэсе крытычна ацэньваць крыжовы паход ураду супраць фанатаў. Магчыма, гэта сапраўды так, аднак пастаўце сябе на месца прэм'ера. На тым матчы ў Быдгашчы прысутнічала спецыяльная камісія UEFA, якая прыгразіла пазбавіць Польшчу права правядзення Еўра–2012, калі праблема фанатаў не будзе вырашаная.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### СЛІМ АМАМУ



Тунiскі блогер і адзін з архітэктараў язмінавай рэвалюцыі падаў у адстаўку з пасады міністра па пытаннях спорту і моладзі ў пераходным урадзе, куды яго запрасілі пасля перамогі рэвалюцыі. У міністэрскае крэсла Слім пераехаў з турмы, дзе сядзеў за крытыку рэжыму ў сваім блогу. Хапіла чатырох месяцаў, каб 33-трохгадовы блогер расчараваўся ў чыноўніцкай кар'еры. «З мяне хопіць. Мая місія выкананая», — сказаў ён журналістам. Яго дастаў фармалізм. У прынцыпе, гэтага трэба было чакаць з самага пачатку. Пасля таго, як Слім у рангу міністра паказаўся на нейкім дыпламатычным прыёме без гальштука, выбухнуў скандал. Частка міністраў стала да яго ў апазіцыю. Мяркуючы па ўсім, яны ў выніку дабіліся таго, каб хлопец склаў паўнамоцтвы. Праўда, сыходзіць з палітыкі экс-міністр не збіраецца. Ён падключыўся да стварэння туніскай Партыі піратаў, якая перш за ўсё змагаецца за свабоду думкі ў інтэрнэце. Гэта тэма вельмі актуальная ў Тунісе. Апошнім часам у краіне па просьбах МУС было заблакавана некалькі радыкальных апазіцыйных сайтаў.

### АЛЕГ ЛЯШКО

Дэпутат Вярхоўнай Рады Украіны набыў вядомасць тым, што стаў першым украінскім парламентарыем, які публічна прызнаўся: ён гей. Пазней Алег Ляшко, праўда, сказаў, што гэта хлусня і нават размясціў па Кіеву білборды, на якіх заляцаецца да нейкіх дзяўчат. Але сапраўдным героем СМІ ён стаў пасля таго, як 25 мая пабіўся з віцэ-спікерам Адамам Мартынюком (Кампартыя). За тое, што Ляшко назваў яго фарысеем, Мартынюк схапіў дэпутата за шыю і павалій. Адразу пасля бойкі камуніст заявіў, што ён схапіў Ляшко не толькі за горла, а і за іншае, «вельмі прадуктыўнае месца». Публіка



і прэса адразу кінуліся смакаваць сцэну захопу Мартынюком «вельмі прадуктыўнага месца» Ляшко. Інцыдэнт, дарэчы, адбыўся на наступны дзень пасля сусветнага Дня барацьбы з гамафобіяй, што выклікала нездаровую цікавасць да далікатнай тэмы. Далей усіх пайшлі камуністы. «Я рады, што ў прэзідыуме ёсць людзі з традыцыйнай арыентацыяй, і цалкам падтрымліваю першага віцэ-спікера. А то адзін з палітыкаў іншай арыентацыі нядаўна мне сказаў страшную фразу: «Гэта вы ў меншасці!» — скардзіўся дэпутат-камуніст Яўген Царкоў. У дадатак Царкоў зарэгістраваў законапраект, які прадугледжвае крымінальную адказнасць за прапаганду гомасэксуалізму.

### БЕПЕ ГРЫЛА

Грыла не толькі італьянскі комік, але і лідар палітычнага руху «Пяць зорак». «Пяць зорак» нарадзіліся ў 2009 годзе як рэакцыя на крызіс левай апазіцыі ўраду Берлусконі. Грыла заклікаў стварыць новую мадэль палітычнага руху, які акрэсліваe пяць канкрэтных тэм: экалогія, вада, развіццё, транспорт і камунікацыя. Акрамя таго, партыя адмовілася ад інстытуту старшыні. Ініцыятыву Бепе стварыць выбарчыя грамадзянскія лісты спачатку ўспрынялі як правакацыю, але дарэмна. На мінулым тыдні ў Італіі адбыліся мясцовыя выбары. У некаторых гарадах кандыдаты ад «Пяці зорак» атрымалі трэцяе месца. Перспектывы руху, аднак, застаюцца не зразумелымі. Праектам Бепе зацікавіліся ў Іспаніі, дзе апошнім часам на вуліцы выходзяць сотні тысяч маладых людзей, якія незадаволеныя старым палітычным істэблішментам. Магчыма, у хуткім часе будзе створаны іспанскі варыянт «Пяці зорак». Бепе, дарэчы, ужо наведаў Барселону і Мадрыд, каб падзяліцца з пратэстантамі сваім досведам.



▸ ВАЛАДАРЫ ДУМАК

# «НАШЧАДКІ БУДУЦЬ ЗАЙЗДРОСЦІЦЬ НАМ»

**Мы адкрываем новую рубрыку пад назвай «Валадары думак» — серыю сустрэч з людзьмі, якія маюць уплыў на грамадскую думку і якіх можна лічыць валадарамі думак: у пэўным сэнсе, для пэўных адсекаў грамадства — а нават і для ўсяго грамадства. Мы плануем запрашаць у рэдакцыю НЧ палітыкаў, публіцыстаў, грамадскіх дзеячаў розных пакаленняў для абмеркавання самага шырокага кола праблем сучаснасці. І ў якасці зачыну мы гутарым з Валянцінам Акудовічам як з першым (і пакуль апошнім) беларускім філосафам у найноўшай гісторыі.**



Валянцін Акудовіч

**Аляксей Кароль:** Найперш я хацеў бы вызначыць і для чытача, і для сябе: каго ў сучасным грамадстве можна лічыць валадаром думак? Асобы якой прафесіі ўплываюць сёння на стан грамадскай думкі, на ўспрыняцце і фармаванне новых ідэй, тэндэнцый? За савецкім часам такімі амаль агульнапрызнанымі валадарамі думак былі пісьменнікі. З аднаго боку, пісьменнікі, аблашчаныя ўладай і фактычна прызначаныя на ролю валадароў думак, з іншага — тыя, што з'явіліся спантанна і ў пэўным сэнсе падрывалі савецкую ідэалогію, скажам, у нас гэта былі Васіль Быкаў, Уладзімір Караткевіч, яшчэ раней — у некаторай ступені — Іван Мележ. Яго «Людзі на балоце» былі ўспрынятыя як з'ява. Я помню сябе дзесяцікласнікам, калі тая частка нашага класа, якая ведала літаратуру, ці не ўпершыню была пад уражаннем ад беларускага пісьменніка, чытала і перачытвала. Спадару Валянціне, якая Ваша думка наконт валадара думак сучаснасці і для Беларусі?

**Валянцін Акудовіч:** Перад тым, як адказаць Вам, я хачу зрабіць заяву: ніяк не бачу сябе сярод валадароў думак. Я прыйшоў сюды, не ведаючы, што гэтую высокую і пафасную тэму хоць нейкім чынам спрацоўваюць на мяне. Я думаў проста пагаварыць пра гэты феномен, што для інтэлектуала цалкам нармальна. Да таго ж я лічу, што валадары думак — ці тое, што мы пад гэтым прызвычаіліся разумець, — у сучасным грамадстве ўвогуле не магчымыя. І я хацеў распавесці, чаму.

## Дзіця крызісу

Для нас, еўрапейцаў, фігура валадара думак вядомая яшчэ з часоў антычнай Грэцыі — праз вобраз Арфея, якога, калі ён пачынаў гаварыць, слухалі людзі, звяры і птушкі. Зрэшты, кожная традыцыйная культура мела падобнага міфічнага персанажа — скажам, вяшчун Баян у старажытнарускай традыцыі. Але досыць перадгісторыі. Зараз я ў агульных рысах зазначу, калі і ў якіх умовах ужо ў новыя часы праяўляліся тыя, каго мы называем валадарамі думак.

Па-першае, валадар думак — гэта зазвычай нефарматная і нефармальная фігура. Ім не мог называцца, да прыкладу, князь ці біскуп. Валадаром думак мы называем таго, хто паўстае з нефармальных дыскурсаў культуры, рэлігіі альбо ўлады. Па-другое, з'яўлялася гэтая фігура пераважна ў радыкальна крызісныя эпохі. Пакуль усталяваныя ўладай правілы, нормы і законы, якімі б жорсткімі і несправядлівымі яны ні былі, адпавядалі сваёй цывілізацыйнай стадыі, валадарам думак не было месца ў грамадстве. Але калі выспяваў радыкальны злом, паколькі старая мадэль знасілася і больш не працавала, калі час набрыняў ужо нечым іншым, а тыя, хто трымаўся мінуўшчыны, працягвалі яе абараняць — тады і паўставала асоба, якая прамаўляла: «Усё дрэнна, трэба рабіць інакш». Найбольш яскравыя прыклады ў Новы час для нас, еўрапейцаў, выявіліся ў рэлігіі: Марцін Лютэр, Жан Кальвін, стваральнікі англіканства, якія распачалі рэфармаванне кансерватыўнай каталіцкай царквы. Такім чынам, валадар думак — нефармальнае дзіця крызісу. Якога заўгодна: рэлігійнага, эканамічнага, палітычнага…

## Народ і геній

У Еўропе валадары думак як пэўны інстытут былі «пастаўленыя на паток» у эпоху рамантызму. Тады адбыліся дзве канцэптуальныя рэчы. З'явіўся панятак «народ» як праасснова ўсіх будучых нацыяналізмаў. Да эпохі рамантызму катэгорыі народу не было: раней грамадства дзялілася па саслоўі, але панятку, які аб'ядноўваў бы народ у адно цэлае, не існавала. Шляхціц, скажам, XVI стагоддзя ні ў якім кантэксце не мог сябе бачыць паяднаным з халопам. Павінны былі мінуць эпохі, адбыцца радыкальныя сацыяльныя і інтэлектуальныя зрухі, каб прыйшло разуменне: у нейкім кантэксце ўсе мы — ад халопа да Радзівілаў — можам быць задзіночаныя ў адно цэлае, усе разам.

Спачатку з'явіўся народ, а потым сфармавалася гэтая надзвычай цікавая мне бінарная апазіцыя «народ — геній». Геній павінен быў выхоўваць, адукоўваць народ і весці яго да светлай будучыні. Не рамеснікаў, не сялян, не шляхту — а ўвесь народ разам.

З супрацьпастаўлення генія народу пазней паўстаў рускі інтэлігент, які і спарадзіў у Расіі (і шэрагу блізкіх да яе культураў) гэты феномен валадара думак. Для французаў такім валадаром думак стаўся Віктор Гюго. Ён быў апошнім французам, якога можна назваць валадаром думак, — таму што далей у Францыі пачыналася дэмакратыя. Ды і ўвогуле, у тых дзяржавах, якія пераходзілі на парламенцкі тып улады, валадары думак пачалі знікаць як від. Грамадства праз інстытут галасавання пачало само выбіраць сваім думкам валадароў.

**Андрэй Расінскі:** А Сартр? А Камю?

**ВА:** Пабойцеся Бога! Якія ж яны валадары думак? Для простых французаў яны былі маргіналамі! Хаця, безумоўна, для праслойкі інтэлектуалаў усяго свету нейкі час яны нешта значылі. Але не будзем перабольшваць: не яны вырашалі лёсы як асобных краінаў, так і ўсёй Еўропы.

**АК:** Аднак на інтэлектуалаў іх уплыў быў каласальны.

**ВА:** Давайце разводзіць паняцці «валадар думак» і «аўтарытэт для экспертнай групы». Так мы і Віктара Пялевіна назавем валадаром думак пуцінскай Расіі. Яго чытае 50 тысяч прасунутых расіян, ён адзін з самых вядомых пісьменнікаў. Але ж гэта зусім іншае.

## Апошнія валадары

Дэмакратыя знішчыла валадароў думак, таму што пры нармальным функцыянаванні дэмакратычнай мадэлі крызісныя сітуацыі шырока абмяркоўваюцца ўсім грамадствам і вырашаюцца праз выбары — і валадар думак становіцца на чале парламента ці ўрада.

Апошнія валадары думак з'явіліся на нашай прасторы, калі разваліваліся старыя інстытуты ўлады. У нас гэта былі Зянон Пазняк і Васіль Быкаў, у літоўцаў — Вітаўтас Ландсбергіс, у чэхаў — Вацлаў Гавел, у палякаў — Лех Валенса. Але амаль усе яны сталі валадарамі думак, перайшоўшы ў палітыку з творчасці, культуры (як між іншага — са спазненнем — Уладзімір Някляеў, адзін з кандыдатаў на апошніх прэзідэнцкіх выбарах). Бо валадарыць над розумам грамадства сёння можна толькі праз палітычныя інстытуты. Праз свае вершы, прозу, кіно, філасофію — не.

Сёння мы не маем нармальнай дэмакратыі, у нас няма сапраўднага парламента. Таму напярэдадні не чакае вялізны крызіс. Таму, тэарэтычна, у нас яшчэ мусіў бы з'явіцца валадар думак. Але, хутчэй за ўсё, ён не з'явіцца.

**АК:** Магчыма, таму, што структура грамадства ўжо іншая.

**ВА:** Менавіта так. Хаця пакуль у нас яшчэ ёсць адзін валадар думак, які заняў гэтую пазіцыю сямнаццаць гадоў таму і нікому яе не збіраецца саступаць.

**АК:** Ён — валадар думак, бо ён валадар дзяржавы...

**ВА:** Але ніхто не можа параўнацца з ім, асабліва калі браць першыя дзесяць год яго кіравання. Ні Быкаў з Пазняком, ніхто, апроч хіба (у мінулым) Пятра Машэрава — але Машэрава не выбіралі, а прызначылі. А яго людзі выбралі на ўладу над імі за тое, што яго думкі былі думкамі большасці.

**АР:** Як тут увогуле можна казаць пра валадара думак? Я б назваў гэта «валадаром бяздум'я»!

**ВА:** Ат, гэта ўсё інтэлігенцкія штучкі... Валадар — той, хто валадар, а не той, хто прыгожа разважае пра любоў і свабоду.

## Агенты Хайдэгера

**АК:** Я цалкам згодзен з вашай інтэрпрэтацыяй, але хацеў перавесці яе ў іншы план. Захоўваецца ўплыў некаторых асобаў на пэўныя сегменты грамадства. Яны паказваюць напрамак і прыводзяць да нейкага рашэння праз палітычныя дэмакратычныя механізмы. Якія мультыплікатары грамадскай думкі, уплывовыя асобы могуць спрыяць пераменам у агульнанацыянальным рэчышчы, адыходзе ад традыцыйнага таталітарнага грамадства, якое мы перажываем сёння нібы ў рэжыме «рэха»?

**ВА:** Адназначнага адказу тут няма, і найперш таму, што нашае грамадства не мае структурнай цэласнасці. Яно спрэс падзеленае на самыя розныя сегменты. Вось мы з вамі належым хутчэй да нацыянальна заангажаванага сегменту. У гэтым сегменце вельмі шмат яркіх, таленавітых людзей, асабліва ў сферы творчасці. Але я



Мастак Аляксей Марачкін. «За Свабоду. Плошча Каліноўскага»

не магу сказаць, каб яны былі над-та ўплывовымі, бо няма на каго ўплываць — хіба на саміх сябе. У той жа час у прадзяржаўным сегменце такіх фігур вобмаль, калі, канешне, не браць маскультуру.

**Марыя Мартысевіч:** Валадароў думак аддзялілі ад народу, на які яны маглі б паўплываць.

**ВА:** Хіба што так. Дарэчы, гэта было вельмі прафесійна праробленa. Нябачны мур без спеху нарошчваўся цягам многіх гадоў, і цяпер патэнцыйныя валадары думак апынуліся адлучанымі ад Беларусі. Можа, перадусім дзеля таго, каб Беларусі застаўся адзін валадар думак.

## Певень і світанак

**ММ:** Ёсць меркаванне, што сэнс так званых «чорных спісаў» і любых падобных забаронаў і абмежаванняў менавіта ў тым, каб аддзяліць уплывовых асобаў ад каналаў распаўсюду «шкодных ідэяў». Лявон Вольскі, безумоўна, быў валадаром думак майго пакалення (сённяшніх трыццацігадовых), але цяпер яму забаронена гастраляваць, і такім чынам ён можа проста не трапіць у поле зроку сваіх патэнцыйных слухачоў маладзейшага веку. Такім чынам, у сферы культуры ідзе татальная зачыстка. Хто прыходзіць у гэту сферу, калі з яе выцесненыя сапраўдныя ідэйныя лідары? Хто ў нас выконвае іх функцыю?

**ВА:** У Васіля Гросмана ёсць такое назіранне. Бываюць эпохі, калі каламуць ляжыць на дне, схаваная празрыстай вадой, а бываюць часы, калі каламуць усплывае наверх. Мы сёння апынуліся ў гэтай другой сітуацыі. Сучасная цывілізацыя — цывілізацыя масавага чалавека, і гэтаму грамадству валадары думак ніяк не патрэбныя. Гэтаму грамадству патрэбныя яркія медыя-героі, мультыплікатары думак. Самая яркая медыя-фігура Расіі — Уладзімір Жырыноўскі. Прыйшоў новы герой. Ён не павінен быць залішне разумным і этычна зануранfamы, але мусіць мець яркую харызму, якая б праз масмедыя прываблівае масавага чытача, слухача, але найперш — гледача. І толькі для экспертных супольнасцяў сапраўды яшчэ існуюць валадары думак і агенты ўплыву Канта, Хайдэгера, Сартра, Фуко...

**АК:** Так, я бачу гэту падмену. Апошняя хваля шасцідзесятнікаў — Васіль Аксёнаў, Яўген Еўтушэнка, папулярныя ў тыя часы кнігі Рэмарка і Хэмінгуэя падштурхнулі нас да пераасэнсавання савецкай рэчаіснасці і па сутнасці зрабілі ўспрымальнымі для ідэй перабудовы і (у выпадку Беларусі) нацыянальнага адраджэння на аснове дэмакратыі. Цяпер адбываецца менавіта падмена, пра якую вы гаворыце. Падмена на шоў-герояў. Беларускія «чорныя спісы» — невыпадковая з'ява. З шоў-герояў на расійскіх падмостках штучна ствараюць валадароў думак — уплывовых асоб, робячы акцэнт на іх асабістае жыццё, прыцягваючы ўвагу насельніцтва да іх асобаў і адцягваючы ўвагу ад новых ідэяў, магчымых пераменаў у бок дэмакратыі. У нас, на шчасце, такіх зорак не з'явілася.

**ММ:** Хоць дзяржаўныя ідэолагі прыкладалі ўсе намаганні для іх з'яўлення...

**АК:** І людзі пацягнуліся да патэнцыйных валадароў думак. Гэта страшна для ўлады, і таму гэтыя людзі трапілі пад забарону. Звычайныя меры таталітарнага рэжыму. Якія думкі і ідэі могуць стаць асноватворнымі ў сучасны момант для розных слаёў нашага грамадства — не толькі тых, хто прытрымліваецца каштоўнасцей нацыянальнага адраджэння, але і тых, хто выступае за палітычную рэструктурызацыю грамадства?

**ВА:** Нядаўна я надрукаваў кнігу «Архіпелаг Беларусь», якая складаецца з фрагментаў маіх інтэрв'ю за апошніх чатырнаццаць год. Там шмат розных выказванняў пра тое, што трэба рабіць, як жыць. Ну і што? Што з таго, што нейкі певень пракукарэкаў світанак? Світанак наступае незалежна ад пеўня.



Аляксей Марачкін. «Здані (пераможцы)»

## Дыктатура XXI стагоддзя

Шасцідзясятнікі сапраўды падрыхтавалі атмасферу для пераменаў. Увогуле, унутры імперскай камуністычнай цывілізацыі СССР стварылася іншая ўнікальная цывілізацыя. Гэта была цывілізацыя чытачоў тоўстых літаратурных часопісаў, дзе і друкаваліся «шасцідзесятнікі». Але чаму ў нас сёння немагчыма такая сітуацыя? А таму, што хоць у нас тыранія, але гэта тыранія XXI стагоддзя. Хто хоча гаварыць — мае магчымасць публічна гаварыць тое, што хоча. Мяне ўжо колькі год не друкуюць у дзяржаўных выданнях, а я гэтага нават не заўважаю, бо ўсё, што меўся надрукаваць, — надрукаваў у незалежных выданнях і выдавецтвах. Ад таго, што Някляеву, Арлову, Хадановічу і шматлікім іншым таленавітым аўтарам не дазваляюць прысутнічаць у інтэлектуальнай прасторы, якую патрануе дзяржава, іх уплыў не змяншаецца, ужо хаця б таму, што сапраўднае мастацтва сёння не патрэбнае «ні там, ні тут».

## Новыя людзі

**АК:** Я вам крыху запярэчу як гісторык. Інтэлектуальнае дысідэнцтва, базаванае на каштоўнасцях, незаўважна ўплывае на шырокую свядомасць, значна больш, чым гэта здаецца яго творцам. Сучаснае беларускае дысідэнцтва — спадчына савецкага шасцідзясятніцтва. І калі ў шэсцьдзясят восьмым годзе на Чырвоную плошчу выйшла восем чалавек, то ў 2010 на плошчу Незалежнасці ў Мінску — 30–40 тысячаў. У СССР нацыянальна-свядомасны падмурак не быў заўважны, але агульнапратэстны, у тым ліку супраць сістэмы — ужо быў. Другое мае пярэчанне асноўваецца на тым, што на сённяшнім узроўні асэнсавання рэчаіснасці інтэлектуальная плынь спрашчаецца і пераварваецца палітыкамі ў больш простыя ідэі і напрамкі. Плошча — таму прыклад. У апытанні TUT.BY «Што вас найбольш хвалюе?» прыкладна аднолькавы працэнт за мінулы тыдзень набралі адказы «суды» і «кошты». Грамадства палітызуецца і больш цікавіцца пэўнымі феноменамі, чым яно цікавілася раней. Таму ваш як філосафа ўплыў на грамадства цяпер на стадыі практычнай рэалізацыі, і стрымліваецца ён толькі рэпрэсіўнымі мерамі. Крыху вольнасці на выбарах — імітацыйнай свабоды, і ўжо «валадару ўлады» падалося: яшчэ крыху — і ён не зможа кантраляваць працэс. І ў гэтым ён не памыляўся.

**ВА:** Я з вамі пагаджуся. Калі пасля 19-га снежня мы пачалі аналізаваць, хто выйшаў на Плошчу, то перадусім вызначылі тры тыпы адважнікаў. Самы нешматлікі — палітычна заангажаваныя грамадзяне ад усіх партый і рухаў разам узятых.

**АК:** Дзве тысячы, не больш.

**ВА:** Другая частка — значна большая, але ўсё адно меншая за асноўную, — звычайны пратэстны электарат. 8% кожнага грамадства незадаволеныя любой уладай. Яны будуць пратэставаць і за пазухай у Бога

**АК:** Гэтак жа заўжды ёсць 8%, якія любой уладай задаволеныя.

**ВА:** А асноўная маса ўдзельнікаў Плошчы — гэта новыя людзі. На Плошчу выйшлі тыя, хто ў нейкім сэнсе пераняў новыя каштоўнасці, выхаваўся ці перайначыўся праз інтэрнэт, незалежную прэсу, адукацыю за мяжой, розныя грамадзянскія ініцыятывы — выйшла грамадзянская супольнасць, якая, хаця б у Мінску, ужо досыць актыўна фармуецца. Яны і склалі асноўную масу Плошчы. І выйшлі яны таму, што былі не згодныя з тымі каштоўнасцямі, якія ім прапануюць улады. Дарэчы, яны сваёй масавасцю стварылі праблемы палітычнай апазіцыі. Пабачыўшы такую масу народу, палітычныя лідары вырашылі, што гэтыя людзі прыйшлі змагацца з уладай. А яны не змагацца прыйшлі, а толькі прадэманстраваць сваю нязгоду. Не больш. І як толькі пабачылі небяспеку — усе разышліся. Засталіся толькі лідары з рэвалюцыйнымі лозунгамі, звернутымі да змагароў, якіх на Плошчы, лічы, і не было.

## Пагарэльцы на папялішчы

**ММ:** Мы стаім на парозе крызісу, прычым крызісу нетыповага. Калі ў 1990-я разруха ахапіла ўвесь Усходні блок Еўропы, то цяпер праз няправільную рэакцыю беларускага рэжыму на глабальную рэцэсію 2008 года сітуацыя склалася ўнікальная — гэта толькі наш крызіс. Хто выжыве пасля гэтага лакальнага Армагедону? Што вырасце на папялішчы?

**ВА:** Усё будзе залежаць ад таго, што застанецца на гэтым папялішчы. Ці выгарыць усё, ці нам толькі здаецца, што крызіс будзе такім татальным і брутальным. Але самым страшным будзе не пажар — пажар для нас стане хутчэй вызваленнем. Самым страшным будзе адбудова таго, што згарыць. Ці зможам мы аднавіць, ды пры гэтым яшчэ мадэрнізаваць былое, ці пойдзем па свеце як пагарэльцы? Песіміст скажа: «Не адбудуем». Аптыміст скажа: «Не, адбудуем!»

**АР:** А што скажаце Вы?

**ВА:** Мяне як чалавека нацыянальна заангажаванага найбольш турбуе, ці не страцім мы незалежнасці. Тут я хутчэй аптыміст: палітычна Беларусь застанецца незалежнай. А вось эканамічная незалежнасць змінімізуецца — і на досыць працяглы час. Чаму мы застанёмся палітычна незалежнымі? Гэта паказвае практыка. З 1990-х гадоў з'явілася безліч дзяржаваў і паўдзяржаваў — і ніводная з іх незалежнасці не страціла. Як казаў адзін польскі даследчык Беларусі, у наш час значна прасцей стварыць новую дзяржаву, чым загубіць яе.

Ментальна Расія — рускі чалавек і расійская ўлада — ніколі не адмовіцца ад дзвюх рэчаў: тых некалькі Курыльскіх астравоў, на якія прэтэндуе Японія, і ад Беларусі. Ну вось навошта Расіі тыя заняпалыя ва ўсіх сэнсах Курыльскія астравы? Але ўчапіліся і не аддаюць... Тое самае — з Беларуссю. Гэта праблема расійская ментальнасці, а не геапалітыкі ці здаровага клёку. Але палітычна Расіі нас не залучыць.

**АР:** А культурніцкі?

**ВА:** Культурніцкі, я думаю, дыктат Расіі (нафта ў абмен на мову) другі раз ужо не паўторыцца. Калі наступіць квазідэмакратычная сітуацыя (квазі — таму што шлях да сапраўднай дэмакратыі доўгі і пакручасты), новаму кіраўніцтву дзяржавы давядзецца рабіць хаця б выгляд нацыянальнага адраджэння. Дыктатуры нерэпрадуктыўныя. Не было яшчэ такога ў гісторыі. У гэтым пажары беларуская дыктатура загіне найперш.

## Патрэбныя Экскурсаводы

**АР:** А ці хопіць беларускаму грамадству сілаў, каб адрадзіць мову і культуру?

**АК:** Ці ператворыцца ваш «архіпелаг Беларусь» у цэласны мацярык?

**ВА:** Я калісьці напісаў, што толькі тэктанічны зрух можа ператварыць архіпелаг Беларусь зноў у мацярык. Цяпер я так не думаю. Сумная і скрушная тэза, якую я сфармуляваў даўно і насуперак сваім жаданням: Беларусь ніколі не будзе беларускай. Час нацыяналізму імкліва мінае. Цяпер у мяне з'явіўся іншы двухсказавы лозунг: «Нацыянальным каштоўнасцям — так, нацыянальнай ідэі — не!» Мая візія Беларусі — гэта візія грамадства, пабудаванага на прынцыпе грамадзянскай супольнасці, дзе на папялішчы Беларусі пасля пажару будуць дамінаваць не «адраджэнскія» мроі, а агульны для ўсіх Закон. Калі ў аснове дзяржбудовы ляжыць нацыянальная ідэя, то ўрад, парламент, культура і эканоміка завязаны на Нацыі і Мове. Гэта логацэнтрычная мадэль, якая сёння немагчымая. Яшчэ і таму валадар думак больш не можа паўстаць, бо знік логацэнтрычны свет. Усе логацэнтрычныя канструкцыі ды ідэалогіі скончылі сваё існаванне ў XX стагоддзі. Васіль Быкаў быў апошнім валадаром думак на Беларусі. І болей нікога ўжо не будзе.

І вось тую грамадзянскую супольнасць, што паўстане, варта, наколькі гэта магчыма, напоўніць нацыянальнымі каштоўнасцямі. Вярнуць старыя нацыянальныя каштоўнасці, стварыць новыя... Нам патрэбныя не валадары думак. У грамадстве на папялішчы нам патрэбныя Экскурсаводы ў шырокім сэнсе гэтага слова. Гісторыкі, краязнаўцы, археолагі, стваральнікі навукова-папулярных выданняў. Ужо сёння ў нашым грамадстве надзвычай запатрабаваны беларускі экскурсавод, які не стварае новых сэнсаў, а але вяртае грамадству тое багацце, якое ўсюды, куды ні глянь.

**АК:** Якія думкі і ідэі можна вылучыць як асноватворныя для беларускага чалавека, для беларускай нацыі?

**ВА:** Важна ўсвядоміць, што дваццацігоддзе з канца васьмідзясятых і да гэтага дня — гэта самая вялікая эпоха, якую перажывалі беларусы. Не Другая сусветная вайна — вайна была хутчэй агульнай бядою. І нават калі глядзець нашу гісторыю з больш шырокай рэтраспектывай (уключна з часамі ВКЛ) — то гэтыя 20 год цяжка параўнаць з якім-кольвек перыядам. Нашы рамантычныя нашчадкі будуць зайздросціць нам: Божа, у які яны жылі час! Калі быў першы (і апошні, дай Бог) дыктатар! Калі былі масавыя пратэсты, акцыі, змаганне ў самых розных фарматах ды формах, і арышты, арышты, арышты… Якім мужнымі, змагарнымі і ахвярнымі мы будзем выглядаць для нашых нашчадкаў… А можа, мы і сапраўды такімі былі.

АНОНС

# СЛАВЯНСКІ ЛІВЕРПУЛЬ

**17–19 чэрвеня ў Віцебску пройдзе вялікі міжнародны фестываль «Ob-la-ki, Ob-la-ka», прысвечаны творчасці гурта «The Beatles». У ім возьмуць удзел вядомыя музыканты і бітламаны з Расіі, Украіны і Беларусі.**




На тры дні Віцебск ператворыцца ў славянскі Ліверпуль — гледачоў чакае некалькі дзясяткаў тэматычных мерапрыемстваў, якія будуць праходзіць на вуліцах горада і ў культавым віцебскім клубе «Чердачок». Кульмінацыяй фестывалю стануць тры вялікія канцэрты ў летнім амфітэатры — вялікі Beatles-канцэрт, сольны выступ Барыса Грабеншчыкова, а таксама мюзікл «бітламанам» ад тэатра Стаса Наміна.

Асноўныя мерапрыемствы будзе весці вялікі прыхільнік «The Beatles» Дзмітры Дзіброў. Сярод удзельнікаў таксама народны артыст Расіі Аляксей Кузняцоў, вядомы блюзмэн Аляксандр Цыганок, які выступаў у знакамітым ліверпульскім клубе «Cavern», група «Flat», трыб'ют-групы «Beathoven» (Украіна), «HeartBeat» (Расія), «The Apples» (Беларусь) і многія іншыя артысты.

Поруч з прафесійнымі музыкамі арганізатары фестывалю гатовы прадставіць пляцоўку і некалькім найбольш яркім аматарскім праектам, прысвечаным «The Beatles». Прапановы накіроўвайце на адрас oblakioblaka@gmail.com .

«Наш фестываль адкрыты для ўсіх — гэта вялікае свята добрай музыкі, якая на працягу паўстагоддзя аб'ядноўвае ўвесь свет, — распавядае ініцыятар фестывалю, старшыня Віцебскага Beatles-клуба Гарык Аганджанян. — Мы чакаем бітламанаў са стажам і тых, хто толькі адкрывае для сябе чароўны свет гэтай музыкі, творчых людзей і тых, хто проста хоча добра правесці час».

Асноўныя канцэрты (Летні амфітэатр):

18 чэрвеня — «Вялікі Бітлз-канцэрт». Пачатак 18.00. Квіткі: 15–55 тыс. руб.

18 чэрвеня — БГ і «Акварыум». Пачатак у 22.00. Квіткі: 20–120 тыс. руб.

19 чэрвеня — тэатр Стаса Намін, мюзікл «Бітламанія». Пачатак у 21.00. Квіткі 15–55 тыс. руб. (Увага, кошты могуць мяняцца).

Квіткі ў канцэртных касах Віцебска, а таксама на сайце ticketpro.by

Даведкі па тэлефонах: (029) 217 78 00, (029) 514 02 09.







АБ'ЯВА

## КОНКУРС ІМЯ ЧЭСЛАВА МІЛАША

**Беларускі ПЭН-цэнтр абвяшчае творчы конкурс для маладых літаратараў, прымеркаваны да 100-годдзя з дня нараджэння Чэслава Мілаша.**

Да ўдзелу запрашаюцца творцы ад 15 да 26 гадоў (на момант абвяшчэння конкурсу). Лаўрэаты конкурсу будуць запрошаныя на традыцыйныя колькідзённыя майстар-класы, дзе змогуць прадставіць і абмеркаваць свае творы з вядомымі пісьменнікамі, выкладчыкамі, навукоўцамі. Да разгляду журы прымаюцца вершы, кароткая проза, эсэістыка, мастацкія пераклады.

Творы мусяць быць дасланыя (паводле даты на паштовым штэмпелі або даты адпраўкі электроннага ліста) не пазней за 20 чэрвеня 2011 года.

Падвядзенне вынікаў адбудзецца 30 чэрвеня, у дзень народзінаў выбітнага польскага паэта, лаўрэата Нобелеўскай прэміі па літаратуры Чэслава Мілаша.

Творы можна дасылаць на адрас: e-mail: penkonkurs@gmail.com.

Калі ласка, пакідайце свае кантакты для зваротнай сувязі.

Паштовы адрас: 220050, а/с 218, Мінск, РГА «Беларускі ПЭН-цэнтр».

Даведкі праз электронную пошту ці тэлефон (017) 284-73-29.




Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
**Кароль Аляксей Сцяпанавіч**

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284—85—11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1-1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 572

Падпісана да друку 27.05.2011. 8.00.

Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.